**УЛАДЗІМІР КОНАН**

# КАТАЛІЦКАЕ АДРАДЖЭННЕ Ў БЕЛАРУСІ: АДАМ СТАНКЕВІЧ (1891-1949)

**ЛЬВОЎ**
**2006**

Уладзімір Конан. Каталіцкае адраджэнне ў Беларусі: Адам Станкевіч (1891-1949)

Кніга вядомага беларускага дасьледчыка, прафэсара Ўл. Конана распавядае аб выдатнам дзеячы беларускага адраджэнскага і хрысьціянскага руху – рыма-каталіцкам сьвятары Адаме Станкевічы

ГА “Беларуская нацыянальная грамада Львову”

**ЗМЕСТ**


1. Пачатак шляху . . . 4

2. Святар, журналіст і палітык. 10

3. Адам Станкевіч - гісторык і палітолаг . 25

4. На ніве беларускай культуры . 34

5. Каталіцкая традыцыя ў святле беларускай ідэі . 45

6. Напярэдадні бальшавісцкай Галгофы 1939-1949 . 73

7. Крыніцы . 85

## 1.ПАЧАТАК ШЛЯХУ

Ён належыць да тых слаўных рыцараў царкоўнага і нацыянальнага адраджэння Беларусі, якія апошнімі вяртаюцца ў нашую культурную традыцыю. Бальшавікі помсцілі яму пры жыцці за ахвярную службу Беларусі, замучыўшы ў далёкай расійскай глыбінцы. Помсцілі і пасля пакутніцкай смерці паклёпамі і лаянкамі, а найбольш "інфармацыйнай блакадай", забаронай навуковай і літаратурнай спадчыны, замоўчваннем самаго імя Адама Станкевіча: яно не трапіла і пакуль што ні ў адно энцыклапедычнае выданне. Бальшавікі ды іхнія сённяшнія спаткаемцы не могуць дараваць яму найперш трох рэчаў: беларускага каталіцызму, беларускага патрыятызму і службы Маці-Радзіме ў трагічныя 1939-1945 гады.

Але судзіць за каталіцызм і патрыятызм было няёмка нават бальшавікам. Яны прыдумалі здзеклівае, у нечым нават гратэскавае абвінавачванне: Асабовая нарада пры Міністэрстве дзяржаўнай бяспекі СССР пазбавіла А.Станкевіча волі на 25 гадоў за "шпіёнскую" дзейнасць на карысць Японіі. Прысуд адбыўся 31 жніўня 1949 года, а 14 снежня таго ж года пакутнік за Беларусь памёр, верагодна, не без "дапамогі" гулагаўскіх наглядчыкаў. Пра гэта ўскосна сведчыць наступная даведка МУС СССР, выдадзеная на запытанне супрацоуніцы Беларускага музея гісторыі рэлігіі ў Гродне Н. Ляшчонак (1990 г.): "Сообщаю, что по учетам ИЧ УВД есть Станкевич Адам Викентьевич, 1891 г. рождения, осужден Особым Совещанием МГБ СССР 3I.УШ.1949 г. по ст.58 УК РСФСР на 25 лет лишения свободы. Умер 4.12.I949 г. от ожирения сердца. Похоронен на кладбище Озерлага вблизи дер.Шевченко Тайшетского района, могила № 3-43. Начальник отдела В.В.Пятница"[1].

Творчая спадчына А.Станкевіча багатая і шматгранная, ахоплівае гісторыю Беларусі і беларускай культуры, гісторыю хрысціянства на Беларусі, гісторыю беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, літаратуразнаўства, тэалогію, царкоўную гімнаграфію і царкоўнае аратарскае мастацтва, урэшце, шматтэмную публіцыстыку. Ён аўтар дзевятнаццаці кніг і брашур, каля дзвюх тысяч эсэ, артыкулаў, нататкаў. І гэта - апрача штодзённай пастырскай, плённай настауніцкай і грамадска-палітычнай дзейнасці.

Большасць ягоных апублікаваных твораў захаваліся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Акадэміі навук Беларусі, дзе яны доўга ляжалі напоўа-



121.Тамсама. С. 79.
122.Тамсама. С.76.
123.Тамсама. С. 97.
124.Тамсама. С. 104.
125.Тамсама. С. 112.
126.Тамсама. С. 135- 136.
127.Тамсама. С. 139-140.
128.Тамсама. С. 155-156.
129.Тамсама. С. 156-157.
130.Тамсама. С. 158.
131.Тамсама. С. 180-181.
132.Stankievic Ad Bozaje Slovo na Niadzieli i Sviaty. Zvой - Vilnia. б.2.1938.
133.Тамсама.С.23.
134.Тамсама.С.112-115.
135.Тамсама.С.135-136.
136.Нацыянальны архіў-музей літаратуры і мастацтва Рэспублікі Бела-русь. Ф.З, воп.1, адз.зах. 279. лл.1-71; Ф.З, воп.1, адз.зах. 280. лл.1-42.
137.Рукапісны аддзел Цэнтральнай бібліятэкі імя Якуба Коласа нацыя-нальнай акадэміі навук Беларусі (далей - РАЦБНАН Беларусі). Ф.4, воп.1, адз.зах. 3, лл.1-5.
138.Тамсама. Ф.4, воп.1, адз.зах.22. лл. 1-10.
139.РАЦБНАН Беларусі. Ф.4, воп.1, адз.зах.22. лл. 12-127.
140.Тамсама. Л.I6.
141.Тамсама. Л. 59-62.
142.Тамсама.Л. 66-68.
143.Тамсама. Л.85.
144.Тамсама. Л.104-105.
145.Тамсама. Л.101.
146.Тамсама. Л.113, 118-119.
147.РАЦБНАН Беларусі. Ф.4, воп.1, адз.зах. 123. лл. 1-110.
148.РАЦБНАН Беларусі. Ф. 4. воп.1.адз. зах. 125.ЛЛ.1-155.
149.Тамсама. Л. 2.
150. Тамсама. Л. 14.

83. Станкевіч Ад. Прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла. 3 яго жыцця і працы. Вільня. 1934. С. 22.
84. Stankiewic Ad. Kazimier Swajak. Narysy ab jahonaj idealohii .Wilnia. 1931. S. 6.
85.Тамсама. С. 14.
86.Станкевіч Ад. 3 жыцця і дзейнасці Казіміра Сваяка (у дзесятыя ўгодкі ягонай смерці). Вільня. 1936. С. 22.
87.Станкевіч Ад. Вітаўт Вялікі і Беларусы. Вільня. 1930. С. 26.
88.Грынкевіч. Ст. Аб тэатры //Kryniсa.I927. №№ 17-29. 22 крас.-15 жн.
89.Данилевский Н.Я. Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому. Изд. 4-е. СПб., 1889. С. 110-111.
90.У Дзень Беларускай культуры // Беларуская Крыніца.1936.№52 25 снеж.
91.Станкевіч Ад. Міхал Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песня. Вільня. 1938. С. 14.
92. Да арганізацыі! (Chryscijanskaja Dumka.1928. N2.С. 1-2. 1932. N1. С. 1-2.
93.Chryscianskaja Dumka. 1928 N3 С. 1
94. Chryscianskaja Dumka. 1932. N7-8. С. 1-2.
95.III Унійная Канферэнцыя ў Пінску// Chryscianskaja Dumka.1932 N10. С.2-6.
96.Chryscianskaja Dumka. 1932. N11 . С. 1.
97.Нацыяналізм і Каталіцызм /Chryscianskaja Dumka.1933 N.4. С. 1.
98.Chryscianskaja Dumka. 1933. N5. С. 4-5.
99.Stankiewic Ad. Rodnaja mowa u swiatyniach.
100.Тамсама С. 15.
101.Тамсама. С.ЗО.
102.Тамсама. С. 42, 43, 46.
103.Тамсама. С. 59.
104. Stankiewic Ad. Bielaruski chryscianski ruch / Histarycny narys. Vilnia. 1939. S. 1, 2, 3.
105.Тамсама. С. 9.
106.Тамсама. С. 10-18.
107.Тамсама. С. 30-33.
108Тамсама. С. 34-35.
109.Тамсама. С. 38-39.
110.Тамсама. С. 52.
111.Тамсама. С.69.
112.Тамсама. С. 138- 147.
113.Тамсама. С. 170-175.
114.Тамсама. С. 228-232.
115.Тамсама. С. 238-239.
116.Станкевіч Ад. Хрысьціянства і Беларускі народ (У 930-ыя ўгодкі Хросту Беларусі: 988/9- 1938/9) //Cryscijanskaja Dumka. 1939. № 2, 3 студ. - № 26, 1 верас.
117.Хрысціянства і Беларускі народ (Спроба сінтэзы). Вільня. 1940. С. 2.
118.Тамсама. С. 18-19.
119.Тамсама. С. 54.
120.Тамсама. С.



рыштаванымі ў фондах спецзахавання. Сёння кнігі і брашуры, перыядычныя выданні, дзе друкаваўся А.Станкевіч, бібліяграфічныя рэдкасці захаваліся няпоўна, у адным ці некалькіх экземплярах. Пакуль што перавыдадзена некалькі кніг, рэфератаў-брашур гэтага рупліўца на беларускай духоўнай ніве[2]. У 1992 годзе Беларуская Каталіцкая Грамада ўзнавіла рэпрынтным выданнем унікальнае даследаванне А.Станкевіча "Родная мова ў сьвятынях" (Вільня, 1929). Рэдактар выдання Алесь Бяляцкі, тыраж - 2000 экз. На асобным лістку-укладышу надрукаваная біяграфічная даведка пра А.Станкевіча, напісаная Віталем Зайка. Праз год Беларускае Кааператыўнае Выдавецтва "Адраджэнне" пры дапамозе Беларускай Каталіцкай Грамады перавыдала такім жа чынам брашуру А.Станкевіча "Беларуская мова ў школах Беларусі ХУІ і ХУІІр стст." (Вільня, 1928).

Часопіс "Хрысціянская думка" (1992) да 100-годдзя з дня яго нараджэння апублікаваў артыкул А. Сідарэвіча "Ксендз Адам Станкевіч і яго справа" і тры раздзелы (ХІІ-ХІУ) з кнігі А.Станкевіча "Хрысціянства і Беларускі народ"[3]. Пазней артыкул А.Сідарэвіча пад іншым загалоўкам друкаваўся ў калектыўнай кніжцы "Вяртання маўклівая споведзь" (I994) апублікаванай выдавецтвам "Вышэйшая школа"[4]. У асноўным па матэрыялах гэтага артыкула, прысвечанага галоўным чынам грамадска-палітычнай дзейнасці А.Станкевіча, гродзенскі краязнаўца Апанас Цыкун апублікаваў нарыс з фрагментамі біяграфіі беларускага тэолага і грамадскага дзеяча[5]. Шэраг артыкулаў і нататкаў пра яго апублікавана ў замежным беларускім друку[6] .

Асноўная крыніца да біяграфіі беларускага каталіцкага асветніка і адраджэнца - зборнік матэрыялаў "Ксёндз Адам Станкевіч. У 25-я ўгодкі сьвяшчэнства і беларускай нацыянальнай дзейнасці 10.1.1915-10.1.1940)", падрыхтаваны і выдадзены беларускім публіцыстам і грамадскім дзеячам, былым рэдактарам часопіса "Калосьсе" (1935 -1939) Янам Шутовічам (1904-1973 гг.). Кніга рыхтавалася і выдавалася ва ўмовах вайны, нямецкай акупацыі Польшчы, некаторыя артыкулы, аказіянальныя вершы, дакументы і ўспаміны былі забаронены польскай цэнзурай і недзе зніклі, забраныя ў рэдактара палітычнай цэнзурай. Дзеля асцярожнасці некаторыя аўтары, асабліва тыя, хто аказаўся ў БССР, падпісваліся крыптонімамі.

Апрача віншавальных тэлеграмаў - мітрапаліта Грэка-Каталіцкай (Уніяцкай) царквы Андрэя Шэптыцкага, епіскапа - памочніка (вікарыя) львоўскага Івана Бучкі, біскупа Язэпа Кухты

і інш. - у кнігу ўвайшлі сяброўскія ўспаміны, нататкі, эсэ А.Бужанскага, Язэпа Найдзюка, Мікалая Шкялёнка, Міколы Базылюка, М.Кепеля, Янкі Багдановіча, віншаванні ад Асветніцкага Таварыства беларусаў у Варшаве, ад студэнцкіх арганізацый, Беларускага Каталіцкага выдавецтва (Я.Шутовіч, А.Дасюкевіч і інш.), ксяндзоў Льва Гарошкі, Уладзіслава Талочкі, Восіпа Назарука, былога рэдактара "Нашай нівы" і сенатара Аляксандра Уласава, урэшце, ад ананімных асоб, падпісаных крыптонімамі Н.Н., Р.Т., Х.У, С-й і інш. Кніга багата (хоць і сціпла з-за тэхнічных абмежаванняў) ілюстравана, ёсць у ей фотапартрэты юбіляра, у тым ліку фотакопія параднага партрэта, намаляванага Пётрам Сергіевічам.

Юбілейны зборнік пачынаецца першай і пакуль што апошняй няпоўнай біяграфіяй А.Станкевіча, напісанай Янам Шутовічам, верагодна, на матэрыялах ўспамінаў юбіляра і ягонага архіва7. Паводле жанра, гэта - журналісцкі нарыс, дзе ёсць нататкі пра жыццёвыя сцежкі юбіляра, распавядаецца пра ягоны беларускі , адраджэнцкі светапогляд.

Задача нашага даследавання - выявіць асноўныя этапы жыцця і творчасці А.Станкевіча, на аснове аналізу яго літаратурнай, навуковай, багаслоўскай і журналісцкай спадчыны, раскрыць яго рэлігійныя, філасофскія, грамадска-палітычныя і літаратурна-эстэтычныя погляды.

Паводле нарыса Яна Шутовіча, Адам Станкевіч прыйшоў у свет на Куццю 1891 года, 24 снежня па старому стылю, у сям'і сялян-паўвалочнікаў вёскі Арляняты Крэўскай воласці Ашмянскага павета. Урадлівая на таленты Нальшанская зямля ахоплівае цяперашнія Ашмянскі, Астравецкі, Смаргонскі раёны, частку суседскіх раёнаў. Зямля летапіснай Літвы, якая дала беларускаму народу шмат выдатных людзей, у тым ліку ксяндзоў і пісьменнікаў Кастуся Стаповіча (Казіміра Сваяка), Аляксандра Астрамовіча (Андрэя Зязюлі), Язэпа Германовіча (Вінцука Адважнага), Янку Семашкевіча (Янку Быліну). З тых жа Арлянятаў вылецелі аж тры выдатныя беларускія дзеячы Станкевічы: Адам, Янук і Станіслаў. Тры арлы з аднаго гнязда! Арляняты абкружаны слаўнымі ў беларускай гісторыі мясцінамі: ад гэтай вёскі сем кіламетраў да Крэва, дванаццаць - да Вішнева, сем - да Багданава, дванаццаць да Гальшан, шэсць - да Барунаў, дваццаць шэсць на ўсход ад Ашмян.

Сядзіба А.Станкевіча,- успамінаў ягоны зямляк і біёграф Ян Шутовіч,- з краю вёскі, ягоную радню звалі завыганскімі:



52.Беларуская Крыніца. 1931. № 8, 27 лют.
53.Станкевіч Ад. На Свята Маткі // Крыніца. 1940. №№ 42-45, 28 мая - 7 чэрв.
54. Stankievic Ad. Na Swiata Matki (Uwagi ab dastojnasci Matki. Wilnius. 1938. 30 s.
55.Станкевіч Ад. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. Вільня. 1934. С. 3.
56.Данилевский Н.Я. Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому. Изд.4-е. СПб., 1989. С.
57.Тамсама. С.
58.Станкевич Ад. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. С.5, 6.
59. Ермаловіч М.І. Па слядах аднаго міфа. 2-е выд. Мн., 1991. С.29. Гл.таксама: Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагародскі перыяды. Мн., 1990. С.86-88; 307-325.
60.Станкевіч Ад. Да гісторыи беларускага палітычнага вызвалення. С.8.
61.Тамсама. С. 9.
62.Тамсама. С. 10-11, 22.
63.Тамсама. С.35.
64.Тамсама. С. 49. Пераклад з рускай мовы - мой /Ул.К./.
65.Тамсама. С.53-56.
66.Цьвікевіч А. "Западно-русизм". М., І929. С. 184-187.
67.Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. С.81-88.
68.Тамсама. С. 93-94.
69.Тамсама. С. 122.
70.Крыніца 1919. № 10, 23 лістап.
71.Крыніца. 1924. N 5, 15 лют; № 17, 8 ліп.
72.Крыніца. 1924. № 17, 8 ліп. ; № 18, 16 ліп.
73.Крыніца. 1924. №№ 9-11, 26 крас. - 10 траўня.
74.Трактат маральна-палітычнага і юрыдычнага зместу М.Цішкевіча (Літвіна) "Пра звычаі літоўцаў, татараў і масквіцян" упершыню апублікаваны ў лацінскім арыгінале ў Базеле (1615 г.), у перакладзе на рускую мову апублікаваны ў "Архиве историко-юридических сведений, относящихся до России, изд. Калачевым (М., 1554).
75.Stankievic Ad. Bielaruskaja mowa и skolach Bielarusi XYI і XYII st. Wilnia. 1928. S. 11.
76. Тамсама. С.16-І7.
77.Станкевіч Ад. Доктар францішак Скарына першы друкар беларускі:
І525-І925. Вільня. 1925. С. 12; 24.
78.Stankiewic Ad. Mahnuseuski Pauluk Bahrum. Babrouski / Da wytokau bielaruskaha adradzennia). Wilnia. 1937. .S.3
79.Тамсама. С. 5.
80. Тамсама.С.28.
81.Тамсама. С. 40. .
82. Stankiewic Ad. Francis Bahusewic. Jahonaje zyccio i tworcasc. U tryccatyja uhodki smierci /1900-1930/. Wilnia 1930. S. 38-42.

17.Гл:Конан Ул.Цыклічная структура лірыкі: Паэзія Якуба Коласа// Роднае слова. 1996, N.9. С. 41-51; яго ж: "Беларусь мая старонка, дык люблю ж яе": Цыклічная структура лірыкі Янкі Купалы // Роднае слова. 1997, № 7. С. 21-31.
18. А.Ст. Крыху аб долі Беларуса // Дзянніца. 1916, 23 снеж.
19.Ад.С. Гісторыя Польшчы" ў народных мястовых школах у Беларусі// Homan . 1918. 9 крас. яго ж: Сны аб вялікай Польшчы // Homan. 1918, 3 мая.
20.Stankevic Ad. Bielaruski chryscianski ruch /Histarycny narys/ S. 88.
21.Сярмяга А. Крыніца //Кriniса. 1917, №1, 8 кастр.
22.Да Беларускага Народу //Кrуnica. 1917, № 5. 3 снежня.
23.Станкевіч А, Кс. Браты Беларусы! /Кrуnica 1919. №1, 24 жн.
24. Талочка В. кс.ЯнкаЛуцкевіч //Кrуnica. 1919. N 2. 31 жн.
25.Саладух. Чаму яны забыліся аб Уніі //Кrуnica . 1920. № 2, 14 студз.
26.Куток Уніі // Кrуnica/. 1919.№ 3, 7 верас.
27.Германовіч Язэп. Думкі аб Уніі// Кrуnica. 1919, № 9, 9лістад.
28.Станкевіч кс. На прывітанне дарагога госця Мітрапаліты Э. Роппа.//Кrуnica. 1920 N1. 1студз.
29.Кс.Ад. Ст. Куток аб Уніі //Кrуnica. 1920. № 16, 2О снеж.
30.Станкевіч Ад, кс. У калядны вечар //Кrуnica. 1920. № 16, 20 снеж.
31.Belaruski kalendar Krynica na 1920 hod. Ulazy ks. A. Stankevic. Wilnia. 1919. б. 37.
32.Кс. Ад.Ст. Куток Уніі //Кrуnica. 1921, N6, 19 лют.
33.Адозва Беларускага Цэнтральнага Выбарчага камітэту да грамадзян аб выбарах у Сойм /Кrуnica.1922, N I, 2 верасня.
34.Станкевіч Ад. Мой адказ пану С.Ваяводскаму //Кrуnica.I922. N 5, 30 снеж.
35.Прамова пасла кс.Адама Станкевіча ў Соймавай Асьветняй Камісіі 12.II.1924 г.падчас разважання exspose Міністра Асветы // Кrуnica. 1924 N5, 12 лют.
36.Ад.Ст-іч:. Бездарожжа //Кrуnica/ . 1924. № 10, 29 крас.
37.Ст-іч Ад. Каталіцтва, як аружжа польскасці //Кrуnica/. 1924, № 14, 15 чэрв.
38. Stankevic Ad. Bielaruski chryscianski ruch /Historycny narys. S.201-202.
39. Пра псеўданім Ул.Талочкі.гл: Янушкевіч Язэп. Яго ідэяй была Крывія // Літаратура і мастацтва. 1997. № 42, 17 кастр.
40.Папарацъ I. Аб сабе самой //Кrуnica . 1924. №1, 4 студз.
41.Ст-іч Ад. Вялікая справа //Кrуnica.1924. N4, 15 лют.
42.Ст-іч Ад. 3 прычыны літоўскага свята //Кrуnica.1924. № 5, 1 сак.
43. Ст-іч Ад. Пратэст і "пратэст" //Кrуnica. 1924. № 12, 24 траўня.
44.Ст-іч Ад. Ня гэтай дарогай! //Кrуnica/. 1924. № 13, 3 чэрв.
45.Папарацъ Ігнат. Новы закон аб мовах //Кrуnica 1924. № 18, 16 ліп.
46.Папарацъ Ігнат. Змагаемося за беларускія школы: //Кrуnica 1924. N24, 12 верас.
47.Кrуnica .1924. N38. 12 снеж.
48.За вечнай мэтай// Беларуская крыніца. 1927. N 30, 21 ліп.; Да справы Уніі // Беларуская крыніца. 1927. № 34. 19 жн.
49.Беларуская крыніца, 1927. N 47, 18 лістап.
50.Stankievic Ad. Bielaruski chryscijanski ruch S.202.
51.Тамсама. С. 217.



"Гэтае-аднаселле ляжыць над тэй жа рэчкай Ластаёй, у вяночку ліпаў, клёнаў, бярозаў, вольхаў"[8] . Бацька ягоны Вінцэнт умеў чытаць і пісаць па-польску і па-руску, маці Антаніна з Дасюкевічаў, паводле характарыстыкі таго ж Я.Шутовіча, "з натуры бойкая, інтэлігентная, глыбока рэлігійная, уражлівая", чытала па-польску. 3 дзяцінства ў душы Адама складвалася рэдкае для каталіцкага святара тонкае адчуванне ўсходнеславянскай культуры. Сам ён прызнаваўся, што жывей адчувае малітвы славянскія, з якімі практычна не мае нічога супольнага, чым лацінскія, з якімі штодня спатыкаецца.

Усё жыццё Адам моцна любіў сваю зямлю, прыроду, глыбока адчуваў яе красу. Лес, рэчка, луг, ніва - вось што яго заспакойвала і вяртала страчаныя сілы. Калі надарыцца вольная часіна, ехаў у свае Арляняты. "Прыпомніш мінулае, - успамінаў ён, - паходзіш па старых, так знаемых сцежках, абойдзеш па некалькі разоў у дзень усе тыя палі, гаі, а нават паасобныя кусты і дрэвы, якія хараством сваім парывалі мяне ў краіну нейкага нязнанага, страшнейшага і лепшага жыцця..."[9]

Летам малы Адась пасьвіў кароў з кніжкаю ў руках, зімою вучыўся ад вясковых грамацеяў. Ад сваіх бацькоў і вяскоўцаў пераняў культ свайго роду, містыку штодзённай працы. На дзесятым годзе паступіў у Барунскую царкоўна-прыхадскую школу, жыў у мясцовага домаўладальніка Юрэвіча. Па суседству,- успамінаў пазней А.Станкевіч, кватаравалі стараверы-муляры, вечна пілі гарэлку, спявалі плюгавыя песні і лаяліся. У школе выбівалі з дзіцячых галовак кожнае беларускае слова; Адась жа атрымаў аплявуху ад настаўніка за тое, што перахрысціўся па-каталіцку ўсёй пяцярнёю. Але вучыўся старанна, у царкоўным дзіцячым хоры спяваў стройным дыскантам.

Праз год па прапанове мясцовага ксяндза і са згоды бацькоў Адась перавёўся ў народную школу пры касцёле ў Гальшанах, вучыўся там у І902-І904 гг. Вельмі дзівіўся, што і там па загаду цара вучылі па-расійску. Жыў у сям'і шаўца, людзей ціхіх, працавітых і набожных, якія палюбілі добрага хлопчыка і дагледалі яго, як сына. Вечарамі чытаў гаспадарам кніжкі і газеты. Вось як характарызуе Адася - вучня ягоны біёграф: "Быў ён хлопец працавіты, старанны і пільны да навукі, але разам дужа жывы, шалаўлівы, вяртлявы і таварыскі. Тады ж у школе захапіўся містэрыяй касцёльнай службы, любіў набажэнства і паслугоўваў на імшы. У 1904 г. добра здаў экзамены ў суседняй Багданаўскай школе"[10].

Няпоўную сярэднюю адукацыю А.Станкевіч атрымаў у Ашмянскім гарадскім вучылішчы (I904-I908). Там малады Адась быў сведкам рэвалюцыйных падзей 1905 года і ўдзельнікам вучнёўскага руху: вучні на чале з шляхецкімі сынамі Чыжам (друкаваўся ў "Нашай долі", пазней у заходнебеларускай газеце "Наша праўда") і Шапірам правялі мітынг і двухтыднёвую забастоўку з патрабаваннем звольніць інспектара-хабарніка Мардвілку, скараціць урокі царкоўна-славянскай мовы і дазволіць звычайныя ў дэмакратычных краінах свабоды вучняў. Тады ж пад уплывам твораў Ф.Багушэвіча і газеты "Наша ніва" Адам усвядоміў сябе беларусам, чытаў усе беларускія выданні, шырыў іх сярод сваіх сяброў і знаёмых.

Лета 1908 года (пасля заканчэння вучэльні) А.Станкевіч працаваў на бацькоўскай гаспадарцы, начлежнічаў з вясковай моладдзю ў вольныя часіны чытаў кніжкі, памагаў у набажэнствах ксяндзам Крэўскага і Гальшанскага касцёлаў.Паспрабаваў уладкавацца на пошту, але гэтая служба была яму не да спадобы. Пазнаёміўся са студэнтам Пецярбургскай каталіцкай духоўнай акадэміі ксяндзом Адамам Лісоўскім і пад яго ўплывам пачаў рьхтавацца да святарства. У 1909-1911 гг. вывучаў у прыватных віленскіх настаўнікаў матэматыку, лацінскую і замежную мовы. Тады ж здаў у Маскве экзамен за чатыры класы гімназіі і ўступныя экзамены ў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю.

Гады вучобы ў семінарыі (1910-1914), у цэнтры беларускага адраджэнскага руху канчаткова далучылі ўражлівага юнака да традыцый роднай культуры, да нацыянальнай ідэі. "Наша ніва", творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, палымяная публіцыстыка і агітацыя Вацлава Ластоўскага, Івана і Антона Луцкевічаў моцна захапілі Адама. Беларускаму адраджэнню дапамагалі віленскія біскупы Юрыс Матулайціс і Эдвард Роп. З дазволу рэктара семінарыі Адам заснаваў беларускі гурток і беларускую бібліятэчку, наладжваў беларускія вечарынкі.

Каталіцкая духоўная семінарыя ў Вільні ў пачатку XX ст. была , па вызначэнню А.Станкевіча, "цьвярдыняй польскасці". Але туды паступала вучыцца нямала беларускіх сялянскіх сыноў. Тут вучыліся пазней вядомыя беларускія адраджэнцы ксяндзы К.Бурак, А.Хадыка, Г.Хвастэцкі Ф.Грынкевіч, Я.Семашкевіч, Ф.Рамейка, Ул.Талочка, В.Родзька, Я.Баройка, М.Пятроўскі, рэдактары-выдаўцы першай беларускай каталіц-



ка А.Станкевіча ў гэтай рукапісі - погляд на гістарычныя дзеі народа, як рэалізацыю яго нацыянальнай ідэі, рух да гарманічнай нацыянальнай цэласнасці"[150].

Асобны параграф сваёй манаграфіі А.Станкевіч прысвяціў крытычнаму аналізу этнонімаў - назваў Беларусі і беларусаў (Русь, рускія, крывічы, Крывія, ліцвіны, Літва, беларусы, Беларусь) падкрэсліўшы каланіяльна-імперскі змест паняццяў Крэсы ўсходнія і Паўночна-Заходні край. У гісторыі Беларусі А.Станкевіч выдзеліў наступныя эпохі: Дагістарычны час (да IX ст.). Час беларускіх паасобных княстваў (IX-XIIIстст.). Беларусь заадзічаная дзяржава (ХШ-ХУIII) і заняпад яе культуры ў ХУII-ХУIIIстст. Беларускае нацыянальнае адраджэнне і першыя спробы адбудовы беларускай дзяржаўнасці (XIX- 1944 г.). Беларусь - саюзная рэспубліка ў СССР. Адзначым тут, што аўтар падрабязна распрацаваў першую частку манаграфіі (дагістарычны перыяд і эпоха Сярэднявечча), іншыя раздзелы паспеў выкласці толькі канспектыўна, давёўшы свой гістарычны аповяд да канца Другой сусветнай вайны.

## 7. КРЫНІЦЫ


1.Памёр ад "ожирения сердца.." // Спадчына. 1991. № 1. С.45.

2.Станкевіч Ад.Браніслаў Эпімах-Шыпіла. 3 яго жыцця і працы // Спадчына. 1989. № 2. Яго ж. Вітаўт Вялікі і беларусы// Спад-чына. 1990. № 4.

3.Хрысціянская Думка. 1992. № 1.С.20-61.

4.Сідарэвіч А. 3 Айчынай і Богам у сэрцы: Адам Станкевіч // Вяртанне маўклівае сповендзі: Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. Мн., 1994. С. 203-211.

5.Цыкун Апанас. Працаваў на ніве Божай і народнай // Літаратура і мастацтва. 1997.1 жн.

6.Шамчук Яўгенія. Ксёндз Адам Станкевіч // Ніва, 1992. 5 студз.

7.Шутовіч Я. На пройдзеным шляху. // Адам Станкевіч. У 25-ыя ўгодкі сьвятарства і беларускай нацыянальнай дзейнасці (10.1.1940). Вільня 1940. С.11-46.

8.Тамсама. С.14.

9.Тамсама. С.15.

10.Тамсама.С. 21-22.

11. Stankevic Ag. Bielaruski chryscianski ruch /Histarycny narys. Vilna 1939. S. 60-61

12.Станкевіч Ад. Прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла. 3 яго жыцця і працы. Вільня. 1934. С.10-16.

13.А.Станкевіч цытуе ў сваім перакладзе Псалому -111 верш 17:
"Не памру, а жыць буду і абвяшчацьму дзеі Гасподнія".

14.Stankevic Ad. Rodnaja mova u sviateniach. Vilnia. 1929. 99-101.

15.Ніва, 1913, 14 лістап.

16.Багдановіч І. Станкевіч Адам Вінцэнтавіч // Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік. У 6 т. Т.5. Мн., 1995. С.410-412.

Ксёндз Магнушэўскі. Паўлюк Багрым. Ян Чачот. Алесь Рыпінскі. Дунін-Марцінкевіч. Кастусь Каліноўскі. Адам Кіркор. Сусветная вайна: Расійская рэвалюцыя і беларусы[147] .

Канцэпцыя аўтара - нацыянальна беларуская, яна выяўляецца ўжо ў назвах раздзелаў і параграфаў. Да кожнага раздзела прыкладзены пытанні для вучняў, напрыклад, такія: Да якога беларускага племені належала Турава-Пінскае княства? Беларускія князі з літоўскага роду і да чаго яны імкнуліся? Хто такія ліцвіны? Яны таксама сведчаць пра канцэпцыю самабытнасці беларусаў, пра іх тысячагадовую гісторыю.

Тады ж, у час вайны Адам Станкевіч задумаў і да свайго першага арышту (1944 г.) часткова ажыццявіў фундаментальнае комплекснае даследаванне пад назваю "Гісторыя Беларусі (Сістэматычны нарыс)". Гэта - чарнавы, але ўжо падрыхтаваны да перадруку рукапіс, 155 старонак, з нешматлікімі праўкамі, устаўкамі машынапісных : друкаваных лістоў [148]. (Дарэчы, усе падрыхтаваныя ім рукапісы напісаны кірыліцай з устаўкамі лістоў раней надрукаваных твораў лацінікай). У гэтай працы А.Станкевіч выкарыстаў паасобныя старонкі і параграфы сваёй манаграфіі "Хрысціянства і беларускі народ", іншыя апублікаваныя працы. Верагодна, аўтар планаваў перавесці іх у чыставіку на кірыліцу.

У прадмове да рукапісу А.Станкевіч пісаў: "Усе дасюлешнія "Гісторыі" Беларусі маюць вялікі недахоп: яны частковыя, няпоўныя, аднабокія /.../, часта залежныя ад другіх гісторыяў і ад плыняў палітычных ./.../. Мой намер: падаць хоць кароткую /..., але ўсю гісторыю Беларусі і ўсяго беларускага народа, і гісторыю ўсяго жыцця яго, падаць сістэматычна, паслядоўна і ўпарадкавана (сістэматычна)". Не толькі яго палітычную, але нацыянальную, культурную , эканамічную гісторыю, "не мінаючы сувязі гэтых дзеяў з гісторыяй нашых суседзяў і гісторыяй сусветнай"[149].

Уступная частка і першыя дзесяць параграфаў - гісторыка-метадалагічныя. Аўтар раскрывае самае паняцце гісторыі, эвалюцыю яго зместу, характарызуе ўспамагальныя гістарычныя дысцыпліны (археалогія, палеаграфія, дыпламатыка, нумізматыка, генеалогія, храналогія, этналогія, бібліяграфія, параўнальнае мовазнаўства, і інш.), піша пра навуковую і прагматычную каштоўнасць гістарычных ведаў. Значнае месца займае раздзел "Паняцце і сутнасць народу агулам і народу беларускага" (лл.15-21), тут аўтар рэпрадуцыруе адпаведныя старонкі з манаграфіі "Хрысціянства і беларускі народ /1940/. Асноўная дум-



кай газеты. "Беларус" (1913-1915) А.Бычкоўскі і Б.Пачопка. "Прыбыў я ў семінарыю, - успамінаў пазней А.Станкевіч, - ужо цалкам свядомым беларусам. Сваю нацыянальную рознасць ад палякаў я адчуваў і разумеў без ніякіх агародак і труднасцяў. Крыху спярша было мне трудней з адрожненнем сваёй нацыянальнай асобнасці ад расейскай"[11]. Тут спачатку перашкаджалі набытыя ў расійскай школе стэрэатыпы. Яны пераадольваліся ўжо ў Вільні, праз самаадукацыю і беларускі семінарскі гурток, пац моцным уплывам "Нашай нівы".

З-за маладых гадоў выпускніка семінарыі Адама не адразу пасвяцілі ў ксяндзы. Семінарскія настаўнікі і ксяндзы рэкамендавалі яму паступіць у Петраградскую каталіцкую духоўную акадэмію. Ваеннай восенню 1914 года ён выехаў у Петраград цягніком, абстраляным нямецкай артылерыяй. У акадэміі ён адразу далучыўся да Беларускага гуртка, створанага студэнтамі А.Цікотай, П.Пякарскім, Ст. Шырокім, Я.Жаўняровічам, В.Гадлеўскім. Гурток афіцыйна аформіўся яшчэ ў кастрычніку 1913года (старшыня П.Пякарскі, сакратар В.Гадлеўскі). Агульныя сходкі адбываліся на кватэры ксяндза Фр.Будзькі, на іх бывалі не толькі акадэмісты, але і свецкая моладзь (Б.Тарашкевіч, К.Душ-Душэўскі, Тамаш Грыб, Лявон Заяц, Язэп Варонка). Княгіня Магдалена Радзівіл падарыла гуртку 100 рублёў на беларускую бібліятэку.

Разам з А.Станкевічам у акадэмію паступілі і далучыліся да Беларускага гуртка пазней вядомыя дзеячы беларускага каталіцкага адраджэння В.Шутовіч, К.Лупіновіч, П.Хоміч, Ант.Няманцэвіч, М.Пятроўскі, М.Матвейчык, Я.Пяткевіч. Усяго ў гуртку было 11 свядомых беларусаў на семдзесят студэнтаў Акадэміі. Усе беларускія студэнты былі духоўнымі дзецьмі прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы. Сярод беларускай творчай інтэлігенцыі там былі Янка Купала, Браніслаў Тарашкевіч, Хведар Жылуновіч, Язэп Валонка, Алаіза Пашкевіч (Цётка) і ўжо названыя студэнты.

Прафесар Б.Эпімах-Шыпіла,фактычны дырэктар бібліятэкі Пецярбургскага ўніверсігэта, выкладаў старагрэчаскую мову ў каталіцкай Акадэміі і латынь на агульнаадукацыйных курсах Чарняева, быў навуковым кіраунікам Беларускага гуртка, часта бываў на яго сходках, памагаў студэнтам кансультацыямі, а бяднейшым і грашыма. У гэтай працы спачатку яму памагаў малодшы брат Уладзіслаў, студэнт універсітэта, пазней чыноўнік Міністэрства фінансаў, які дачасна памёр у 1913 годзе[12].

З 1916 года да заканчэння Акадэміі (1918) Беларускім гуртком кіраваў А.Станкевіч. Ён пашырыў яго асветніцкую працу гуртка, у ім утварыліся секцыі гісторыі Беларусі, літаратуры, музыкі і песні.

Дэвізам гурткоўцаў было: "З Богам, для народа!" Ужо тады пачалася напрацоўка асноўных ідэй філасофіі, сацыялогіі, тэалогіі і палітыкі беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху.

А.Станкевіч быў ідэолагам і адным з выдатных арганізатараў хрысціянскай дэмакратыі.У Каталіцкай акэдэміі публічна абараніў свае тэзісы па тэалогіі, здаў экзамены на кандыдата багаслоўя. Там жа рыхтаваў магістэрскую дысертацыю "Doctrina S. Aguinatis de familia respektu modernate theorie liberae unionis" ("Вучэнне св.Томаша Аквітанскага пра сям'ю ў параўнанні з сучаснай тэорыяй вольнага саюзу"). Аднак страціў цікавасць да гэтай тэмы і не закончыў яе, застаўся ў званні кандыдата тэалогіі. Грунтоўна вывучаў філасофію, сацыялогію, гісторыю, прыродазнаўства, нямецкую, французскую і літоўскую мовы.

## 2. СВЯТАР, ЖУРНАЛІСТ І ПАЛІТЫК

На апошніх курсах Акадэміі (1917-1918) А.Станкевіч пачаў супрацоўнічаць у беларускім нацыянальна-адраджэнцкім друку (штотыдневікі "Светач", "Дзянніца", "Гоман"). Спачатку як аўтар, а пазней, пасля заканчэння Акадэміі,- як адзін з арганізатараў і рэдактараў беларускіх газет, часопісаў, выдавецтваў. Тады ж ён пачаў сваю сапраўды місіянерскую дзейнасць з мэтай уцаркаўлення беларускай мовы, прымянення яе ў набажэнстве і рэлігійным асветніцтве.

У 1917 годзе біскупам віленскім быў высокаадукаваны і гуманны Эдвард Роп. Свае служэнне ён пачаў з наведвання касцёлаў дыяцэзіі летам гэтага года. Сярод іншых беларускіх ксяндзоў яго візітацыю на Віцебшчыну суправаджаў А.Станкевіч. Першая біскупская імша адбылася ў Дзісненскім касцёле 21 ліпеня. Вернікі рыхтаваліся пачуць беларускае слова з амбона, сабралася шмат народу - не толькі каталікоў, але і праваслаўных. На пытанне дзісненскага ксяндза, ці можна гаварыць да народа па-беларуску, біскуп адказаў: "Не толькі можна, але і трэба". Казанне даручылі ксяндзу, студэнту Каталіцкай акадэміі Адаму Станкевічу.

Вось як успамінаў ён пазней гэтую падзею: "Радасць мая была неапісаная. Хацелася плакаць, як малому дзіцяці, якое згубіла радню сваю, доўга бадзялася па чужых руках, зносячы ўсю паняверку чужацкіх сэрцаў, аж урэшце знайшло свайго дараго-



учынілі пагром пісьменніцкіх арганізацыяў, Беларускай Акадэміі навук, асветнікаў і грамадска-палітычных дзеячаў. Але ці ведаў Адам Станкевіч д'ябальскую антыхрысціянскую і антыбеларускую прыроду гэтай праявы апакаліптычнага звера? Верагодна , ведаў, але рабіў тое, што належыць хрысціяніну: прапаведваў і бальшавікам як прапаведваў Ян Хрысціцель цару Іраду. Але гэты звер аказаўся больш няўмольным і непараўнальна больш злым, чым тыя лагодныя ваўкі, львы і тыгры, якім прапаведвалі і якіх загаворвалі прарокі і святыя.

Сялянскі сын Адам Станкевіч быў і застанецца да сканчэння зямнога веку беларускім прарокам і святым мучанікам.

Мне застаецца коратка апісаць змест і структуру апошніх навукова-асветных рукапісаў Адама Станкевіча, якія ён распачаў у ваенныя 1940-1944 гады, але не паспеў закончыць, бо ў савецкі час бараніў духоўныя набыткі беларусаў, прапаведваў высокую мараль бальшавісцкай уладзе, урэшце, пакутаваў у астрогах і на сібірскай катарзе. Усе яны захоўваюцца ў Цэнтральнай бібліятэцы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Ад ваенных часоў захаваўся чарнавы рукапіс "Расказы з гісторыі Беларусі для школ", пачаты, верагодна, каля 1940 года. Захаваўся канвалют з [111] аркушаў, напісаных ад рукі, часткова надрукаваных на машынцы, месцамі ёсць падклейкі карэктурных лістоў, узятых з ранейшых публікацыяў. Мова ўсюды беларуская.

Сярод раздзелаў і рубрыкаў гэтага ненадрукаванага школьнага дапаможніка (на жаль, не ўсе раздзелы захаваліся) ёсць наступныя: Цяпер і даўней. Адкуль мы ведаем аб мінулым. Мы - беларусы, а наша Бацькаўшчына - Беларусь. Полацкі князь Усяслаў Вялікі (Чарадзей). Беларуская Полаччына пасля Ўсяслава. Беларускае княства Смаленскае і яго князі. Беларускае Турава-Пінскае княства. Прасвяціцелі Беларусі: Афрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Клім Смаленец. Беларусь на дарозе да суцэльнасці: Міндоўг. Беларусь далей зрастаецца: Гедымін. Беларусь суцэльная: Альгерд. Польшча імкнецца захапіць Беларусь: Ягайла, Вітаўт Вялікі - абаронец суцэльнай дзяржаўнасці Беларусі. Масква і яе імкненні захапіць Беларусь. Абарона незалежнасці Беларусі па Люблінскай уніі. Францішак Скарына - першы беларускі друкар. Леў Сапега- вялікі беларускі грамадзянін. Адыход беларускага баярства ад свайго народу:польшчанне краю. Паншчына. Сялянскія паўстанні. Канец Польшчы: Касцюшка. Прыгнечанне Беларусі пад Расеяй: Кастусь Каліноўскі. Беларускае адраджэнне: Францішак Багушэвіч.

іншым, гэтым вартым жалю фактам карыстаюцца і будуць карыстацца супраць нашай справы.

Яшчэ прашу Савецкі Ўрад такім жа чынам вызваліць каталіцкіх ксяндзоў Фабіяна Абрантовіча, які цяпер знаходзіцца, па маім звесткам, з 1939 года ў адной з маскоўскіх турмаў, а таксама Андрэя Цікоту, Восіпа Германовіча і Падзяву, якія ў час вайны былі ў Харбіне, а цяпер, верагодна, знаходзяцца ў распараджэнні нашага ўраду. Усе яны свядомыя беларусы, даравітыя і культурныя людзі і надта былі бы карыснымі ў праектаванай намі справе.

Адным словам, усе сумленныя высілкі і ўсе сумленныя сродкі - для стварэння ў БССР беларускай каталіцкай самастойнай царквы... Няхай адбудзецца гэтая вялікая гістарычная справа ў гонар 30-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі!

Вільнюс, 20.III.I947. /Подпіс Адама Станкевіча/.

Сваю трэцюю запіску і праект Беларускага Касцёла Ад.Станкевіч падаў 20 сакавіка 1947 г. А ў красавіку 1949 года бальшавісцкія энкэвэдзісты арыштавалі яго другі раз /свае першыя запіскі ён пісаў пасля першага арышту восенню 1944 г. / 31 жніўня 1949 года бальшавісцкі суд прысудзіў аднаго з самых гуманных і таленавітых сыноў беларускага народа, шасцідзесяцігадовага Адама Станкевіча да 25-ці гадоў сібірскай катаргі. Там, у нейкім Тайшэце Іркуцкай вобласці рыцар беларускай ідэі загінуў праз тры месяцы пасля высылкі. Загінулі ў розныя гады ягоныя сябры і супрацоўнікі па беларускаму хрысціянскаму руху Фабіян Абрантовіч (1884-1946) памер ад катаванняў у Бутырскім астрозе за два гады да хадайніцтва А Станкевіча, у расійскай ссылцы пры нявысветленых абставінах. Вінцэнт Гадлеўскі (1898-1942) закатаваны вучнямі бальшавісцкіх энкэвэдыстаў нямецкімі гестапаўцамі. Станіслаў Грынкевіч (1902-1945) растраляны па прыгавору бальшавісцкага ваеннага трыбунала 18 траўня 1945 года. Недзе тады ж загінуў Ян Пазняк. Загінулі шмат іншых змагароў за Беларусь і Беларускі Касцёл.

Удалося вырatавацца Восіпу /Язэпу Германовічу (1890-1976): ён таксама быў прыгавораны да 25-гадовага зняволення ў расійскіх канцлагерах (1948 г.), але выпушчаны ў 1955 годзе (верагодна, па недагляду ідэалагічнай паліцыі ), здолеў выехаць за мяжу, набыў вядомасць як беларускі пісьменнік пад псеўданімам Вінцук Адважны.

Як сёння ўжо добра вядома, бальшавікі знішчалі і падаўлялі беларускую нацыянальную эліту, пачынаючы з 1929-1930 гг,



га, роднага, добрага бацьку! Мне было цяжка сабраць свае думкі ў парадак і паддаць іх пад закон логікі. Тоўпіліся яны, мітусіліся ў галаве маёй, як пшолкі ў роі сваім, а радасць балюча сціснула мне сэрца... Ідучы да амбону праз народ, якім біткам быў набіты касцёл і якога было поўна за касцёлам, праз адчыненыя вокны слухаючага набажэнства і слова Божае, я толькі помню, што бадай нічога не помню. Я не ведаў, аб чым я гаварыць маю.... Урэшце, на амбоне, помню, зачаў ад слоў псалмісты Божага Давіда: "Не ўмру, але жыць буду і разглашаць буду хвалу Божую" (Пс. 117)"[13].

Сэнс 117-ай псальмы А.Станкевіч развіваў паступова ў тэму беларускага нацыянальнага адраджэння, духоўнага і сацыяльнага ўваскрэшання беларусаў. Вось як, паводле ўспамінаў А.Станкевіча, вернікі ўспрынялі першае ў іхнім жыцці беларускае казанне ў Доме Божым: "Пачуўшы словы мовы роднай, так пагарджалай дагэтуль, твар слухачоў ажывіўся, заяснеў. Запанавала святая цішыня. Кожнае слова слухачы, здаецца, жыўцом глыталі. Узрушэнне маё сардэчнае хутка ўдзялілася ўсёй велізарнай грамадзе слухаючых, і нямую ціш у касцёле замяніў нічым не ўстрыманы плач галосны. Ліліся слёзы ручаём, з вачэй гаротнага, падняволенага беларуса, слёзы дзяцей пры баку свайго роднага бацькі..."[14]

Вось так пачынаўся масавы рух за вяртанне роднае мовы ў святыні, ля вытокаў якога быў студэнт Каталіцкай акадэміі А.Станкевіч. Пазней ён ніколі, да сваёй пакутніцкай смерці ў расійскай глыбінцы, не пакідаў гэтага духоўнага адраджэння, а ў Заходняй Беларусі быў яго лідэрам і летапісцам: на гэтую тэму апублікаваў шмат артыкулаў, пасылаў у розныя царкоўныя і свецкія інстанцыі лісты, мемарандумы ды іншыя дакументы, арганізоўваў масавыя акцыі ў абарону Маці-Беларусі і матчынай мовы. Урэшце, апублікаваў даследаванне "Родная мова ў святынях" (1929), аб якой гутарка яшчэ наперадзе.

Неардынарная асоба А.Станкевіча - святара, даследчыка, пісьменніка, грамадскага дзеяча і асветніка - сфармавалася пад уплывам хрысціянскага сумлення, бо яно абавязвае абараняць пакрыўджаных і зняважаных людзей і народаў. Гэтаму моцна паспрыяла беларуская культурна-нацыянальная і дзяржаўная традыцыя - ад Ф.Скарыны і князя Вітаўта да "Нашай нівы", якая і сёння не страціла сваёй духоўнай сугестыўнасці, здольнасці перадаваць сваім чытачам энергію адраджэнцкага зараду. Пасадзейнічаў гэтай справе духоўна-псіхалагічны клімат Пе-

цярбургскай каталіцкай акадэміі, дзе вучыліся сыны беларускай вёскі. Якраз сярод іх узнікла ідэя выдання трыбуны беларускага каталіцкага адраджэння - штоднёвіка "Крыніца", самай жывучай заходнебеларускай грамадска-палітычнай, літаратурнай і рэлігійнай газеты: яна праіснавала з перапынкамі ў непамерна цяжкіх умовах дваццаць тры гады (1917-1940). Напрацаваныя ў ёй яе рупліўцам А.Станкевічам ідэі, канцэпцыі, багатыя фактычныя матэрыялы леглі ў аснову яго навукова-асветніцкіх і тэалагічных кніг і брашур.

Зусім верагодна, што А.Станкевіч быу карэспандэнтам "Нашай нівы" падчас вучобы ў Вільні і Пецярбургу. Пра гэта сведчыць ягоная сёння вядомая першая публікацыя "Віншаванне "Нашай нівы" у 8-ю гадавіну яе жыцця"..[15] На жаль, публіцыстыка лідэра беларускага каталіцкага руху не даследавалася (галоўным чынам па прычыне яе закрытасці ў БССР), а ў "Слоўніку беларускіх псеўданімаў" (1983) Я.Саламевіча зафіксаваны толькі адзін псеўданім - Сакалінскі А. (публікацыі ў заходнебеларускіх часопісах "Калоссе" і "Шлях моладзі"). У даведніку "Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік" (1993) зафіксаваныя крыптонімы А.Станкевіча - А.С., А.Ст., Ад.С., Ад.-іч)[16] , аднак ягоная бібліяграфія пакуль што слаба распрацавана, бо спадчына пісьменніка, выдавецкая і журналісцкая дзейнасць амаль не даследаваліся.

З ранняй публіцыстыкі А.Станкевіча пакуль што зафіксаваныя, апрача віншавання "Нашай ніве", артыкулы і нарысы, апублікаваныя ў 1916-1918 гг. газетамі "Дзянніца" ("Крыху аб ролі Беларусі") "Светач" ("Думкі аб роднай Беларусі", "Хрыстус нарадзіўся"), "Гоман" ("А.Сметана аб літоўскай справе", "Гісторыя Польшчы" у народных і мясцовых школах", "Сны аб вялікай Польшчы"). Гэтыя ды іншыя нататкі сведчаць пра паступовае засваенне маладым ксяндзом-акадэмістам нацыянальнай ідэі і беларускай культурна-гістарычнай традыцыі.

Праўда, на першым этапе ягоная веда пра Беларусь яшчэ адставала ад рэальнага духоўнага поступу нацыі, часова запынілася на ўзроўні Лазаравай песні, папулярнай у народным побыце беларуса ў трансфармаванай у творчасці Ф.Багушэвіча, ранняй паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа [17]. "Нашы прадзеды, - піcaў студэнт Станкевіч у пецярбургскай "Дзянніцы", - не клікалі долі - яны яе не зналі: у здзеку і горы яны ціха праходзілі жыццё сваё. Іх князі і баяры пайшлі ў прочкі, выракліся свайго народу". Урэшце, В.Дунін-Марцінкевіч ды іншыя песняры народ-



ягонага бацьку і брата толькі за тое, што яны адкрыта называлі сябе беларусамі[145].

Пры ўсёй сваёй дыпламатычнасці і дэманстрацыі лаяльнасці А.Станкевіч не замаўчаў горкай праўды, заўважыўшы, што ў дзяржаўным жыцці БССР беларуская мова поўнасцю выцеснена расійскай, да таго ж адбываецца падмена этнонімаў- беларускі тлумачыцца як тоесны рускаму. Аднак усё ж спадзяваўся на прагматызм бальшавіцкіх дыктатараў, на іх здольнасць улічваць свой уласны інтарэс. Стварэнне беларускай каталіцкай мітраполіі, на яго думку, меў бы за мяжой добры рэзананс. "Аўтарытэт Сав./ецкага/ ўраду ў вырашэнні такіх пытанняў, як рэлігійна-царкоўныя, узрос бы, а ўвесь - каля 400 млн. - каталіцкі свет на чале з Папай, епіскапамі і кардыналамі ў сваіх ацэнках СССР вымушаны былі б быць больш мяккімі /.../. У выніку апошніх сусветных падзеяў узнялася славянская ідэя. Для яе развіцця і ўмацавання стварэнне ў БССР беларускай Каталіцкай царквы як самастойнай адзінкі таксама мела б пазітыўнае значэнне".

Саслаўся наш асветнік і на аўтарытэт слаўнага расійскага філосафа Ўладзіміра Салаўёва, паводле слоў якога, католік без пастаўленага Папай епіскапа - усяроўна, што пратэстант без Бібліі, альбо старавер без старадрукаваных служэбнікаў. "А я бы,- іранічна заўважыў Станкевіч, - да гэтага дабавіў бы: каталіцтва без кананічна пастаўленых епіскапаў - што камунізм без "Капітала" Маркса"[146] .

Свой другі мемарандум савецкаму ўраду Адам Станкевіч закончыў ветліва, але рашуча і ўзнёсла, верагодна, падводзячы вынікі свайго самаахвярнага жыцця. Вось ягонае апошняе слова на бальшавіцкім "шамякіным судзе": "Рымскі сенатар Катон кожную сваю прамову канчаў словамі: ceterum censeo Carthaginem esse delendam... - ва ўсім іншым лічу, што Карфаген павінен быць разбураны". Так і я лічу, што беларуская Каталіцкая царква павінна быць створана для дабра беларускага народу і ўсяго СССР.

Апрача таго, наследуючы таму ж Катону - няхай прабачыць мне Савецкі Ўрад! - я ізноў прашу яго знайсці магчымасць перагледзець справу беларускага ксяндза Віктара Іванавіча Шутовіча, сасланага ў лагер (Сухабязводдзе, Горкаўская вобл.) на 10 гадоў і вызваліць яго, дазволіць яму ўехаць у Вільню. Тут А.Станкевіч паўтарае ранейшую характарыстыку зняволенага як добрага і не вінаватага чалавека. Я глыбока перакананы ў яго невіноўнасці. Да таго ж непрыемна слухаць палякаў, якія, між

А.Станкевіч, - у выніку закрыцця ўрадам каталіцкіх касцёлаў і недапушчэння туды каталіцкіх святароў, касцёльнае жыццё зусім ненармальнае; але яно ёсць, і каталікі адтуль за рэлігійнымі трэбамі звяртаюцца за многа кіламетраў у касцёлы Заходняй Беларусі - у Маладзечна, Краснае, Налібокі, Рубяжэвічы, Нясвіж , Ліду, Гродна, Вільню. Рэлігійнае жыццё каталікоў усходняй часткі БССР за 30 гадоў савецкай улады як быццам бы спынілася, але на справе "угліблілася і загартавалася".

У Заходняй Беларусі епархіі Пінская і Віленская з-за адсутнасці біскупаў, кіруюцца дэканамі. Кожны з 22-х ксяндзоў Пінскай епархіі абслугоўвае некалькі прыходаў. Адам Станкевіч характарызуе дэканаў Віленскай епархіі - Зяневіча ў Глыбокім, Баневіча ў Лідзе і Курыловіча ў Гродне, якія падтрымліваюць набліжэнне Касцёла да беларускай культуры. Выснова наступная: "Толькі кананічна пастаўлены кіраўнік з дакументам у руках ад Папы, беларус, лаяльны да Савецкага ўраду /.../ здолее ўтрымаць руль кіравання і арганізацыі каталіцкай царквы ў БССР, павесці гэтую царкву па новаму гістарычна беларускаму шляху"[143].

У ідэале і перспектыве, на думку А.Станкевіча, павінна быць беларускае архіепіскапства, кананічна залежнае толькі ад Папы. Але на пачатку рэформы можа быць створана часовае кіраўніцтва Касцёлам у Беларусі, у тым ліку на чале з архіепіскапам-літоўцам Рэйнісам, як апостальскім адміністратарам. Аўтар праекту, будучы праціўнікам любой рэвалюцыі, рэкамендаваў правесці гэтую рэформу пастулова і без гвалту. Бо каталіцызм у сваёй польскай форме ўрастаў у беларускае асяроддзе 400-500 гадоў. "Пагэтаму нельга існуючае становішча перарабіць адным толькі росчыркам пяра, механічна, на працягу аднаго года і без яўнага папскага аўтарытэту. Стварэнне новай каталіцкай царквы ў Беларусі павінна праводзіцца строга эвалюцыйна, паступова, але тым не менш упэўнена і рашуча.... Каталіцтва ў Беларусі павінна быць беларускім і служыць інтарэсам беларускага народа"[144]. Для пачатку А.Станкевіч прапанаваў арганізаваць у Беларусі курсы беларусазнаўства для каталіцкага духавенства і заснаваць каталіцкую духоўную семінарыю. Патрэбна будзе тактычна пераадолець супраціўленне польска-каталіцкай іерархіі, асабліва архіепіскапа Віленскай мітраполіі Ялбжыкоўскага, фанатычна арыентаваных на "пальшчызну" вернікаў, мясцовых польскіх нацыяналістаў. Тут жа Адам Станкевіч паведаміў пра сваю сямейную трагедыю - забойства польскімі нацыяналістамі



ныя не сцярпелі, загаварылі з народам у яго роднай мове. "І вось у тым XIX сталецці пачынаюць блукаць па Эўропе думкі аб адраджэнні народаў, аб іх прасвеце, развіцці. Гэтыя думкі пападаюць і на нашу неўраджайную ніву і з трудом пачынаюць прарастаць. І тыкеля ў 1905 годзе бачым рунь абыйшоўшую, чуем голас песьняроў, каторыя долю клічуць ... Дык ганімося за доляй, просімо, каб прышла ды асталася ў нас. Шчыра абяцуйма, што збудуем для яе палац вялікі, прыгожы на народнай беларускай падмуроўцы, убяром яго краскамі асветы, дабра ды хараства праўдзівага"[18].

Непаўната, аднавектарнасць светапогляду маладога Адама Станкевіча відавочная: мінуўшчына і сучаснасць з'яўляюцца яму ў мінорна-трагічных колерах, а будучыня, як у народнай казцы, малюецца нейкім зямным раем, прыгожым царствам праўды, дабра і хараства. Нават пасля заканчэння Акадэміі ён піша пра Беларусь як край магілаў і ненармальнасці жыцця. Праўда, цяпер у артыкулах і нататках, апублікаваных у "Гомане" пад крыптонімам Ад.Ст. ёсць прыкметы паступовага адыходу ад юначых абстракцый і напрацаваных у друку "беларусазнаўчых" штампаў, ёсць апора на факты грамадскага жыцця, асабліва ў крытыцы імперскіх амбіцыяў адроджанай Польшчы і культургрэгерства ў Беларусі.

Трэба мець на ўвазе, што артыкулы ў "Гомане", падпісаныя крыптонімам Ад.С., якія прыпісваюцца А.Станкевічу ў даведніку "Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоунік" (Т.6. С. 410-412)[19] , верагодна, належаць яго сябру па каталіцка-беларускаму адраджэнцкаму руху Ўладзіславу Талочку, які публікаваўся ў "Гомане", паводле сведчання А.Станкевіча, пад псеўданімам Адам Саладуха і крыптонімам Ад.С.[20]

А.Станкевіч разам з Фабіянам Абрантовічам, Браніславам Эпімах-Шыпілам і, урэшце, з усім Беларускім гуртком Пецярбургскай каталіцкай акадэміі быў ля вытокаў Хрысціянскай Дэмакратычнай Злучнасці (ХДЗ) , пазней пераўтворанай у партыю Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД). Гэты грамадска-рэлігійны рух пачаўся ў Мінску: 24-25 мая 1917 года там у Кафедральным саборы адбыўся першы з'езд беларускіх ксяндзоў (3О дэлегатаў), падрыхтаваны В.Гадлеўскім, Ф.Будзькам, Л.Хвецькам, А.Астрамовічам (Зязюлем), А.Цікотай. А.Станкевічу выпала выступаць дакладчыкам па першай, ідэалагічнай тэме "Беларускі рух і яго адносіны да касцёльнага жыцця, да каталіцкай акцыі ў Беларусі." Прынятая на з'ездзе рэ-

залюцыя (шырокая аўтаномія Беларусі, навучанне ў школе па-беларуску, увядзенне ў касцёлах казанняў і дадатковым набажэнствам у беларускай мове, заснаванне беларускага грамадска-рэлігійнага выдання і інш.) сталі пазней асновай для распрацоўкі праграмы і тактыкі БХД.

Яшчэ адзін выток беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху - часопіс "Светач" ("Svietac"), заснаваны ў кастрычніку 1916 года ў Пецярбургу беларускімі студэнтамі Каталіцкай акадэміі на чале з А.Станкевічам, з удзелам Л.Хвецькі, Андрэя Зязюлі (А.Астрамовіча), Эдварда Будзькі і інш. Часопіс праіснаваў толькі да лютага 1917 года з-за цяжкіх эканамічных і цэнзурных умоў. Тады ж выходзіла заснаваная З.Жылуновічам газета "Дзянніца" (выйшла сем нумароў у 1916 г.), у якой таксама друкаваўся А.Станкевіч.

На падмурку Беларускага гуртка Пецярбургскай каталіцкай акадэміі і Пецярбургскага камітэта дапамогі беларускім уцекачам (эмігрантам з акупіраванай нямецкай арміяй Беларусі) у маі 1917 года была заснавана ХДЗ. Першыя яе ідэолагі Ф.Абрантовіч, Б.Эпімах-Шыпіла і інш. У Пецярбургу яна мела сваю аматарскую тэатральную сцэну, касцёльны хор, а з 8 кастрычніка 1917 года - тыднёвік "Крыніца" ("Kryniса") і аб'ядноўвала каля 300 сяброў.

Выдаўцом "Крыніцы" да канца 1918 года быў ксёндз Л.Хвецька, а рэдактарам спачатку беларус-католік М.Грачанік, а з лютага да снежня 1918 года Л.Хвецька. Сярод першых яе аўтараў нехта А. Сярмяга. "Крыніца!- пісаў ён. - Гэтае слова з нейкай дзіўнай павагай выгаворваецца, яно мае ў сабе нешта незвычайнае, таемнае.... Трэба, значыцца, нейкае крыніцы, крыніцы незвычайнай, з вадой жывой, каторая б асвяжыла, аднавіла душу беларуса, падмацавала б яго на гаротнай жыццёвай дарозе да сваёй мэты, да Хрыстуса. Дык вось гэтай крыніцай мае быць газетка, каторая дзеля карысці душы беларускай выходзе на свет..."[21].

"Крыніца" прадаўжала традыцыі сваіх папярэднікаў - слаўнай "Нашай нівы" і каталіцкай дэмакратычнай газеты "Беларус "("Bielarus"), але ва ўмовах адноснай свабоды больш увагі удзяляла абгрунтаванню нацыянальнага самавызначэння беларусаў. У снежні 1917 года яна апублікавала зварот Вялікай Беларускай Рады да згуртавання, каб "сабраць усе жывыя сілы нашае Бацькаўшчыны дзеля абароны і ўтрымання нашых вольнасцяў, здабытых крывёю мільёнаў пакрыўджанай бяздольнай Беларусі"[22].



даклад, я асмелюся звярнуць высокую ўвагу савецкага ўрада на вось такі для мяне асабіста і наогул да беларусаў вельмі сумны факт. Летась пачаў працаваць у Мінску ў якасці каталіцкага святара Віктар Іванавіч Шутовіч. Шчыры беларус, сумленны чалавек, ідэйны ксёндз, зусім апалітычны /.../ ,адданы выключна свайму пастырскаму абавязку. Гэты чалавек, прасядзеўшы звыш году ў астрозе, аказаўся зноў у астрозе альбо ў лагеры. Каталіцкія цэрквы ў Мінску зачынены, адна з іх ператворана ... у кіно /.../. Я бяру на сябе смеласць прасіць савецкі ўрад знайсці магчымасць даць свабоду ксяндзу Віктару Шутовічу і, адкрыўшы ў Мінску касцёл дазволіць яму там працаваць ....Я заўсёды непахісна верыў і веру: для дабра беларускага народа-пакутніка і для дабра нашай Вялікай Савецкай Радзімы.

8.XII.45". І лацінскі афарызм, які не ўдалося расшыфраваць[141].

Савецкі ўрад , як заўсёды, па-свойму адклікнуўся на такую гуманную просьбу: Віктара Шутовіча паслалі ў сібірскі канцлагер. Для пачатку - "усяго" на 10 гадоў! Пра гэта засведчыла апошняя захаваная ў архіве запіска А.Станкевіча - ужо вядомы ягоны план беларусізацыі касцёла "Католический вопрос в БССР и проект его разрешения" (Вільнюс, 20.III.I947 г.).

У прадмове аўтар спасылаецца на свой папярэдні мемарандум і кароткія запіскі савецкаму ўраду на гэтую тэму і дабаўляе: "Я заўсёды разумеў ненармальнасць становішча Каталіцкай царквы ў Беларусі і пакутаваў душою. Каталіцтва тут, замест таго, каб быць другам і апораю беларускага народу, агулам заўсёды быў сродкам яго заняволення і паланізацыі. Заўсёды маёй марай было распалячанне каталіцкай царквы ў Беларусі /.../. З гэтаю мэтай я ў свой час шматкратна інфармаваў Рымскі прастол, але польскі нацыяналізм заўсёды перашкаджаў рэалізацыі маіх планаў, і я заставаўся адзінокім і зусім безабаронным. У апошнія гады лёс даў мне магчымасць прапанаваць мае беларуска-каталіцкія планы Савецкаму Ўраду і ў яго шукаць дапамогі ў іх вырашэнні"[142].

Другі мемарандум прысвечаны не гісторыі, а тагачаснаму становішчу Касцёла ў аб'яднанай Беларусі, а ў сваёй асноўнай частцы ёсць дасканала распрацаваны праект яго беларусізацыі. Для яго абгрунтавання А.Станкевіч папярэдне абследаваў - асабіста і пры дапамозе сваіх калегаў усю Беларусь з пункту погляду каталіцкага жыцця ў трох фармальна існуючых епархіях - Мінскай, Пінскай і Віленскай. "У Мінскай епархіі, - інфармаваў

У гістарычнай частцы аналітычнай запіскі А.Станкевіч падагуліў свае ранейшыя даследаванні па гісторыі Каталіцтва і Ўніяцтва ў Беларусі. Звяртаючыся да чыноўнікаў, ён толькі вявіў свае ацэнкі больш кантрастна, акцэнтаваўшы ўвагу на спрадвечнай беларускасці абсалютнай бальшыні нашых каталікоў. Але і тут ён прывёў новыя, цікавыя для гісторыі хрысціянства факты. Напрыклад, паказаў, што ў выніку дыскрымінацыі Ўніяцкай царквы ў Рэчы Паспалітай, а пазней- гвалтоўнага яе далучэння да афіцыйнага прарасійскага праваслаўя, каля паўтара мільёнаў уніятаў, у асноўным беларускіх сялян і шляхцічаў, перайшлі ў "польскае" каталіцтва, набыўшы псеўдапольскі статус. З другога боку, расійскі ўрад Мікалая І, пазней яго пераемнікаў, зыходзячы з антынавуковай і палітызаванай канцэпцыі "агульнарускага народа", складзенага з трох "усходнеславянскіх плямёнаў" праводзіў грубую палітыку абрусення беларусаў.

У раздзеле "Кананічная арганізацыя Каталіцкай царквы на Беларусі ў мінуўшчыне і цяпер" канспектыўна выкладзена гісторыя каталіцкай іерархіі, манастыроў, касцёлаў і біскупстваў. Урэшце, А.Станкевіч паспрабаваў пераканаць савецкую ўладу ў тым, што беларусізацыя прапольскага касцёла ў Беларусі карысная для народа і ўрада: яна наблізіла б яго да карэннага насельніцтва, вывела б з народнага арганізму чужын і варожыя яму элементы, да таго ж "каталіцкая беларуская царква не толькі пазбавілася б ад польскага ўплыву, але, наадварот, сама ў пэўнай ступені ўплывала б на беларускіх каталікоў у Савецкай Літве, Савецкай Латвіі і ў Польшчы".

Заключны раздэел запіскі датычыцца лёсу касцёлаў і ксяндзоў у Мінску. Ен настолькі цікавы, так яскрава падсвечвае духоўнае рыцарства А.Станкевіча і актуальнасць яго поглядаў сёння, што варта прывесці яго тут у скарочанай форме. "Я, - кажа аўтар запіскі, - разумею ідэалагічныя цяжкасці ўрада СССР ў справе стварэння беларускай каталіцкай епархіі, аднак жа ўрад гэтыя цяжкасці ў пэўнай ступені пераадолеў, дазваляючы ўстанаўленне праваслаўнага патрыярхата для ўсяго СССР .... Апрача таго, жывём у эпоху ўсведамлення правоў і годнасці чалавека і яго асноўных правоў на свабоду сумлення, на свабоду яго рэлігійна-царкоўнага жыцця. Ідэалы гэтыя агулам глыбока цэняцца і абараняюцца ў СССР".

Тут - яўнае , але неабходнае ў тых умовах, мякка кажучы, перабольшанне, дыпламатычны аванс. Як таксама такая просьба, звернутая да бальшавісцкіх дыктатараў: "Завяршаючы свой



З 21 лютага 1918 года тры выпускі "Крыніцы" выйшлі ў Мінску. Пасля Брэсцкага міру з прыходам бальшавікоў газета была прыпынена і аднавілася 24 жніўня 1919 года ў Вільні. Цяпер яе рэдактарам і выдаўцом стаў А.Станкевіч. Ён звярнуўся да беларусаў, падзяліўся з чытачамі з праграмай газеты: "У "Крыніцы" нашай, - пісаў ён, -будзе вадзіца свежая і здаровая, бо вадзіца з вечнай праўды, з вечнага дабра і хараства, з навукі Хрыстуса выплываючая. Значыцца, мы будзем прад усім бараніць св. каталіцкую веру ад розных ворагаў.... Мы добра ведаем, што здаровы дух толькі ў здаровым целе, што як чалавек галодны, бедны, не адзеты, дык тады няма што яму талкаваць аб яго душы .... З гэтага выходзіць тое, што мы будзем заўсёды ўступацца за беднага селяніна і бараніць бяздольнага беларуса-хлебароба. Нашай павіннасцю будзе не толькі радзіць вам, як лепей можна на зямлі працаваць, каб больш з яе карысці выцягнуць, але і таксама пісаць аб тым, як маюць беззямельныя і малазямельныя дамагацца зямлі .... Будзем голасна казаць, што вы не палякі і не расейцы, а што вы асобны беларускі народ, што вы глаўныя гаспадары ў сваёй Бацькаўшчыне"[23] .

На першым нумары "Крыніцы" ёсць цікавы аўтограф А.Станкевіча лацінікай: "Дарагому Ксяндзу В.Талочцы за супрацоўніцтва на запушчанай Беларускай Ніве .... Кс.А.Станкевіч". Сапраўды, Уладзіслаў Талочка пад псеўданімам Адам Саладух , крыптонімам Ад.С. і пад уласным імем быў сталым аўтарам "Крыніцы", выступаў за адзінства беларусаў-незалежна ад іх канфесіі. Ён надрукаваў некролаг аб смерці Івана Луцкевіча[24], артыкул з крытыкай польскага Сойму за ігнараванне праблемы Уніі. "Забыліся яны аб Уніі,- пісаў гэты беларускі патрыёт,- бо яна працівіцца эндэцкай у нас палітыцы, якую вядуць кс.Мацієвіч і яго таварышы. Унія, як згода, паразуменне Царквы і Касцёла ў Беларусі ўмацавала б народ беларускі"[25].

Верагодна, А.Станкевіч разам з Талочкам вялі ў газеце рэгулярную рубрыку "Куток Уніі". Гэта было часткова тое, што сёння называецца цытатнікам (выказванні славутых філосафаў, вучоных, багасловаў, адпаведныя фрагменты з Новага Запавету). Былі тут аўтарскія меркаванні адносна сусветнай і рэгіянальнай (беларускай і украінскай) Уніі. Рубрыка пачыналася думкай расійскага філосафа Ул.Салаўёва (працы яго добра ведаў А.Станкевіч і спасылаўся на іх у сваіх даследаваннях). "Паміж Праваслаўнай Цэрквай і Каталіцкім Касцёлам гісторыя выкапала страшэнную пропасць; паміж намі зямля вельмі шырока рас-

ступілася, але ведаемо, што гэта зроблена не Божымі рукамі, але людскімі рукамі .... Заўсягдашняя Воля Божая, - каб была адна Аўчарня і адзін Пастыр ..."[26].

Яшчэ адзін паплечнік А.Станкевіча ксёндз Язэп Германовіч у артыкуле "Думкі аб Уніі" выступіў з крытыкай польскай каталіцкай іерархіі, якая мела ў сваім асяроддзі праціўнікаў Уніі. "Яны забываюцца, - напомніў католікам беларускі ксёндз,- што прычыняюць Уніі гістарычную несправядлівасць. Касцёл каталіцкі не скасаваў Уніі, яна жыве ў Галіччыне" [27]. Рэдактар "Крыніцы" А.Станкевіч вітаў вяртанне з Расіі ў Вільню Мітрапаліта Э.Ропа і падзякаваў яму ад імя беларускіх ксяндзоў за падтрымку нашага нацыянальнага адраджэння, роднае мовы ў касцёлах. Сваё вітанне ён закончыў аптымістычнай надзеяй: "Можа, здзек, ашуканства, несправядлівасць знікнуць з вобліку беларускай зямліцы-пакутніцы: народ наш у падарожжы да адраджэння, ен ісці гэтай дарогай не перастане"[28] .

Абарона беларускай ідэі злучэння царквы і касцёла была справай далікатнай ва ўмовах польскай акупацыі Віленшчыны. Тым не менш у апошнім нумары "Крыніцы" за 1920 год яе рэдактар апублікаваў нататку "Куток Уніі", падпісаную крыптонімам Кс.Ад.Ст. (ксёндз Адам Станкевіч) з адкрытым выкрыццём антыўніяцкіх тэндэнцый у польскім касцёле: "І так,- пісаў ён, - святы, бязмерна святы ідэал Хрыстовы ў руках нізкіх і грэшных людзей стаўся паніжаным, апаганеным, а сэрца беларускага пакутнага народа балюча раздзёртым на розныя і, о Божа, часта варожыя сабе дзве часці.... Светлую думку Ўніі далей нашы ворагі паніжаюць і праз яе двояць, крывяць, калечаць абкрадаюць душу беларускую." Нататка завяршаецца пералікам асноўных патрабаванняў да Царквы і Касцёла, у тым ліку: дамагацца для беларусаў беларускай мовы ў святынях; увесці выкладанне беларускай мовы і беларусазнаўства ў праваслаўных і каталіцкіх семінарыях; на біскупскіх і архіерэйскіх пасадах для хрысціян-беларусаў "мы бачыць павінны толькі сыноў Зямлі нашай - беларусаў"[29].

У тым жа нумары "Крыніцы" А.Станкевіч апублікаваў перадавіцу "У Калядны вечар", дзе ўжо лаканічна сфармулявана асноўная ідэя яго багаслоўскіх поглядаў аб ролі хрысціянства ў духоўным узгадаванні народаў: "Састарэўшы быў свет старажытны: дух ягоны быў у няволі цела. Там чалавека не зналі, там былі толькі вольныя грамадзяне і нявольнікі, былі толькі багатыры і жабракі, а чалавека не было. Вось на ратунак чалавека, яму на падмогу Бог-Чалавек прыйшоў на свет .... Але не



га стану і праблемы адаптацыі Касцёла да кантэксту беларускай культурнай традыцыі. Канцэптуальнае даследаванне з трох частак ў жанры аналітычных запісак Савецкаму Ўраду. Першая частка - уступ у форме тэзісаў; другая - гісторыка-тэарэтычная і тэалагічная распрацоўка тэмы; трэцяя - абгрунтаваны праект стварэння аўтаномнага, незалежнага ад польскага епіскапата, адаптаванага да беларускай нацыянальнай культуры Каталіцкага касцёла ў Беларусі. Прапаную кароткі аналіз гэтага духоўнага запавету беларускага асветніка і рыцара Бацькаўшчыны. Цытаты прыводзяцца ў маім перакладзе з рускае мовы.

Запіску "Каталіцкая праблема ў БССР" А.Станкевіч пачынае з яе сутнасці - гістарычнага і палітычнага абгрунтавання неабходнасці стварэння беларускай каталіцкай епархіі, беларускіх біскупстваў, без якіх немагчымае паступовае "распалячанне" Касцёла ў Беларусі. Спасылаецца на гістарычныя прэцэдэнты: яшчэ пры Кацярыне II была створана самастойная каталіцкая епархія ў Магілёве і нават названа Беларускай. Пазней да палітыкі "распалячвання" Касцёла вярнуліся ў XIX - пачатку XX ст. Узнікла нават адпаведная літаратура: Владимиров А.П. История располячения западно-русского костела. М., 1846; Лихачев Д.Н. Вопрос о располячении Костела в прошлом и настоящем. СПб., 1913, іншыя даследаванні. Праўда, тут аўтар дып-ламатычна "замаўчаў" той факт, што імперскім уладам і ў галаву не прыходзіла думка, каб пачаць беларусізацыю Касцёла, планавалася і часткова ўдалася яго русіфікацыя.

Але да распаду Расійскай імперыі Беларусь не была суб'ектам міжнароднага права, паводле Рыжскага міру (1921 г.) яе падзялілі Расія і Польшча.

А.Станкевіч паведамляе, што з былой Заходняй Беларусі ў Ватыкан паступіла больш як 40 мемарандумаў аб неабходнасці стварэння Беларускай каталіцкай епархіі і карыстання беларускай мовай у беларускіх дыяцэзіях. У Ватыкане разумелі справядлівасць гэтых просьбаў, але не маглі не лічыцца з палітычнай рэальнасцю: Заходняя Беларусь заставалася інтэгральнай часткай Польшчы.

Пасля распаду Польшчы ў вайне з Германіяй (верасень -1939 г.) і ўтварэння адзінай Беларускай савецкай дзяржавы стварылася спрыяльная сітуацыя для дэкаланізацыі рэлігійнага жыцця ў краіне. Адным словам "патрэбна стварыць замест польскай беларускую каталіцкую царкву для больш чым двух з паловаю мільёнаў беларускага каталіцкага насельніцтва ў БССР"[140].

рускага народу .... Агулам жа беларускі народ застаўся верным сваёй мове, звычаям, сваёй нацыянальнасці".

Ад гісторыі беларускі ксёндз-патрыёт пераходзіць да тагачаснай палітычнай і рэлігійнай сітуацыі. "Палякі каталікоў-беларусаў з сваіх абоймаў не выпускалі ніколі. Асабліва "чула" яны імі апекаваліся- падчас Версальскай Польшчы. Беларускай мовы ў Касцёле не дапускалі, а жадаючых гэтага прыхажан і ксяндзоў садзілі ў астрогі і выганялі ў ссылкі". Аўтар прыводзіць прыклады гэтай дыскрымінацыі, ужо вядомыя з папярэдніх ягоных твораў. Дарэчы, зазначае ён, той жа біскуп Ялбжыкоўскі, ініцыятар гэтых праследаванняў, і сёння застаўся арцыбіскупам віленскім, праводзіць тую ж палітыку вызваленай ад нямецкіх фашыстаў Беларусі, "мае ад Папы ўладу не толькі на Віленскую епархію, але і на Ўсходнюю Беларусь".Па сутнасці, зазначае А.Станкевіч, гэта ёсць шлях да польскага захопніцтва ў Беларусі, для далейшага апалячання беларускіх каталікоў. "Адзіны тут выхад - у паразуменні з Ваціканам назначыць для каталікоў у БССР каталіцкага біскупа беларуса, які арганізаваў бы і вёў бы касцёльнае жыццё ў Беларусі зусім самастойна і незалежна ад палякаў і польскай духоўнай улады. Гэта раз і назаўсёды скончыла б з польскім панаваннем у БССР". А пакуль няма свайго біскупа, патрэбна арыентаваць касцёлы на беларускую мову, а ў неабсаджаных касцёлах не дапускаць тых ксяндзоў-палякаў, якія не знаюць беларускае мовы і ёй не могуць карыстацца"[138].

Два наступныя рукапісы - гэта два варыянты гісторыка-тэарэтычнага і палітычнага абгрунтавання ўжо разгледжаных тэзісаў. Абодва напісаны па-руску для канкрэтнага адрасата-савецкага кіраўніцтва. Пра гэта сведчыць загаловак першага варыянту: " Католическая проблема в БССР (К сведению правительства СССР )". На апошняй старонцы рукапісу (тэксты абодвух дакументаў напісаны на тых жа бланках Упраўлення кніжнага гандлю Дзяржаўнага выдавецтва БССР, змацаваных ніткамі ў адзін сшытак) пазначана: 8.XII.45 г., Вільня, А.Станкевіч. Другі дакумент называецца "Каталицкий вопрос в БССР и проект его разрешения. Вильня. Март. 1947". Сінім алоўкам дабаўлена: "К сведению Сов. Правительства". На апошняй старонцы канкрэтызавана дата: Вильнюс, 20.III.1947. І скарочаны подпіс: Ад.Ст. Ёсць таксама лацінскія надпісы, якія пакуль што не ўдалося расшыфраваць[139].

Па сутнасці, у архіве А.Станкевіча захоўваецца грунтоўная манаграфія на тэму гісторыі Каталіцтва ў Беларусі, яго сучасна-



лёгка прынялася светлая Хрыстова навука ў старым, збуцвелым сэрцы рымляніна і грэка. На іх месца прыйшлі новыя, свежыя народы, і ўжо гэтыя на навуцы Божай пачалі гадавацца"[30] .

Развіваючы традыцыю "Нашай Нівы", газета А.Станкевіча выдала "Беларускі каляндар "Крыніца" на 1920 год", складзены самім рэдактарам і выдаўцом. Апрача звычайных каляндарных звестак, рымска-каталіцкіх і праваслаўных святаў і святцаў, у гэтым выданні ёсць літаратурныя творы для масавага чытача ("Што Янка-ваяка казаў", "Што Юрка на вечы бачыў і што казаў", "Што Юрка ў тэатры бачыў"), верш Янука Д. (Івана Дарашкевіча) "Псалом CXXXYI, навукова-асветныя, рэлігійна-этычныя нататкі ("Будзь простым" і інш.), шматлікія сельскагаспадарчыя парады, рэцэпты беларускай кухні, адрасы беларускіх грамадскіх устаноў і выдавецтваў. У артыкуле "Каталіцкі касцёл у жыцці і адраджэнні народаў" А.Станкевіч абгрунтаваў неабходнасць роднай мовы ў богаслужэнні і царкоўным асветніцтве. Пра гэта сведчыць сам Ісус Хрыстос сваім даручэннем апосталам ("Дык ідзіце, навучайце ўсе народы... , Мф.28:19); урэшце, "дар языкаў у дзень саслання Св.Духа, дадзены апосталам, выразна паказаў , як маюць аглашаць Евангелле розным народам біскупы, ксяндзы, місіянеры"[31].

Беларуска-адраджэнцкая дзейнасць А.Станкевіча неадабралася, а часцяком забаранялася польскай каталіцкай іерархіяй. У гэтых умовах ён усё ж змог рэдагаваць "Крыніцу" да канца 1921 года. У чарговай рубрыцы "Куток Уніі", падпісанай ягоным крыптонімам, чытаем: "Унія, трэба зразумець назаўсёды, павінна быць згодна з беларускім народным і палітычным адраджэннем. Само паняцце Ўніі ўтварылася з усіх духоўных ды нат'эканамічных патрэбаў беларуса. Унія ёсць, казаў бы, нашай народнай верай. Унію трэба пачынаць не ад далёкіх, туманных, нікому не зразумелых спрэчак аб розніцы Веры каталікоў і праваслаўных (гэта само прыйдзе), а /з/ працы дзеля аб'яднання беларусаў-каталікоў і беларусаў праваслаўных у адной веры, але ў розных абрадах; пачынаць трэба ад беларускага народнага, сацыяльнага і палітычнага адраджэння, ці лепш сказаць, пачынаць гутарку аб Уніі трэба на грунце беларускай мовы, палітыкі, гаспадаркі"[32].

У 1922-1925 гг. - перыяд найбольшай палітычнай актыўнасці беларускіх грамадскіх арганізацый, у тым ліку Хрысціянскай Дэмакратычнай Злучнасці, А.Станкевіч вымушаны быў часова адмовіцца ад афіцыйнага кіраўніцтва апазіцыйнай да польскага

ўрада і прапольскага каталіцтва "Крыніцай". З пачатку 1922 года рэдактарам-выдаўцом яе быў У.Знамяроўскі, з 1924 года - Б.Туронак. Новыя рэдактары шмат увагі аддавалі палітычным аспектам змагання за Беларусь, агітацыі за беларускіх кандыдатаў у польскі Сойм, публікавалі адозвы Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта, на чале якога стаялі старшыня Антон Луцкевіч, скарбнік Адам Станкевіч, намеснік старшыні Вячаслаў Багдановіч, сакратар Міхал Каханоўскі, другі сакратар Леапольд Радзевіч, сябры ўправы Фабіян Ярэміч, Мікалай Красінскі, дэлегаты "ад расейцаў" (верагодна, "рускіх" паводле культурна-нацыянальнай традыцыі) Уладзімір Самойла і Сяргей Канчэўскі[33]. Апошні - сябра камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, брат вядомага пісьменніка Ігната Канчэўскага.

Але і цяпер духоўным кіраўніком газеты і Злучнасці заставаўся А.Станкевіч. Яму разам з А.Луцкевічам удалося згуртаваць напярэдадні выбараў асноўныя партыі і групы беларускаадраджэнцкай арыентацыі. У "Крыніцы" ён вёў палеміку са сваімі ідэйнымі праціўнікамі, якія выдавалі сябе за польскіх дэмакратаў і апекуноў сялянства[34]. Там друкаваліся яго прамовы ў Сойме і соймавых камісіях. У гэтым жанры сучаснага красамоўства выявіўся талент Станкевіча-палітыка: уменне крытыкаваць і нават выкрываць праціўнікаў, не абражаючы іхняга чалавечага гонару. Моцна крытыкаваў беларускі патрыёт польскую адукацыйную адміністрацыю, нацэленую на дыскрэдытацыю і забарону беларускага школьніцтва, бліскуча пачатага падчас так званай Сярэдняй Літвы на Віленшчыне[35]. Польскую палітыку адносна Беларусі ён называў бездарожжам. "Пілсудскі,- гаварыў А.Станкевіч, - адбіраючы ад бальшавікоў нашы землі, адносна нас не меў яснай палітыкі і не быў да нас шчыры. Былі толькі часам прыгожыя словы. Чыноў прыгожых не было"[36].

У газеце "Крыніца" сваёй праблемнасцю, смелай крытыкай дзяржаўнай і касцёльнай палітыкі Польшчы вылзяляюцца артыкулы, нататкі ды іншыя матэрыялы, падпісаныя невядомым аўтарам Ігнат Папараць. Аналіз публікацый гэтага выдання за 1924 год дае падставу ідэнтыфікаваць незафіксаваны ў нашай літаратуры псеўданім з імем Адама Станкевіча. 15 чэрвеня ў "Крыніцы" з'явіўся рэзка крытычны артыкул "Каталіцтва як аружжа польскасці," падпісаны крыптонімам Ад.Ст-іч, адносна якога было вядома, што ён належыць Ад.Станкевічу. Польскае каталіцтва, сцвярджае аўтар, "з дужа малымі выняткамі прышчэплівалася не як навука Хрыстуса, а як палітычнае аружжа



7. "Права на ўласную мову, рэлігій, культуру і аутаномію кожнай нацыянальнай меншасці вынікае не толькі з натуральнай агульна-людской этыкі, але таксама з этыкі хрысціянскай, якая ў дадзеным выпадку дакладна выявілася ў вядомым афарызме: suum cuigue (кожнаму сваё. - Ул.К.) .... Маральная аснова хрысціянскай навукі аб правах нацыянальна-культурных меншасцяў грунтуюцца на пазнанні, паглыбленні і сцвярджэнні людской асобы як найважнейшага і адзінага сродка грамадскага прагрэсу і культуры". Адносіны Хрысціянства да чалавечай асобы не адмаўляюць у ёй нічога прыроджанага, тым больш яе нацыянальнай асаблівасці і самабытнасці, Хрысціянства толькі іх апрацоўвае і ўдасканальвае. "Бо кожная народнасць у светлай хрысціянскай навуцы ёсць матэрыял не для нішчэння, а для тварэння культурных каштоўнасцяў. Правы нацыянальных меншасцяў вынікаюць не толькі з хрысціянскай этыкі, але таксама з Хрыстовага наказу апосталам ("Дык ідзеце, навучайце ўсе народы...", Мф.28:19), з факту дароў Святога Духа (Дзеі 2:1:12)[137].

Тры наступныя рукапісы А.Станкевіча з гэтага ж фонду акадэмічнай бібліятэкі ёсць комплекснае - гісторыка-культурнае, тэалагічнае і грамадска-палітычнае - абгрунтаванне неабходнасці беларусізацыі касцёла ў пасляваеннай аб'яднанай Беларусі, распрацоўка эфектыўных і па-хрысціянску гуманных метадаў уключэння яго ў кантэкст беларускай нацыянальнай культуры. Усе рукапісы , аўтографы, напісаныя чорным чарнілам з праўкамі рукой аўтара, часткова на лістках блакнота, сшытка ў клетку, а найбольш - на адваротным баку бланкаў Упраўлення кніжнага гандлю Дзяржаўнага выдавецтва БССР (Віленскі аддзел).

Першы дакумент называецца "Праблема каталіцкага касцёла ў БССР" (лісты 1-10) напісаны па-беларуску ў форме дзевяці тэзісаў, датаваны алоукам: Вільня, 25.X..44 г. Высновы і прапановы разлічаны на ўвагу савецкіх урадаўцаў, накіраваны супраць польскай рэлігійнай, моўнай і культуртрэгерскай экспансіі ў Беларусі. "Каталіцтва ў Беларусі,- кажа А.Станкевіч, - ад самага пачатку яго тут паяўлення сталася сапраўды "польскай" верай. Не дзіва, што і сяння тут многія гэтак называюць. Польскія палітыкі заўсёды клапаціліся старанна, каб каталіцтва ў Беларусі было не ўніверсальным, як паказвае яго сам назоў, але выключна польскім. І сапрауды, Каталіцкі касцёл у Беларусі заўсёды быў прыладай польскай палітыкі . Але з гэтага не вынікае, што ўсе католікі ў Беларусі палякі. Не. Палякам праз Касцёл і іншымі дарогамі ўдалося спаланізаваць толькі нязначны % /працэнт - Ул.К./ бела-

ларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, БХД) на Кангрэсе нацыянальных меншасцяў. Далей прапануе кароткую даведку пра беларусаў: іх у сваёй радзіме і расцярушанні каля 12 мільёнаў, 5 млн. пражываюць у БССР, 2,5 млн. у тагачаснай Польшчы, каля 100 тысяч у Літве. Беларускі народ спрадвеку жыве ў Беларусі і толькі пасля яе раздзелу паміж Расіяй і Польшчай выступае ў апошняй як "меншасць" у дачыненні да польскай пануючай нацыі. Вось ужо пяцьдзесят гадоў , кажа аўтар, як беларусы змагаюцца за адраджэнне сваёй дзяржаўнасці і культуры, маюць для гэтага ўсе боскія і людскія, этычныя і палітычныя падставы. Сутнасць іх Ад.Станкевіч выклаў у форме аргументаваных тэзісаў, яны лаканічна зводзяцца да наступнага.

1. Кожны народ паводле прыроднага права можа і павінен захоўваць і развіваць сваю нацыянальную адметнасць, выяўленую ў мове, рэлігіі, культуры, побыце. Нацыянальная меншасць мае падставы дамагацца ад дзяржавы, у складзе якой яна пражывае, каб дзяржаўныя ўлады гарантавалі ім свабоднае карыстанне роднай мовай у школе, судзе, у дзяржаўных установах, у грамадскім жыцці наогул.

2. "Нацыянальныя меншасці па прыродзе самой маюць роўныя грамадскія правы з пануючай нацыяй". Нацыянальная меншасць як частка дзяржавы выконвае ўсе грамадскія абавязкі, адсюль лагічна вынікаюць яе правы на прадстаўніцтва ў парламенце, на ўрадавыя пасады, на школу ў роднай мове.

3. "Па прыродзе рэчаў да развіцця і культуры імкнуцца як людскія адзінкі (асобы), так і асобы грамадскія, у прыватнасці асобы-нацыі". Бо самаразвіццё ёсць натуральны інстынкт кожнага народу.

4. У полі зроку маралі злом ёсць ўсякі непамерны, нічым не абмежаваны эгаізм як адзінкавай асобы, так зборнай людской асобы - грамадскага класа, народу, дзяржавы. Недапушчальна эксплуатацыя як у адносінах паміж людзьмі, так і ў міжнацыянальных адносінах.

5. Для адраджэння сваёй нацыянальнай самабытнасці, развіцця сваёй культуры і гарантыі сваіх грамадзянскіх правоў нацыянальныя меншасці маюць права на аутаномію.

6. Найвялікшай маральнай каштоўнасцю ёсць мір паміж народамі і дзяржавамі, а найвялікшым злом і амаральнасцю ёсць вайна. Але мір у Еўропе не будзе трывалым, пакуль 40 мільёнаў нацыянальных меншасцяў, усвядоміўшых свае ўласныя асаблівасці і свае мэты, часта пазбаўлены сваіх элементарных правоў.



дзеля апалячання беларусаў". Польская каталіцкая іерархія спрабавала выкарыстаць для гэтых палітычных мэтаў Берасцейскую царкоўную ўнію І596 года. Сёння ж польскае каталіцтва служыць каланізатарскай палітыцы не толькі ў Польшчы, але і ў Савецкай Беларусі. Па дамоўленасці з Расіяй 1921 года (Рыжскі мір) Польскі каталіцкі касцёл узяў пад сваю апеку каталікоў у БССР, па сутнасці, легальна праводзіць там паланізацыю беларусаў[37] .

Праз тры дні 17 чэрвеня 1924 года выйшаў у свет наступны, 15-ы нумар "Крыніцы" - копія папярэдняга, 14-га нумару, з адной толькі папраўкай: артыкул "Каталіцтва як аружжа польскасці" падпісаны не крыптонімам Ад.Ст-іч, а псеўданімам Ігнат Папараць. З рэдакцыйнай практыкі газеты "Крыніца" вядома, што такі паўтор матэрыялу папярэдняга нумару ў наступным прымяняўся ў выпадку, калі цэнзура канфіскоўвала тыраж за пэўную публікацыю. Тады чарговы нумар узнаўляў матэрыял папярэдняга, за выключэннем "крымінальнага" артыкула, на месцы якога ў газеце пакідалася "белая пляма".

Зусім верагодна, што ў выпадку з артыкулам "Каталіцтва, як аружжа польскасці" прэтэнзіі ўзніклі з боку польскай каталіцкай іерархіі" і не так да газеты (свецкія перыядычныя выданні былі ў кампетэнцыі свецкай жа ўлады), як да аўтара артыкула, ксяндза, які выкрываў антыбеларускую імперскую палітыку "свайго" касцёла. Гэтая мая здагадка пацвердзілася аналізам манаграфіі Адама Станкевіча "Беларускі хрысціянскі рух" (1939). Аўтар там піша пра канфлікты БХД і газеты "Крыніца" з духоўнымі каталіцкімі ўладамі. Віленскі епіскап Я.Матулевіч спачуваў беларускаму адраджэнню і абмяжоўваўся асцярожнымі заўвагамі ў афіцыйных лістах да ксяндза Ад.Станкевіча, пераважна да артыкулаў у "Крыніцы". Пазней архіепіскап Р.Ялбжыкоўскі абвінаваціў БХД і "Крыніцу" у бальшавізме, абыякавасці да рэлігіі, а ў 1928 годзе выдаў спецыяльны ўказ, які забараняў каталікам су-працоўніцтва з імі[38].

Ад.Станкевіч аказаўся перад выбарам: альбо пакінуць душапастырскае служэнне ў касцёле, альбо адысці ад беларускага хрысціанска-дэмакратычнага руху. Але ён не мог выбіраць, бо касцёл даваў яму вялікую аўтарытэтную трыбуну і сувязь з народам, а БХД і "Крыніца" былі фактычна пад ягоным ідэйным кірауніцтвам. У выніку гэтага канфлікту з прапольскім касцёлам Ад.Станкевіч спачатку адмовіўся ад фармальнай пасады выдаўца і рэдактара "Крыніцы", застаючыся яе фактычным кі-

рауніком, а пасля "перадаў" сваё аўтарства ў газеце нікому невядомаму Ігнату Папараці, зрэдку падпісваючыся сваім імем альбо раскрытымі крыптонімамі пад нейтральнымі адносна касцёла матэрыяламі.

Тое ж самае зрабіў другі выдатны беларускі ксёндз, публіцыст і палітык Уладзіслаў Талочка, які друкаваўся ў "Крыніцы" пад псеўданімам Адам Саладух[39]. А заходнебеларуская "Крыніца" апынулася ў становішчы колішняй "Нашай нівы" у Расійскай імперыі: большасць яе аўтараў ананімныя, скрытыя пад псеўданімамі, крыптонімамі. Артыкулы рэдакцыйныя, перадавіцы, іншыя "вострыя" матэрыялы друкаваліся без подпісаў. Аналіз іх зместу і стылю сведчыць, што найбольш прынцыповыя і смелыя з іх, верагодна, належаць Ад.Станкевічу.

Вось, напрыклад, у студзені 1924 г. газету "Крыніца" падпісваў рэдактар-выдавец Б.Туронак. Але ў навагоднім нумары агляд яе гісторыі і праграмы робіць І.Папарацы у артыкуле "Аб сабе самой", дзе піша: "Ад года І920 да сяння ў "Крыніцы" знаходзім многа чаго новага. У ёй ўжо знаходзім, апрача кірунку народнага, кірунак сацыяльны (грамадскі) і выразны палітычны.... За сваю і шчырую абарону правоў беларускага сярмяжніка прыйшлося ёй многа ўцярпець ад сваіх праціўнікаў і ворагаў"[40].

І ўсё ж да 1928 года, гэта значыць, да публікацыі арцыбіскупам віленскім Р.Ялбжыкоўскім "вердыкта", які фактычна "адлучаў" БХД і "Крыніцу" ад каталіцтва, А.Станкевіч уваходзіў у афіцыйнае кіраўніцтва партыі, друкаваў свае артыкулы і соймавыя прамовы пад сваім імем альбо пад фактычна раскрытымі крыптонімамі. Так, у артыкуле "Вялікая справа" (1924) ён вітаў вядомае "узбуйненне" Беларусі, далучэнне да БССР беларускіх земляў Віцебшчыны і Магілёўшчыны. Разам з тым ён прадбачыў верагодную трагедыю будаўнікоў Беларускай дзяржавы, бо супраць яе, казаў ён, выступяць усе варожыя да яе сілы[41].

Адкрытым тэкстам выступаў Ад.Станкевіч у абарону нацыянальных ідэалаў, абвешчаных Актам 25 сакавіка 1918 года пра дзяржаўную не залежнасць Беларусі"[42]. Вось цытата з французскай газеты за 1924 год якую прыводзіць Станкевіч у сваім выкрывальніцкім артыкуле:"Хваля ўціску ідзе цяпер праз Польшчу. Краёвыя газеты, будучы прыдушаны, ледзь могуць аб гэтым гаварыць. Усе газеты паступовыя /прагрэсіўныя. - Ул.К./ закрываюцца адразу .... Ад арганізацый прафесіянальных адбіраюцца памяшканні... У турмах Польшчы цяпер больш як 3.000 палітычных вязняў"[43] . У артыкуле "Не гэтай дарогай" ён пісаў:



## 6. НАПЯРЭДАДНІ БАЛЬШАВІЦКАЙ ГАЛГОФЫ: 1939-1949 гг.

Драматычныя ў еўрапейскай гісторыі 1939-1940 гады (пачатак Другой сусветнай вайны) былі вельмі напружанымі ў творчым жыцці Адама Станкевіча: тады выйшлі ў свет яго апошнія ўнікальныя ў беларускай літаратуры, грамадскай і рэлігійнай думцы манаграфіі "Беларускі хрысціянскі рух", "Хрысціянства і беларускі народ", пад яго рэдакцыяй і ягонай працай выдаваўся часопіс "Хрысціянская думка", рыхтаваліся і праводзіліся іншыя выдавецкія, рэлігійныя і палітычныя акцыі. Але з гадоў акупацыі Беларусі нямецкай арміяй (1941-1944) і з апошняга, савецкага этапу (1944-1949) жыцця гэтага рыцара беларушчыны да апошняга часу было мала што вядома, пакуль не адкрылася хоць не ўся, але вельмі каштоўная частка ягонай рукапіснай спадчыны.

У нацыянальным архіве-музеі літаратуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь захаваліся фрагменты былога Беларускага музея імя Івана Луцкевіча "Сярод іх - перапіска Адама Станкевіча са сваімі супрацоўнікамі і, верагодна, ягоны рэферат "Беларуская нацыянальная меншасць у Польшчы"- (машынапісны тэкст на нямецкай мове, 1936 год, 42 лісты)[136]. У апошнім дакуменце аўтар папулярна растлумачыў еўрапейскай грамадскасці, хто такія беларусы і Беларусь, чаму яны аказаліся "меншасцю", хоць паводле сваёй многавекавой гісторыі і культуры заслугоўваюць на аднаўленне незалежнай дзяржавы.

Сёння варта пахваліць дырэкцыю Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі Беларусі: дваццаць пяць гадоў таму назад, калі спадчына Станкевіча была замкнёна ў спецфондах, бібліятэка набыла ў сваячніцы пісьменніка Марыі Шутовіч ягоны захаваны асабісты архіў, сярод якога незакончаныя і нідзе не апублікованыя творы, аналітычныя запіскі, накіраваныя савецкім уладам, чарнавікі вядомых даследаванняў, перапіска, дзённікі, іншыя аўтабіяграфічныя матэрыялы і фатаграфіі. Найбольш каштоўнымі для майго нарысу аказаліся чатыры старанна апрацаваныя рэфераты альбо аналітычныя запіскі.

Рэферат "Этычныя асновы народных і культурных правоў нацыянальных меншасцяў" (5 машынапісных старонак на польскай мове). На першай старонцы ёсць аўтограф-подпіс Адама Станкевіча , на апошняй - пазначана дата і месца:"Вільня, 8.У. 1937 г. З прадмовы да рэферату вынікае, што аўтар выступае як прадстаўнік Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні (пераемнік Бе-

Хрыста - пераўтварэння вады ў віно на вяселлі ў Кане Галілейскай: "Гэтым паказаў наш Божы вучыцель, што ён не пустыннік, уцякаючы ад жыцця, а што ён валадар жыцця, сваім прыкладам, сваёй прысутнасцю жыццё папраўляе і падвышае" [133].

Вось так ксёндз і пісьменнік Адам Станкевіч, бадай што наш сучаснік, аднавіў і развіў старадаўнюю беларускую традыцыю евангельскай экзегетыкі і царкоўнага красамоўства, заснаваную Кірылам Тураўскім, Францішкам Скарыною, Сімяонам Полацкім. Іх характэрныя прыкметы - глыбокі сімвалізм, дасціпная вобразная экспрэсія, спалучэнне рэлігійнай ўзнёсласці і зямной цеплыні.

Прывяду толькі некалькі фрагментаў з гэтай энцыклапедыі касцёльнага красамоўства. У лекцыі - казанні да евангельскага аповяду пра цудоўны ўлоў рыбы на глыбіні возера (Лук.5:і-П) аўтар кажа: "Першай прычынай, што людзі, як тыя рыбаловы, нічога не могуць "злавіць" у сваім жыцці і жыццё гэта трацяць надарэмна, ёсць тое, што яны "ловяць у ночы", праводзяць сваё жыццё ў цемры граху". Але і ў святле Божай праўды чалавеку патрэбна "адплысці на глыбіню" і закінуць мяржы справы сваёй аж да дна. Адсюль - сімволіка загалоўку гэтага казання - цытата з Евангелля: "Адплыві на глыбіню і закіньце сеці вашы на лоў..."[134].

У лекцыі "Аб патрыятызме" (тлумачэнне да евангельскага чытання- Лук.І9: 41-47) А.Станкевіч лаканічна і дакладна абазначыў сутнасць так званага камуністычнага інтэрнацыяналізму: "Не прызнае патрыятызму камунізм. Гэтая навука кожны народ уважае (лічыць- Ул.К.) не як свядомую духоўную цэласнасць, але як масу людзей, зложаных з супярэчных сабе класаў, і затым камунізм не любові Бацькаўшчыны навучае, а класавай барацьбе ....І толькі Хрысціянства вуча нас праўдзіва і поўна, як трэба адносіцца да сваёй Бацькаўшчыны і як яе належа любіць"[135] .

Пра асветніцкі талент Станкевіча як настаўніка сведчыць ягонае казанне "Аб скончэнні свету" - на эсхаталагічнае прароцтва Хрыста" (Мф.24:15-35). Гэта - пра энергетычную, альбо цеплавую смерць Сонечнай Сістэмы, пазней фізікамі сфармуляваную ў тэорыю сусветнай энтрапіі. "Божае Слова" А.Станкевіча сёння магло б паслужыць падручнікам для вернікаў і хрэстаматыяй для царкоўных асветнікаў. На жаль, яна малавядомая не толькі царкоўнаму народу, але і даследчыкам. Адзіны экземпляр яе, заказаны мною ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Акадэміі навук Беларусі, аказаўся "неразрэзаным": я быў першым чытачом гэтай кнігі.



"Тысяч восем ужо сядзяць на нашых землях асаднікаў чужынцаў.... На ўсіх беларускіх землях блізу зусім знішчана беларуская школа, а заведзена польская.... Словам, адымаецца ад беларуса ўсё для яго найдаражэйшае: зямля і душа яго. А ўзамен за гэта даецца яму немагчымы цяжар падаткаў, пераважна нягодная, бо пасланая здалёку паліцыя і адміністрацыя" [44].

У "Крыніцы" за 8 ліпеня 1924 года змешчана нататка Ігната Папараці "Важная праява". У ёй апавядаецца пра апазіцыю правінцыйных прапольскіх палупанкоў да беларускай мовы ў касцёле. Пазней пра гэты эпізод - сутыкненне ксяндзоў-беларусаў і вернікаў касцёла з мясцовым абшарнікам Язэпам Яцынам - Ад.Станкевіч пісаў у сваёй кнізе "Родная мова ў святынях" (1929). У артыкуле "Новы закон аб мовах" (1924) пад гэтым жа псеўданімам Ад.Станкевіч крытыкаваў дзяржаўны праект закона, паводле якога беларусы, украінцы і літоўцы не мелі права на свае дзяржаўныя школы з выкладаннем на роднай мове, дапускаліся толькі школы "мяшаныя", з беларускімі класамі. Гэты закон, на думку аўтара, быў выклікам міжнароднаму праву, у тым ліку Вярсальскаму трактату і Рыжскай дамове 1921 года[45] .

У другой палове 1924 года Ад.Станкевіч апублікаваў у газеце "Крыніца" шэраг палемічных артыкулаў - "Сумныя ўгодкі", "Час звярнуцца на ўласную дарогу", "Змагаемося за беларускія школы!" , "Ліга народаў і Віленшчына", "Будудь далей ціснуць" і інш. У іх беларускі асветнік выкрываў эгаізм і бяздушша гандлёва-фінансавых алігархій, пачынальнікаў Сусветнай вайны, у якой загінула 35 мільёнаў людзей, а даходы з яе трапілі "у кішэні дармаедаў", выступаў за вызваленне касцёла ад каланізатарскай палітыкі польскіх абшарнікаў і ўрадаўцаў; крытыкаваў Лігу Нацый, якая дазволіла Польшчы захапіць амаль палову Беларусі з Віленшчынай, а сама вырадзілася ў "кучку еўрапейскіх банкіраў". І як толькі мог, змагаўся з курсам польскага ўрада на ліквідацыю беларускамоўных школак. Звярнуўшы ўвагу на імкненне сялян вучыць сваіх дзяцей у школе, ён казаў: "Аднак з жалем трэба сцвердзіць, што гэтыя кляйноты беларускай душы пераважна гінуць зусім, альбо ідуць на карысць чужынцаў"[46].

У прамове Ад.Станкевіча 10 снежня 1924 года ў часе дыскусіі аб дадатковым бюджэце ("Крыніца", як правіла, друкавала ўсе соймавыя выступленні беларускіх паслоў і сенатараў) гэтае горкае праўды ў рэзкіх танах гаварылася польскаму ўраду: "Бо ўрад п.Грабскага,- казаў наш пасол, - як і ўсе папярэднія ўрады, бясспрэчна вядзе проці нас палітыку дэнацыяналізацыі і знішча-

жэння - у раўнай меры на грунце культурным і эканамічным.... Больш як двухмільённы беларускі народ у Польшчы мае дзяржаўных школ не больш пяцёх, а прыватных - не больш пятнаццацёх, бо ж і на апошнія з трудом даецца дазвол.... Літоўскі вучнёўскі інтэрнат разам з школай быў выкінуты на вуліцу[47].

У 1925-1937 (да 17 лістапада) газета БХД называлася "Беларуская крыніца". На першыя тры гады (1925-1927) прыпадае апошні перыяд актыўнага ўдзелу Ад.Станкевіча ў кіраўніцтве БХД і супрацоўніцтва ў яе друкаваных органах. Пагроза адлучэння ад касцёла заставалася, беларускаму асветніку прыходзілася друкавацца ананімна. Паводле спецыфічнай для Ад.Станкевіча тэматыкі і стылістыкі, ёсць падставы лічыць яго публікацыямі артыкулы ў "Беларускай крыніцы" за 1927 год "У дзевятыя ўгодкі (25.III.1918 - 25.III.1927)", "На Вялікдзень", "За вечнай мэтай" (пра ідэал царкоўнай уніі), "Аб душы моладзі", "Да справы Ўніі", "Народны шлях пераможа" і інш. У іх абараняюцца сацыяльныя, нацыянальныя і духоўныя каштоўнасці беларусаў, прапагандуецца ідэя царкоўнага адзінства на аснове агульных хрысціянскіх ідэалаў. Ёсць тут цікавая інфармацыя аб руху за адраджэнне Ўніі ў Беларусі ў кантэксце беларускай моўна-культурнай самабытнасці[48] .

У лістападзе 1927 года адбыўся Другі з'езд Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД). Гэта была вяршыня адкрытай палітычнай і журналісцкай дзейнасці Ад.Станкевіча. З'езд пачаўся з імшы. "З казаннем на беларускай мове, - паведамляла газета,- выступіў кс.Станкевіч. Як заўсёды ў нядзелю, толькі больш урачыста, лілася з амбону ў касцёле св.Мікалая наша беларускае роднае слова, зразумелае, чысцюсенькае - проста ў душу прыбыўшага з вёскі беларуса"[49].

Ад.Станкевіч аднагалосна быу выбраны старшынёй З'езду. Ён жа выступіў там з асноўным дакладам "БХД і яе ідэалогія". З'езд пачаў рэарганізацыю партыі ў кірунку ператварэння з каталіцкай у агульнахрысціянскую. На ім былі дэлегаты ад праваслаўных беларусаў, трое з іх выбраны ў Цэнтральны Камітэт. Ад.Станкевіч таксама выбраны ў кіраўнічы орган партыі.

Пасля шматлікіх папярэджанняў (1924-1927 гг.) арцыбіскуп Р.Ялбжыкоўскі спецыяльна па прэцэдэнту грамадска-палітычнай дзейнасці ксяндза Ад.Станкевіча апублікаваў 10 снежня 1928 года пасланне да каталіцкага духавенства і вернікаў, у якім БХД і "Крыніца" абвінавачваліся ў бальшавізме і абыякавасці да рэлігіі.



цю", павінны акцэнтаваць увагу не на тым, што нас падзяляе, а на тым, што нас злучае, кіруючыся правілам св.Аўгустына: "У сумнівах свабода, у канечных справах - адзінства, у ва ўсіх - любоў"[131].

Шмат працы і змагарнай энергіі аддаў Станкевіч справе хрысціянскага асветніцтва на роднай для нас мове. Па ягонай ініцыятыве ксяндзы ў былой Заходняй Беларусі адстаялі права на беларускія казанні ў касцёлах. Яшчэ ў 1922 годзе А.Станкевіч выдаў коштам газеты "Крыніца" кніжку ксяндза і доктара тэалогіі Ідэльфонса Бобіча "Нядзельныя Эванэліі і навукі", яна доўга была першым падручнікам Божага Слова ў беларускай мове.

Пра гэта напісаў А.Станкевіч у прадмове сваёй кнігі "Божае Слова, Лекцыі, Эванэліі і Прамовы на нядзелі і святы" (1938). Гэты твор - бадай што найлепшы беларускі падручнік па евангельскай экзегетыцы і касцёльным красамоўстве. "Дык няхай жа,- закончыў у прадмове аўтар, - гэтая кніжка "Божае Слова" ідзе пад саламяныя стрэхі беларускага народу і, нясучы яму адвечную Хрысціянскую навуку, няхай крапіць яго імкненні да лепшага жыцця, да жыцця свядомага нацыянальна і рэлігійна, да свята і Праўды".

Кніга "Божае Слова" мае пяцьдзесят нядзельных і сорак чатыры святочных лекцый, кожная лекцыя складаецца з апостальскіх і евангельскіх чытанняў і адпаведнага казання багаслоўскага і маральна-асветніцкага зместу, часам звязанага з сацыяльна-палітычнымі ацэнкамі. Фрагменты з Апостала і Евангеліяў А. Станкевіч прыводзіць у сваім добрым перакладзе на беларускую мову.

Вось для прыкладу фрагмент першага ягонага казання - тлумачэнне апакаліптычнага прароцтва Ісуса Хрыста (Лук. 21:25-33): "Праходзяць вякі, мінаюць пакаленні, народы, вялікія культуры, паўстаюць і ўміраюць мудрыя людскія навукі і філасофіі, знікне нават гэты свет увесь, а навука Хрыстуса , як ён сам кажа ў сяньняшняй Эванэліі, трывае заўсёды, як навука вечная, жывая, якая ўсцяж расце, цвіце і дае духоўныя плады"[132].

Альбо вось яшчэ ўзоры беларускага, "цёплага" красамоўства ксяндза Адама. З казання "Характар св.Яна - стройны ўзор для нас:"Гэта дуб, які глыбока ўрос у зямлю і нялёгка абвярнуць яго; гэта сонца, што стала трымаецца неба, а толькі косамі сваімі зыходзіць на зямлю". Гэтую цеплыню Божага дачынення да людскіх спраў красамоўна раскрываецца ў казанні "Жанімства - вялікі сакрамэнт". Гутарка ідзе пра сімвалічны сэнс першага цуду

Апошнія раздзелы XIII і XIУ) кнігі прысвечаны ролі Хрысціянства ў "адраджэнцка-вызвольны перыяд беларускай гісторыі" (XX ст.). Гэтая праблематыка закраналася А.Станкевічам у ранейшых публікацыях, пра якія гутарка ўжо вялася ў маіх нарысах. Застаецца толькі дапоўніць іх новымі высновамі і ацэнкамі, абгрунтаванымі ў манаграфіі "Хрысціянства і беларускі народ".

Гаворачы аб беларускім хрысціянскім руху, запачаткаванай Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыяй (БХД), аўтар піша: "Гэты кірунак - гэта ўжо яўная антытэза да Хрысціянства ў Беларусі афіцыйнага - польскага ці расейскага, якое і сяння яшчэ ёсць дзейнікам адносна нашага народу антынацыянальным. Беларускае сучаснае Хрысціянства мае, такім чынам, вялікае гістарычнае заданне-асвабадзіць Хрысціянства, даць яму натуральны доступ да беларускага народу, асвабадзіць душу беларуса ад фікцыі хрысціянскай - ад "польскай" і "рускай" веры, мае заданне абараніць душу беларускага народу і абараніць цэласнасць і адзінства беларускай нацыі"[128].

Але незалежна ад нацыянальнага кантэксту Хрысціянства...ёсць з натуры сваёй вялікай маральнай абаронай і апорай нацыянальнага жыцця агулам, а гэтым самым і беларускага народу .... Кожная нацыянальнасць у святле Хрыстовай навукі ёсць матэрыялам не для нішчэння яго, але для тварэння з яго культурных вартасцяў"[129]. Гэтая выснова абгрунтавана ў манаграфіі А.Станкевіча евангельскім вучэннем Хрыста, думкамі выдатных тэолагаў і хрысціянскіх філосафаў, у прыватнасці Ул.Салаўёва. Што датычыцца бальшавіцкага камунізму ды імперыялізму ("скрайняга нацыяналізму", то "ён, адкідаючы Бога, Хрысціянства, асабовасць чалавека і яго душу кансэквэнтна адкінуў так жа і нацыянальнасць і ў святле Еванэліі (Евангеллі.- Ул.К.) асудзіў сам сябе"[130].

Урэшце, манаграфія А.Станкевіча завяршаецца аналізам нова-уніяцкіх тэндэнцый у беларускім рэлігійным руху нашага стагоддзя, у якім аўтар справядліва ўбачыў спробу рэлігійнага і культурна-нацыянальнага сінтэзу. Яго неабходнасць аўтар выводзіць з ужо вядомага нам закону кантрасту. Адсюль вынікае нацыянальная беларуская ідэя, што адмаўляе крайнасці Ўсходу і Захаду, асімілюе пазітыўныя вынікі таго і другога, трымаючыся "сваёй нацыянальнай восі". Але ў гэтым руху да абноўленай Уніі беларусы павінны не паўтараць памылак мінуўшчыны, пазбягаць гвалту і прымусу, праваслаўныя і ўніяты ў сваіх узаемаадносінах "павінны трымацца з брацкай узаемнай спагаднас-



Пасланне канчалася вось такой пастановай: "У сувязі з гэтым і ў адпаведнасці з Кодэксам Права Кананічнага (Каноны 1386, 1395, 1399, 1405 і інш.) абвяшчаем, што каталікам, а тым больш каталіцкім капланам да гэтай арганізацыі БХД нельга належаць альбо інакшым чынам падтрымліваць. Не вольна таксама каталікам выпісваць, чытаць, распаўсюджваць, супрацоўнічаць альбо інакш падтрымліваць часопіс "Беларуская крыніца". Асабіста да Ад.Станкевіча арцыбіскуп паслаў ліст паводле якога па тых жа матывах яму загадаў: "... Каб зараз жа пакінуў арганізацыю "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" і каб устрымаўся ад усякага супрацоўніцтва і спрыяння як адносна да названай арганізацыі, так і да часопіса "Беларуская крыніца"[50]. Але і пасля гэтага не закончыўся ўдзел Ад.Станкевіча ў друкаваных органах БХД, яго духоўны ўплыў на яе захаваўся да канца. Каб засцерагчы сябе ад канфісіянальнага ўмяшальніцтва ("вызваліць беларускую палітычную думку з чужацкіх рэлігійна-палітычных цянётаў", - гаварылася ў рэдакцыйным артыкуле "Беларускай крыніцы", 9 лютага 1936 г.), кіраўніцтва БХД паскорыла яе трансфармацыю ў грамадска-палітычную партыю на грунце агульнахрысціянскай ідэалогіі. Рэдактарам "Беларускай крыніцы" у 1929-1936 гг.. быў свецкі беларускі дзеяч Ян Пазняк, выдавец Янка Шутовіч. Пазней - газету рэдагавалі Ад.Станкевіч, Адольф Клімовіч. Нарэшце, у лютым 1936 года БХД была абноўлена іператворана ў Беларускае Нацыянальнае Аб'яднанне (БНА). Газета "Крыніца" выходзіла да 12 ліпеня 1940 года, спынілася пасля акупацыі Вільні савецкай арміяй. А.Станкевіч не пакідаў яе да канца, стаўшы ўрэшце яе летапісцам. Паводле ягонага падліку, газета мела 58 канфіскацый, адзін толькі Ян Пазняк вытрымаў 35 рэдактарскіх судовых праследаванняў, шмат хто асуджаны на штрафы і арышты[51].

Лідэры БХД і рэдакцыя "Беларускай крыніцы" былі не з тых памяркоўных беларусаў, якія адступалі пад націскам дзяржаўнай і касцёльнай цэнзуры. Адам Станкевіч ад імя ЦК БХД паслаў у Рым да Апостальскай Сталіцы тэлеграму адразу ж пасля грознага вердыкту арцыбіскупа - 11 снежня 1928 года, а пазней шырока апрацаваны мемарыял, даказваючы згоднасць БХД з каталіцкай сацыяльнай дактрынай і касцёльнай практыкай. Аднак з Рыму адказу не было, верагодна, там занялі нейтральную пазіцыю адносна канфлікту арцыбіскупа з беларускімі лідэрамі, скарэй палітычнага, чым рэлігійнага. У выніку гэтага распачатая арцыбіскупам Р.Ялбжынскім вайна з БХД закончылася пазіцыяй, паводле

успамінау Ад.Станкевіча, як ў Л.Троцкага: ні міру, ні вайны. Ад.Станкевіч ды іншыя ксяндзы часова і фармальна выйшлі са складу ЦК БХД, але працягвалі супрацоўніцтва з "Крыніцай" і партыяй напоўлегальна. Ад.Станкевіч апублікаваў у ёй за 1931 год нарыс "У дзесятыя ўгодкі смерці Андрэя Зязюлі" пад псеўданімам А.Сакалінскі[52] і, верагодна, шэраг праграмных артыкулаў ананімна ("Культура і палітыка", "У справе рэлігійнай уніі", "Капіталізм, камунізм і хрысціянскі светапогляд", "Шлях да нарадаўладдзя: Да ідэалогіі БХД"), удзельнічаў у падрыхтоўцы матэрыялаў, якія выкрывалі жорсткія рэпрэсіі бальшавісцкай улады ў СССР супраць беларускай інтэлігенцыі і сялянства.

На чарговым з'ездзе БХД (13 снежня 1931 г.) Станкевіча зноў выбіраюць у ЦК БХД разам з рэдактарам газеты Янам Пазняком, доктарам Ст.Грынкевічам, студэнтам Янкам Шутовічам ды іншымі свецкімі асобамі. Загад арцыбіскупа Ялбжынскага страціў актуальнасць, а пасля перайменавання БХД у Беларускае Народнае аб'яднанне аказаўся беспрадметным. У апошнім нумары 25 снежня 1936 г. "Беларуская крыніца" апублікавала прамову Ад.Станкевіча "У Дзень Беларускай Культуры" на Канцэрце Акадэміі 13 снежня гэтага года.

Кіраўніцтва абноўленай партыі, "Беларуская крыніца" і часопіс "Калоссе" наладзілі Адаму Станкевічу ў студзені 1940 года завочную навукова-літаратурную канферэнцыю, прысвечаную 25-ым угодкам ягонага святарства і беларускай нацыянальнай дзейнасці (10.01.19І5-10.01.1940). Юбілейныя матэрыялы былі апублікаваны ў двух нумарах "Крыніцы" (12 і 16 студзеня 1940 г.) і ўвайшлі ў апублікаваную тым жа годам кнігу "Ксёндз Адам Станкевіч", пра якую ўжо гаварылася ў пачатку гэтых нарысаў. У апошніх выпусках "Крыніцы" юбіляр надрукаваў свае артыкулы "Сям'я і народ", "Юбілей беларускага патрыярха Францішка Багушэвіча" (аўтарства верагоднае, крыптонім А.-ski) і выдатнае эсэ "На свята Маткі: Увагі аб дастойнасці і значэнні Маткі, якое было апублікавана асобнай брашурай[53-54].

Аутарытэт Ад.Станкевіча, яго ахвярнасць і маральная вышыня былі вядомыя не толькі беларусам, але і каталіцкай іерархіі. У жніўні 1927 года віленскі арцыбіскуп дазволіў яму выдаваць непалітычны рэлігійны часопіс "Хрысціянская Думка". Пачаўся ён у 1928 годзе і пратрымаўся аж да савецкай акупацыі Вільні ў 1940 годзе.

Пра яго пойдзе гаворка ў асобным раздзеле майго нарыса.



най "апорай беларускай нацыянальнасці", якраз у самы драматычны свой час, калі адбывалася паланізацыя Касцёла і русіфікацыя Царквы ў Беларусі. Пакідаючы свой народ, падладжваючыся "пад паляка", верхавіна беларускай шляхты здраджвала Ўніі.У ХУІІІ ст. Уніяцкая царква "была ўжо выключна верай сялянскай, прычым многа ўжо злацiненая і спольшчаная". Але і ў такой форме яна аказалася гістарычнай неабходнасцю. "Надта магчыма, - пісаў А.Станкевіч, - што калі б не гэтая Ўнія, дык сяння ўжо не было б беларускай нацыі, яна ці такім, ці іншым чынам патанула б у маскоўскім нацыяналізме, куды гразнейшым /больш грозны. - Ул.К./ для нас, як такі ж нацыяналізм і імперыялізм польскі ... Словам, Унія, як бачым, гэта такая на нашых землях форма Хрысціянства, якая найбліжэй сваёй натурай да натуры беларускай, якая сапраўды з'яўляецца апорай нацыянальнай і культурнай гэтага народу"[124].

Урэшце, не меншая, калі не большая роля Ўніі ў пачатку расійскага перыяду гісторыі Беларусі тады нашая культура мела хоць незайздроснае, але "пэўнае прыпынішча ў зацішшы ўбогай, як і сам народ" Уніяцкай царкве. "Унія ў гэтым часе на нашых землях - гэта была сапраўды адзіная апора беларускай культуры, бо яна адна адзіная была звязана арганічна з народам і з патрэбамі яго душы, адна адзіная гэтай душы, як магла і чым магла, служыла"[125].

Два раздзелы сваёй манаграфіі XI і XII) А.Станкевіч прысвяціў гісторыі Касцёлу рымскага абраду, яго неадназначнай, супярэчлівай ролі ў беларускім нацыянальным адраджэнні. На раннім этапе (XІУ- ХУІ стст.), калі Касцёл здолеў адаптавацца да беларускага духоўнага асяроддзя, і яшчэ больш пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі, калі ён быў у апазіцыі да яе каланіяльнай палітыкі, гэтая роля аказалася цалкам станоўчай, добрадатнай. "Беларусы-лацінікі, - робіць выснову даследчык, - у большай ці ў меншай меры, але заўсёды ўжывалі ў сваім рэлігійным жыцці, апрача літургічнай латыні, так жа і сваей народнай мовы"[126]. У грозны для беларускай нацыі час, калі была зліквідавана Ўнія, а Праваслаўная царква поўнасцю кантралявалася царызмам, Каталіцкі касцёл збярог беларускую мову, а з ёю разам "беларускую душу і культуру"[127] .

У манаграфіі А.Станкевіча прыводзіцца багаты аналітычны гісторыка-культурны матэрыял, які сведчыць аб прыярытэце дзеячаў каталіцкай рэлігійнай традыцыі ў беларускім нацыянальным Адраджэнні XIX - пачатку XX ст.

ло "апорай і творывам беларускай нацыянальнасці ў эпоху Вялікага Княства Літоўскага, садзейнічала росквіту яе культуры ў "залаты век" (ХУІ стагоддзе) нашай гісторыі, Эпоха Ф.Скарыны і трох рэдакцый (1529, 1565 і 1588 гг.), Статута гэтай дзяржавы. Але і ў рэнесансны перыяд справядліва зазначае А.Станкевіч, Хрысціянства было галоўным матывам беларускай культуры: "Так, напрыклад, ідэі гуманізму, ідэі рэнесансу, безумоўна, да Беларусі пранікалі, але і яны, хоць у сваёй крыніцы да Хрысціянства варожыя, у нас праяўляліся ў форме хрысціянскай. Яркім гэтага прыкладам служа наш Фр.Скарына з беларускім сваім перакладам Бібліі і з дапіскамі да яе"[121]. Каталіцтва тады таксама добра інтэгравалася ў кантэкст гэтай культуры. "Беларусы каталікі сёння павінны ведаць,- зазначаў А.Станкевіч, - што польская мова ў касцёлах сярод беларускага народу - гэта справа пазнейшая, прад тым была мова беларуская. Была нават адпаведная беларуская каталіцкая літаратура"[122]. Наш асветнік даследуе гэтую традыцыю і разглядае беларускі каталіцкі рух ХХ ст. як працяг яе.

Што датычыцца царкоўнай уніі 1596 года, то яе наступствы для беларускай нацыі і культуры, на думку А.Станкевіча, былі неадназначнымі. Спачатку яна была выкарыстана антыбеларускімі сіламі для паланізацыі і націску на спрадвечныя народныя традыцыі: праз сто гадоў пасля Берасцейскага царкоўнага сінода, у 1697 годзе прыняты закон, пра замену ў афіцыйным справаводстве беларускай мовы мовай польскай. Але, з другога боку, Берасцейская ўнія была першай спробай рэалізацыі вялікай ідэі хрысціянскага адзінства; ідэі, якая задоўга да гэтага завалодала розумам духоўных лідэраў нашага народу (ініцыятыва Вітаўта на Наваградскім сінодзе ў 1414 г., выбранне Рыгора Цамблака мітрапалітам і яго місія ў Канстанцінопалі з мэтай атрымання патрыяршага благаславення на ўнію, фларэнційская ўнія 1438-1439 гг., уніяцкія мітрапаліты Сідар і Рыгор), але не была глабальна рэалізаваная з-за процідзеяння прамаскоўскага праваслаўя і Польскай кароны, асабліва пасля Люблінскай уніі 1569 года.

Пазней антыбеларускім сілам не ўдалося ператварыць Уніяцкую царкву ў паслухмяную служку паланізацыі. "Берасцейская ўнія, - кажа А.Станкевіч, - трымалася і развівалася на беларускіх землях ... 248 гадоў. За гэты вялікі час яна настолькі зраслася з беларускай душой, што ўжо смела можна сказаць, сталася сапраўды народнай беларускай верай"[123]. Атрымалася так, што ў ХУІІ- ХУІІІ стст. Уніяцкая царква засталася галоў-



## 3. АДАМ СТАНКЕВІЧ - ГІСТОРЫК І ПАЛІТОЛАГ

Заслугі Ад.Станкевіча як гісторыка доўгі час былі забытыя не толькі грамадствам, але і айчыннай і замежнай гістарычнай навукай. Яго глыбокія навукова-папулярныя даследаванні, напісаныя на аснове аналізу і ацэнкі ўсіх захаваных першакрыніц, аж да 1990-х гадоў знаходзіліся ў аддзелах спецзахавання савецкіх бібліятэк і архіваў, пад кантролем адпаведных органаў КДБ. Доступ да іх абмяжоўваўся спецыяльнымі дакументамі, забаранялася іх перавыдаваць, цытаваць, аб'ектыўна аналізаваць, дазвалялася і заахвочвалася толькі іх ганьбаванне і "выкрыццё". У гэткіх умовах даследчыкі часам выкарыстоўвалі фактычны матэрыял кніг , артыкулаў і брашур А.Станкевіча па гісторыі беларускага вызваленчага руху, гісторыі беларускай літаратуры XIX - пачатку XX ст. без спасылак на "арыштаваныя" крыніцы. Што датычыцца яго праўдзівага летапісу беларускага каталіцкага руху, то гэтая тэматыка ў Савецкай Беларусі засталася незапатрабаванай.

Манаграфія А.Станкевіча "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення" (1934) спачатку друкавалася асобнымі раздзеламі ў штомесячным заходнебеларускім часопісе "Шлях моладзі" на працягу двух гадоў, а пасля, перагледжаная і дапоўненая аўтарам, выйшлі асобнай кніжкай у выдавецтве гэтага ж часопіса. Яе выданне прымеркавалася да 70-годдзя смерці Кастуся Каліноўскага і 50-годдзя народніцкага часопіса "Гоман" (1884). Кніга гэтая не страціла сваёй каштоўнасці не толькі як сумленны, праўдзівы летапіс бела-рускага нацыянальна-вызваленчага руху, але і паводле сваіх актуальных сёння метадалагічных ацэнак і высноў.

Актуальнасць тэмы пазначана аўтарам ва ўступных заўвагах: "Палітычная незалежнасць і грамадска-эканамічная самастойнасць - гэта абавязковыя варункі памыснасці і поўнага развою кожнага народу. Беларускі народ, падлягаючы няўхільным законам жыцця і яго логіцы, а таксама ідучы за прыкладам іншых народаў, 25.III.1918 праз лепшых сваіх сыноў усяму свету заявіў аб сваіх правах на палітычную незалежнасць і аб сваёй няўхільнай да гэтага волі[55]. Адказваючы тым нашым нядобразычліўцам і фальшывым "сябрам", якія адмаўлялі шматвяковую беларускую палітычную гісторыю і культуру, нават саму нацыю нашую, А.Станкевіч даказаў: Акт пра незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года быў доўгачаканым плодам шматвяковай нашай барацьбы за волю і нашай народна-палітычнай думкі.

Верагодна, А.Станкевіч добра ведаў расійскую філасофію і сацыялогію, чытаў не толькі творы Ул.Салаўева, на думкі якога не раз спасылаўся, але і тэарэтыка расійскай дзяржаўнасці Мікалая Данілеўскага, паводле якога кожны тып цывілізацыі развіваецца чападобна жывому арганізму, мае сваё "дзяцінства" і "юнацтва" (эпоха станаўлення), прадуктыўную сталасць, урэшце, перыяд завяршальнага плёну, пасля чаго наступае заняпад - гістарычная смерць і растварэнне ў новых, маладых цывілізацыях[56] .

Ёсць, пэўна, хутчэй фармальная, чым сэнсавая, аналогія паміж гэтай асноўнай ідэяй М.Данілеўскага і ўступнай заўвагай А.Станкевіча да сваёй кнігі: "У жыцці духоўным звычайна бывае так, як і ў жыцці арганічным. Спярша паяўляюцца зародкі, якія паволі растуць і развіваюцца, а ўрэшце даспяваюць і даюць пажаданы плод". Аднак канчатковая выснова А.Станкевіча адваротная той, якую сфармуляваў натураліст па адукацыі М.Данілеускі: беларускі асветнік і святар кажа нам не пра смерць культуры і ейнага носьбіта народа, а пра іх ўваскрэшанне, адраджэнне; не пра небыццё духоўнай творчасці, а пра яе вечнае абнаўленне для новага жыцця. "І народ кожны, - гаворыць наш адраджэнец, - пачынаецца ад якога племяннога зародку, пераЖывае час свайго дзяцінства, маладосці, даспеласці, старасці, заняпаду і адраджэння" (падкрэслена мною - Ул.К.). Спачатку - як быццам паўтарае думку М.Данілеускага. А ў канцы сваім ключавым паняццем адраджэнне адмаўляе яе.

Апрача гэтага, М.Данілеўскі следам за Гегелем падзяляў народы на гістарычныя і не гістарычныя, апошнім адводзіў незайздросную ролю этнаграфічнага матэрыялу, "глебы" для росту першых. Не прызнаваў нацыянальнай і культурнай самастойнасці ўкраінцаў і беларусаў, на ягоную думку, адгалінаванняў "единого русского народа"[57].

Канцэпцыя, пазней узятая на ўзбраенне і апошленая вялікарасійскімі чорнасоценцамі.

А.Станкевіч сваім жыццём, творамі і святарскім служэннем абвяргаў гэтую дзікунскую ідэалогію. "Сёння,- пісаў ен, - яшчэ часта можна пачуць галасы аб тым, што ніякай Беларусі, ніякага беларускага народа ніколі не было, а з нічога, як ведама, нічога і быць не можа"[58]. Усе яго творы, найперш "Да гісторыі палітычнага вызвалення, сведчаць пра тысячагадовую традыцыю беларускай дзяржаўнасці і культуры. Загаловак першага раздзела "Беларускі народ жыў, жыве і будзе жыць" засведчыў агульны пафас яго творчасці і жыццёвага подзвігу. Беларускі народ, -



ядналася з Апостальскай Сталіцай; але і тады ідэя царкоўнай еднасці цалкам не замерла, жыла ў Беларусі, каб у свой час уваскрэснуць. Шосты раздзел сваёй манаграфіі А.Станкевіч прысвяціў ролі Хрысціянства ў станаўленні беларускага народа, дакладней - народнасці, якую ён, па традыцыі польскай гісторыка-этналагічнай навукі, звычайна атоесамліваў з нацыянальнасцю, альбо нацыяй. У вызначэнні паняцця нацыя ён аспрэчваў два крайнія погляды - аб'ектыўны і суб'ектыўны, схіляўся да кампраміснай тэорыі. Аб'ектывісты абапіраюцца на "зверхнія" прыкметы - расу, мову, рэлігію, супольныя звычаі, супольная тэрыторыя і геаграфічнае асяроддзе - клімат, геапалітычнае становішча, урэшце, на агульны этнонім. Суб'ектывісты пераносяць акцэнт на "сувязь маральную, на агульную волю да сужыцця, на свядомасць супольнасці". Прыхільнікі кампрамісу пагадняюць гэтыя кірункі і злучаюць іх у адзін.

На жаль, тут нашаму асветніку не хапіла спецыяльных ведаў, каб прапанаваць сваю тэорыю паходжання нацый. У выніку ягоная крытыка раней вядомых канцэпцый атрымалася занадта абагуленая, апрыерная і пагэтаму непераканаўчая ў сваіх высновах. Напрыклад, сцвярджэнне, быццам бы "сучасныя цывілізаваныя народы (усе? - Ул.К.) - гэта мешаніна розных расаў". Пад "рознымі расамі" аўтар часам разумее нешта зусім неадэкватнае расе, напрыклад, плямёны адной і той жа расы (крывічы, літоўцы, іншыя балцкія плямёны, маскоўцы, украінцы, палякі). Яшчэ больш недакладным, калі не зусім памылковым было сцверджанне, быццам бы "бывае так, што язык мова гіне, а нацыя астаецца", як гэта быццам бы сталася з яўрэямі. Аднак "бывае" азначае не правіла, не закон, а толькі эмпірычны факт, найчасцей выпадковы. Да таго ж і яўрэйская мова не поўнасцю загінула, яе захавала Юдаісцкая царква; "загубленая" мова, ўрэшце іўрыт стала дзяржаўнай у адроджанай Ізраільскай дзяржаве аж у другой палове XX ст. Гіпотэза А.Станкевіча, паводле якой нацыянальныя прыкметы творацца "нацыянальна-духоўным інстынктам, унутраным не прыведзены доказы.

Што датычыцца ролі хрысціянскай рэлігіі ў этнагенезе народаў і аб'яднанні іх у нацыю, то тут даследчык меў рацыю, прыдаючы рэлігійнай свядомасці значэнне духоўнай асновы гэтых наказам сваёй душы", таксама лёгка абвяргаецца, бо для яе абгрунтавання працэсаў. На яго думку, Праваслаўе, Уніяцтва і Каталіцтва на розных этапах драматычнай гісторыі нашай Бацькаўшчыны, кожнае па-свойму і, ў свой час зберагалі "да лепшых часоў беларускую нацыянальную ідэю"[120]. Праваслаўе бы-

Асноўная частка манаграфіі "Хрысціянства і беларускі народ" (раздзелы II-XII) прысвечана аналізу трох хрысціянскіх канфесіяў - праваслаўя, каталіцтва і ўніяцтва - у кантэксце гістарычнага лёсу беларусаў (сваё гістарычнае жыццё беларусы, паводле Станкевіча, пачалі з УІІІ-ІХ стст.) і беларускай культуры. Наяўнасць глыбока прадуманага гісторыка-культурнага матэрыялу, папулярнае, вобразна-публіцыстычнае, нярэдка філасофскі паглыбленае яго выкладанне набліжае кнігу А.Станкевіча да ўніверсітэцкага падручніка. Гісторыя Хрысціянскай царквы ў Беларусі, яе роля ў развіцці нацыянальнай культуры выкладаецца на фоне сусветнага хрысціянства. У экскурсе пра паходжанне беларусаў даследчык кажа пра выпадковасць, неаўтэнтычнасць варажскай назвы "русь", "рускі" і верагоднасць такой сітуацыі, пры якой "некалі і нам беларусам прыдзецца гэты чужы назоў пакінуць і назвацца крывічамі, як гэта ўжо некаторыя беларускія вучоныя робяць"[118].

У раздзеле пра хрышчэнне Русі, падрыхтаванае асветніцкай місіяй роўнаапостальных Кірылы і Мяфода, А.Станкевіч распавядае, як стараславянская мова набыла значэнне мовы царкоўнай, літаратурнай, стала называцца царкоўна-славянскай. Праз яе да Хрысціянства далучыліся ўсе паўднёваславянскія, усходнеславянскія і заходнеславянскія народы. Прыняўшы ад Корсуні (Крым) і Візантыі Хрысціянства грэчаскага абраду, Уладзімір Хрысціцель, на думку даследчыка, "быў у еднасці з Апостальскай Сталіцай", з яе згоды прыняў з Балгарыі епіскапаў і першага мітрапаліта Міхаіла. Полацкае княства і ўся старадаўняя Беларусь прынялі Хрысціянства пры сыне Рагнеды, князю Ізяславу і яго спадчыннікаў. Асобныя нарысы А.Станкевіч прысвяціў асветніцкай дзейнасці Еўфрасінні Полацкай, якая "аднолькава ўважаная святой як у праваслаўнай, так і ў каталіцкай царкве".

Шмат месца ў сваёй манаграфіі А.Станкевіч адвёў доказу дагматычнага адзінства Хрысціянства ў старадаўняй Русі: усходнія славяне далучыліся да ўсходняга грэка-візантыйскага абраду, але тады ніхто не падзяляў веру на рымскую і грэчаскую, усе "былі пад уладай наступнікаў св.Пятра - рымскіх епіскапаў, пад уладай Апостальскай сталіцы". Сусветныя царкоўныя саборы "заўсёды адбываліся з багаславенства Рымскага Папы, а пастановы гэтых сабораў заўсёды патрабавалі зацьверджаньня". Фармальны раскол адбыўся 16 ліпеня 1054 г.; але, на думку гісторыкаў, "беларуская Царква яшчэ была ў еднасці з Рымам аж да пач. XII ст."[119] . Толькі паступова, у УІІ-ХІУ стст., нават у першай палове ХУ ст. яна раз'-



казаў ён, - жыў "самастойным дзяржаўным жыццём і з аружжам у руках бараніў сваю гэтую самастойнасць" ужо ў IX-XII-Істст., сфармаваўшыся з трох сваяцкіх плямёнаў - крывічоў, радзімічаў і дрыгвічоў. Праўда, -зазначае даследчык, - яшчэ ў гэтым перыядзе беларускай гісторыі народ наш і наш край не завецца беларускім, а пераважна крывіц кім, але назва не змяняе справы". Бо ўжо тады было адзінства этнічнай тэрыторыі, вечавая дэмакратыя, высокая культура.

Ад.Станкевічу ў 20 - пачатку 30-х гадоў яшчэ не была вядома гісторыя летапіснай Літвы ў рэгіёне цяперашняй цэнтральна-заходняй Беларусі. Этнонім "літвіны" і палітонім Літва ён ідэнтыфікаваў з этна-літоўскім паходжаннем. Толькі пазней ягоны зямляк Ян Станкевіч, а сення гісторык Мікола Ермаловіч даказалі, што летапісная Літва, каланізаваная беларускімі продкамі крывічамі і дрыгвічамі ў УІ-Хст., знаходзілася ў верхнім Панямонні на захад ад Мінска. Асіміляванае беларусамі насельніцтва балцкага паходжання называла сябе літвінамі да канца XIX ст. У той час этнонім Беларусь датычыўся Магілёўшчыны і часткі Віцебшчыны. "Толькі на пачатку XX ст., - справядліва зазначае М.Ермаловіч,- калі завяршыўся працэс утварэння беларускай нацыі, назва "Беларусь" замацавалася і за Беларускім Панямоннем, выцесніўшы адтуль назву "Літва", якая з таго часу стала адносіцца толькі да сучаснай Літвы"[59].

А.Станкевіч прытрымліваўся кампраміснага погляду, мабыць, па тактычных меркаваннях, каб захаваць сяброўства з лідэрамі Літвы, натуральнымі саюзнікамі Беларусі. "Вышла так,- пісаў ён, - што палітыку тварылі перад усім літоўцы, а культуру - беларусы. З гэтага даволі рэдкага ў гісторыі супрацоўніцтва двух народаў паўстала слаўная ў гісторыі літоўска-беларуская дзяржава, у якой, калі не лічыць меншых уплываў украінскіх, сапраўды панавала беларуская мова і беларуская культура"[60].

Беларусы ж, канечне ж, тварылі тады не толькі культуру, але і палітыку. Разам з літоўцамі як рэлігійны дзеяч, які ўпершыню ў нашай навуцы акцэнтаваў увагу на каштоўнасцях царкоўнай традыцыі, А.Станкевіч крыху перабольшаў яе, недаацаніўшы беларускую свецкую культуру ў эпоху Рэчы Паспалітай. "І сапраўды, - сцвярджаў ён, -у ХУІІ і ХУІІІ ст. толькі рэлігія была той грамадскай вартасцю, якая зберагла беларускую нацыю і тварыла беларускую культуру як адзнаку жыцця народа. Вось чаму беларусы часта так сапраўды гераічна змагаліся з рэлігійнай уніяй, слушна бачачы ў ей наступ пальшчызны, а пасля, ка-

лі з уніяй зжыліся і ў значнай меры не дапусцілі да яе поўнага злацiншчвання, калі ўнія была ужо знакам, як розніў беларуса ад польскага каталіцтва, так і ад маскоўскага праваслаўя, калі ўнія сталася адзінай апорай беларускай культурнай асобнасці, беларусы яе так жа гераічна баранілі проціў наступу маскоўскіх цароў, што сягалі на душу яго пры помачы верных слуг сваіх, здзіўшых уніі епіскапаў Сямашкі, Лужынскага і Зубкі"[61].

У гэтым і далейшых асобных фрагментах гістарычнай думкі А.Стан- кевіча ёсць пэўная аднабокасць, характэрная бадай што для кожнай занадта абагуленай канцэпцыі, якая часам не ўлітвае шматфарбнасці і супярэчлівасці рэальнага жыцця. Памыляўся ён і ў ацэнцы Люблінскай уніі 1589 года як пачатку поўнага заняпаду беларускага народа" у ХУІІ-ХУІІІ стст. і "поўнага пераходу асвечаных шляхецкіх класаў у польскасць". Памыляўся, калі яму здавалася, быццам бы пасля смерці Льва Сапегі (1633) палітычная справа нашага краю часова замерла аж да Кастуся Каліноўскага. Бо поўны заняпад, а тым больш паміранне не спарадзілі б таго магутнага адраджэнцкага руху, якому прысвяціў беларускі святар усё сваё жыццё. Па сутнасці, Ад.Станкевіч папраўляе самаго сябе, калі крыху ніжэй сцвярджае, што нашае адраджэнне "прыйшло з паваротам да народу ад людзей з тых жа шляхецкіх класаў, праўда, ужо абяднеўшых і зблiжаных да народу"[62] .

Асноўная частка кнігі "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення" прысвечана гісторыі беларускага адраджэнцкага руху XIX - пачатку XX ст. Тут Ад.Станкевіч упершыню вызначыў агульна-еўрапейскія і рэгіянальныя, беларуска-літоўскія вытокі гэтага руху, яго сацыяльныя і духоўна-культурныя карані. Першыя пачыналіся ў сацыяльна-палітычнай еўрапейскай рэвалюцыі канца ХУІІІ - першай паловы XIX ст.; другія вядуць свой радавод ад еўрапескага рамантызму гэтай жа эпохі, які "абыймаў усе галіны духоўнага творства чалавека, а знача і навуку, асабліва гісторыю, філасофію і мастацтва". Праваднікам рамантычнай плыні, што моцна зацікавілася нацыянальнай самабытнасцю адціснутых з гістарычнай арэны народаў, быў у нашым рэгіёне Віленскі ўніверсітэт. Дзякуючы рамантычнаму абнаўленню культуры беларуская каталіцкая шляхта выдзеліла з сябе пачынальнікаў новай беларускай літаратуры (Ян Баршчэўскі, А.Рыпінскі, Ян Чачот, пазней В.Дунін-Марцінкевіч) даследчыкаў Міхала Бароўскага, Ігната Даніловіча і інш.



супярэчлівых суадносін паміж Нябеснай Царквою Хрыста і Царквою зямною па неабходнасці ангажыраваную ў кантэксце пэўных сацыякультурных і палітычных сістэм; абгрунтаванне неабходнасці ўніверсальнай і рэлігіянальнай (беларускай, украінскай і іншай) царкоўнай уніі. Не выпадкова кніга мае падзагаловак: "Спроба сінтэзы". Ёсць тут таксама падагульненне і сінтэз ідэй і канцэпцый, запачаткаваных раней, раскіданых па шматлікіх публікацыях і вусных выступленнях А.Станкевіча.

Пачынае аўтар сваю манаграфію апалогіяй хрысціянства, параўноўваючы яго з усёпранікальным сонечным святлом: "Тое, што наглядаем у адносінах сонца да прыроды, мае дзіўнае падабенства, аналогію ў адносінах Хрысціянства да душы чалавека, у адносінах да яго духоўнага жыцця. Нікога яно не вылучае, ад нікога не крыецца, прад нікім не зачыняе сваіх дароў, усім свеціць, усіх і ўсё грэе. Не было і няма на свеце такой тэорыі, такой навукі, такой універсальнай і так разам індывідуальнай, так простай і так складанай, так звычайнай і так бяздонна глыбокай, так блізкай і так далёкай, так чалавечай і так разам надчалавечай, так штодзённай і так вечнай, як навука ўбогага Назарэйчыка Ісуса Хрыста. Хрыясціянства толькі да таго не дастаецца і не пранікае, хто свядома яго не хоча і свядома ад яго стараніцца. Але і гэткія несвядома для сябе, як жа многа карыстаюцца дарамі Хрысціянства, аддыхаюць ім, яго вечна жывымі сокамі кормяцца!"[117].

Пра жыватворны ўплыў хрысціянскай рэлігіі на станаўленне і развіццё сучаснай цывілізацыі сведчыць, на думку А.Станкевіча, уся гісторыя людской культуры, філасофія ад Тамаша Аквінскага да "вялікага расійскага хрысціянскага мысліцеля Ўладзіміра Салаўёва". Пра гэта ж гаворыць нам і беларуская культура ды яе дакладнае люстэрка - Беларускі музей імя Івана Луцкевіча. Пад подыхам хрысціянства склалася і ўзбагачалася беларуская народная душа, яно прынесла народу асвету, культуру, высокую мараль, аб'яднала плямёны ў нацыянальную супольнасць, сталася крыніцай заканадаўства і дзяржаўнага будаўніцтва. "Словам, Хрысціянства - гэта вялікі наш скарб які мы павінны берагчы як найбольш старанна і верна. Праўда, нам часта розныя варожыя сілы гэтае Хрысціянства ад нас засланяюць, робяць з яго аружжа варожай нам палітыкі і паказваюць нам часта карыкатуру на Хрысціянства. Але гэта ўсё нас не павінна збіваць з дарогі і адбіваць ад праўдзівага Хрысціянства, вольнага ад палітычных дамешкаў".

таў бескампрамісна выкрываў антыбеларускую палітыку польскай "санацыі" і бальшавіцкі тэрор і генацыд у БССР[114].

У заключэнні сваёй манаграфіі "Беларускі хрысціянскі рух" Адам Станкевіч сфармуляваў "права кантрасту", альбо, кажучы сучасным тэрмінам, эфект кантрасту. Сутнасць яго ў тым, каб выбіраць і сцвярджаць каштоўнасці, якія не супадаюць з выбарам магчымых канкурэнтаў альбо праціўнікаў "злева" і "справа", з Усходу і з Захаду. Адсюль стратэгія БХД: дасягнуць максімальна магчымага развіцця беларускай нацыянальнай свядомасці "і праз гэта адпорнасці на чужыя ўплывы, шукаючы пры гэтым дружбы прадусім у літоўцаў і ўкраінцаў як сваіх натуральных саюзнікаў, якія таксама больш ці менш знаходзяцца на лініі таго ж кантрасту між Усходам і Захадам"[115] .

Тэалагічныя і гісторыка-культурныя погляды Адама Станкевіча падсумаваныя ў манаграфіі "Хрысціянства і Беларускі Народ" (Вільня 1940). Гэтая кніжка - вяршыня нашай філасофіі, гісторыі і рэлігійнай думкі. За выключэннем апошніх раздзелаў, яна ўпершыню надрукавана ў часопісе "Хрысціянская Думка" за 1939 год"[116]. У прадмове да яе выдання асобнай кніжкай аўтар, просячы прабачэння за магчымыя тэхнічныя недакладнасці, звяртаўся да сваіх чытачоў: "Калі праца гэтая збольшага была скончана, I5.XII./1938 г. польская паліцыя ўручыла мне загад Віленскага Ваяводы Бацянскага аб высяленні мяне на пяць гадоў з граніц Віленскага Ваяводства". Да верасьнёўскага 1939 года разгрому Польшчы ён жыў у Слоніме, не меў літаратуры і архіваў для карэктыроўкі тэкста.

Кніга выйшла ўжо ў літоўскай Вільні, калі там на кароткі час, да чарговага бальшавіцкага пагрому беларускай культуры, аднавілі працу Беларускае каталіцкае выдавецтва і Беларуская друкарня імя Фр.Скарыны. У адрозненне ад папярэдніх кніг і брашур А.Станкевіча, адрасаваных найперш беларусам-католікам і надрукаваных лацінікай, манаграфія "Хрысціянства і Беларускі народ" прысвечана паводле прызнання аўтара, "для шырокіх беларускіх кругоў", апублікавана кірыліцай. Навукова-папулярны жанр кнігі пазначаны анатацыямі да кожнага яе раздзелу.

Тры фундаментальныя думкі-ідэі, недастаткова акцэнтаваныя альбо забытыя ў сучаснай хрысціянскай тэалогіі і культуралогіі, умела даказвае аўтар у гэтай унікальнай манаграфіі: погляд на Хрысціянства як духоўную аснову агульнаеўрапейскай цывілізацыі і рэгіянальна-беларускай культуры; выяўленне



Ад.Станкевічу ўпершыню ўдалося "упісаць" беларускі вызваленчы рух у агульнаеўрапейскі прававы і палітычны кантэкст. Ён паказаў, што ў канцы ХУІІІ ст. еўрапейская прававая навука абгрунтавала прынцып дзяржаўнай суверэннасці народаў, а пазней, у пачатку XIX ст. - ідэю федэралізму, паводле якой вольныя народы твораць адну дзяржаву на аснове дагавару. Кансерватыўную мадэль славянскай федэрацыі прапанавалі расійскія славянафілы, а мадэль народна-дэмакратычную - Аляксандр Герцэн, Міхаіл Бакунін, украінскі гісторык Мікалай Кастамараў - заснавальнік Кірыла-Мяфодаўскага брацтва, да якога належаў Тарас Шаўчэнка.

Усе гэтыя плыні і гістарычныя асобы паўплывалі на пачынальніка беларускага вызваленчага руху Кастуся Каліноўскага. Яму прысвяціў Ад.Станкевіч асобны раздзел сваёй кнігі, а за год да яе выдання - брашуру "К.Каліноўскі, "Мужыцкая праўда" і ідэя незалежнасці Беларусі" (Вільня, 1933), дакладна прадумаў цэнтральную ідэю беларускага паўстанца - адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага як федэрацыі двух народаў. На думку даследчыка, К.Каліноўскі першым звярнуў увагу на гістарычны лёс беларускага народа, яго культуры і такім чынам, мабыць, нават падсвядома, пачаў новы этап палітычнай думкі ў Беларусі, эру змагання за яе дзяржаўную незалежнасць.

Біяграфічны нарыс пра Каліноўскага, напісаны Ад.Станкевічам, аналіз яго светапогляду і яго падпольнай газеты і сёння застаюцца ўзорньм даследаваннем гэтае тэмы. Ад.Станкевіч - бадай што першы даследчык, які паспрабаваў раскрыць сацыяльна-псіхалагічныя вытокі шляхецка-каталіцкага этапу беларускага культурнага адраджэнцкага і нацыянальна-вызваленчага руху ў XIX - пачатку XX ст. які парадзіў лідэраў паўстанняў 1793-1795, 1831, 1863 гадоў, а следам за паўстаннямі - новую беларускую літаратуру. Гэта ў першую чаргу збядненне фальваркавай шляхты аж да поўнага яе беззямелля, набліжэнне яе паводле сацыяльнага становішча да беларускага сялянства, што цярпела падвойную эксплуатацыю - царскабюракратычную і панскую, урэшце, традыцыі апазіцыйнага да царызму уніяцтва і рыма-каталіцтва, да якіх належала гэтая шляхта, у тым ліку продкі К.Каліноўскага. У Каліноўскага, адзначыў даследчык, не магло быць нацыянальнай свядомасці ў сучасным сэнсе гэтага паняцця, бо ў тагачаснай беларускай шляхты, да якой ён належаў, былі яшчэ жывыя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. Як народнік-федэраліст, дакладней, канфедэраліст,

К.Каліноускі быў спачатку супраць ініцыіраванага польскімі шляхецкімі патрыётамі паўстання, спадзяваўся на дэмакратычную рэвалюцыю ў Расіі. Але рэвалюцыйная сітуацыя ў пачатку 1860-х гадоў пайшла на спад, расійская апазіцыя падаўлена. І калі польскія нацыяналісты паднялі паўстанне, К.Каліноўскі ўзначаліў яго ў Беларусі і Літве, каб вызваліць народ адразу ад царызма і польскіх паноў.

Раздзел кнігі А.Станкевіча "Ігнат Грынявіцкі і яго беларускае народніцтва" да публікацыі брашуры Ул.Арлова (Прысуд выканаў невядомы: Ігнат Грынявіцкі. Мн., 1992) быў адзіным біяграфічным нарысам пра гэтага рэвалюцыянера, на думку даследчыка, паслядоўніка беларускай вызваленчай ідэі К.Каліноўскага. Але ў новых умовах, калі на рэвалюцыйнасць Польшчы і яе дапамогу ў барацьбе за Беларусь, не было рэальнай надзеі, І.Грынявіцкі далучыўся да расійскай "Народнай волі" і стаў адным з яе лідэраў, імкнуўся да пераўтварэння Расійскай імперыі ў вольную федэрацыю народаў. Спасылаючыся на звесткі Тамаша Грыба, даследчык лаканічна апісаў псіхалагічны партрэт беларуса-рэвалюцыянера: "Ігнат Грынявіцкі быў ціхага і спакойнага характару, скромны, дабрадушны, працавіты, вытрывалы, чулы на чужое гора; адначасова маўклівы, і замкнёны ў сябе. Быў ён чалавек чыну; ідэалам яго было служэнне народу, служэнне не словам, а дзелам. Называў сябе Ігнат літвінам"[63].

А.Станкевіч быў таксама першым кампетэнтным даследчыкам падпольнага часопіса "Гоман", выдадзенага на рускай мове шапіраграфскім спосабам беларускімі народнікамі ў 1884 г. (№1-2). У яго кніжцы ўпершыню перадрукаваны з адзінага экземпляра 2-га нумару гэтага часопіса праграмныя матэрыялы беларускіх сяброў "Народнай волі", якія развівалі ідэю К.Каліноўскага і І.Грынявіцкага пра федэратыўную самастойнасць Беларусі ў будучай дэмакратычнай Расіі. Ім належыць таксама прыярытэт абгрунтавання права беларускага народа на нацыянальнае самавызначэнне, ідэя гармоніі нацыянальных і агульналюдскіх каштоўнасцяў. "Усякая нацыя,- гаварылася ў "Гомане",- як і ўсякая асоба, не толькі мае права, але і абавязана абараняць сваю самастойнасць ва ўсім, што не пярэчыць развіццю чалавецтва наогул і кожнай чужой нацыі ў прыватнасці. Пагэтаму ўсякая нацыя, якой бы слабой яна ні была, заслугоўвае поўнага прызнання яе самастойнасці"[64] .

Следам за гэтым Ад.Станкевіч зрабіў параўнальны аналіз грамадска-палітычных ідэалаў "Мужыцкай праўды" і "Гомона",



Першая Ўстаўная праграма БХД прынята і выдадзена брашурай у Мінску пад назвай "Устава і праграма хрысціянскай Дэмакратычнай Злучнасці Беларусаў" (1920г.). Праграма ўключала элементы дэмакратычнага сацыялізму арыентацыя на "змаганне з капіталізмам" і роўныя магчымасці для рэалізацыі творчых сіл усяго народу), абвяшчала сваю арганізацыю "эвалюцыйнай, надпалітычнай, міжнароднай, надстанавай" (надкласавай і надсаслоўнай), ставіла задачу "зблізіць усіх каталікоў і праваслаўных і аб'яднаць у адной веры з рознымі абрадамі", змагацца за вяршынства маралі і права.

Прызнаваліся розныя формы ўласнасці, у тым ліку ўласнасць прыватная як "падстава цывілізованага поступу грамадства". Але для сацыяльнай справядлівасці прапаноўвалася абмежаваць празмерную ўласнасць прагрэсіўным падаходным падаткам. У палітычным аспекце ставілася задача мірнай барацьбы за непадзельнасць вольнай Беларусі. Мова і культура кожнай нацыі абвяшчалася ад Бога дадзенымі скарбамі. Патрабавалася, каб выкладанне ў беларускіх школах усіх ступеняў вялося на роднай мове, у тым ліку абавязковае Вывучэнне хрысціянскай рэлігіі"[112].

У манаграфіі "Беларускі хрысціянскі рух" друкуюцца поўнасцю альбо фрагментамі, каментуюцца ўсе наступныя дакументы БХД (так называлася партыя з І926 да пачатку 1936 г.) праграмныя артыкулы яе газеты "Крыніца" адлюстравана барацьба беларускіх адраджэнцаў са шматлікімі недабразычліўцамі нашага нацыянальнага самавызначэння. Ёсць у ёй таксама гісторыка-тэарэтычныя экскурсы, як, напрыклад, аналіз вытокаў агульнаеўрапейскага хрысціянска - дэмакратычнага руху і прычыны разладу ў асяроддзі розных плыняў беларускага нацыянальнага Адраджэння[113]. Падрабязна аналізуюцца матэрыялы ўсіх з'ездаў БХД, яе палітычныя і касцёльныя акцыі, міжнародная дзейнасць, апеляцыі да вышэйшай касцёльнай улады.

Пад духоўным кіраўніцтвам Адама Станкевіча БХД па хрысціянску добра адносілася да ўсіх дэмакратычных (беларускіх, польскіх і іншых) партый, рухаў і арганізацый, яна была апорай Беларускага Нацыянальнага Камітэта ў Вільні (1919-1938 гг.), мэта якога - садзейнічаць палітычнаму і маральнаму адзінству беларусаў. З 1926 года (прыняцце другой праграмы партыі на чарговым з'ездзе) БХД узяла курс на адзінства з праваслаўнымі вернікамі. Але гэты духоўна-палітычны рух беларусаў-патрыё-

ахвярную працу ў дзіцячым прытулку "Золак" (Вільня, у інтэрнаце на Бернардынскім завулку), правядзенне Беларускай канферэнцыі ў Вільні пры падтрымцы біскупа Я.Матулевіча, арганізацыю Беларускага навуковага таварыства.

Спецыяльны раздзел прысвяціў даследчык "народнай працы беларусаў-каталікоў пры канцы расійскага царызму і на пачатку рэвалюцыі (1915-1919)". Гутарка ідзе пра апошні этап беларускіх арганізацый у Пецярбургу, выданне газет "Светач" і "Дзянніца", з'езд беларускіх ксяндзоў у Мінску 24-25 траўня 1917 года. Аб іх ужо гаварылася ў біяграфічным нарысе, прысвечаным першаму этапу грамадскай і рэлігійнай дзейнасці А.Станкевіча. Ёсць у гэтым раздзеле старонка пра сёння забытага каталіцкага паэта, арганіста Станіслава Шыманоўскага (1893-1920), рана памёршага ад сухотаў у сваім родным Свянцянскім павеце.

Асноўная частка кнігі А.Станкевіча (раздзелы УІ-ХІ) прысвечана гісторыі Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД). Як ужо адзначалася, яна ўтворана ў Пецярбургу (травень 1917 г.) на базе Беларускага гуртка Каталіцкай акадэміі па ініцыятыве Ф.Абрантовіча, Эпімах-Шыпілы, А.Станкевіча, іншых беларускіх каталіцкіх дзеячаў і спачатку называлася Беларуская Хрысціянская Дэмакратычная Злучнасць, афіцыйна ж, паводле Статуту, Хрысціянская Дэмакратычная Злучнасць беларусаў , мела свой бела-васільковы сцяг з васільковай Пагоняй, з вобразам Маці Боскай Вострабрамскай. З 8 кастрычніка пачала выдаваць сваю газету "Крыніца". Выселеная з бальшавіцкага Пецярбургу, яна на кароткі час мела сваім прыстанішчам Мінск (з 25 лютага 1918 года да 1919 года), удзельнічала ў правядзенні Ўсебеларускага з'езду (18-30 снежня 1918 г.) і ў наступных актах будавання незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі, займаючы цэнтрысцкую пазіцыю і супрацоўнічаючы з усімі беларускімі партыямі і рухамі, якія прымалі ідэю беларускага нацыянальнага адраджэння.

Гісторыя БХД - асобная тэма гісторыка-палітычных, рэлігійных і культуралагічных даследаванняў. А.Станкевіч быў першым, і, на жаль, пакуль што апошнім даследчыкам, а скарэй летапісцам сваёй вялікай Духоўнай Сям'і - БХД. Зафіксіраваў ён усе яе вялікія і малыя акцыі - сталічныя (Пецярбург, Мінск, а з 1920 г. - у Вільні) і павятовыя, выкарыстаўшы не толькі асабістыя запісы і архівы, але шматлікія дакументы, іншыя першакрыніцы.



дарэчы, таксама ўпершыню. "Мужыцкая праўда", справядліва адзначыў даследчык, - гэта беларускі народніцкі часопіс, у якім яшчэ пануюць традыцыі Вялікага Княства Літоўскага, у ім яшчэ няма паняцця Беларусі. "Гомон" жа вядзе гутарку пра этнакультурную і магчымую палітычную самастойнасць Беларусі. "Мужыцкая праўда" развівала традыцыі каталіцкага грамадска-вызваленчага руху, а "Гомон" - гэта першае палітычнае выступленне праваслаўных беларусаў за эканачную і дзяржаўную аўтаномію свайго краю ў агульнарасійскай федэрацыі[65].

Важнае месца ў беларускай палітычна-вызваленчай думцы займала мастацкая літаратура. Ад.Станкевіч аддае належнае Ф.Багушэвічу, пачынальніку беларускага народніцтва. Да Ф.Багушэвіча нашая палітычная думка развівалася ў кантэксце дэмакратычнай традыцыі, якая не сфармавала яшчэ "прынцыпу беларускай нацыянальнасці". Тут даследчык салідарызаваўся з высновай Аляксандра Цвікевіча, паводле якога "першае сапраўднае выяўленне беларускае ідэі і свядомае зацвярджэнне яе як ідэі не правінцыяльна польскай і не правінцыяльна расейскай, а самастойнай, незалежнай ад таго ці другога боку, адносіцца да дзейнасці Фр.Багушэвіча"[66].

Паслядоўнікам беларускіх народнікаў (К.Каліноўскі, І.Грынявіцкі, "Гомон") быў, на думку А.Станкевіча, Адам Гурыновіч. Прынцыпаў беларускага народніцкага сацыялізму і федэралізму (краёвая аўтаномія Беларусі са сваім Соймам у Вільні) прытрымлівалася Беларуская Сацыялістычная Грамада (БСГ), аднак у 1916-1917 гг. у ёй выспявае ідэя канфедэрацыі Беларусі, Украіны, Літвы, Латвіі, паводле другога варыянту - і Польшчы. Ідэі БСГ праводзіліся ў яе неафіцыйных выданнях (газеты "Наша доля", "Наша ніва" і інш.).

Стварэнню БСГ папярэднічаў падпольны часопіс "Свабода", выдадзены братамі Вацлавам і Тадэўшам Іваноўскімі, Іванам Луцкевічам, сябрамі Польскай Партыі Сацыялістычнай (ППС), Лявонам Малецкім, Рамуальдам Мілерам на цыклографе ў двары Іваноўскіх (Лябёдка, Лідскага павета). Усе 200 экз. канфіскаваны паліцыяй.

Заключны раздзел сваёй кнігі па гісторыі беларускага палітычнага руху Ад.Станкевіч прысвяціў барацьбе за рэалізацыю нацыянальнай ідэі ў гады Сусветнай вайны і распаду еўрапейскіх каланіяльных імперыяў (1914-1920). Два міжнародныя акты папярэднічалі гэтаму працэсу: Парыжская канферэнцыя паднявольных народаў (26-27 чэрвеня 1914 г.), якая абвясціла права

народаў на дзяржаўную незалежнасць, і мемарандум прэзідэнта ЗША В.Вільсана (21 снежня 1916 г.), які прапанаваў узяць за аснову мірных перагавораў прынцып нацыянальнага самавызначэння "малых" і паднявольных народаў. Найбольшым праціўнікам гэтых прынцыпаў была Расія. Аднак пасля лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 года Расія фармальна іх прызнала, што дало падставу абвяшчэння на яе тэрыторыі незалежных нацыянальных дзяржаў.

Версальскі мірны трактат (28 чэрвеня 1919 г.), паводле дакладнай ацэнкі Ад.Станкевіча, тэарэтычна грунтаваўся на праве нацыянальнага самавызначэння ўсіх народаў, але на практыцы "шмат у чым аказаўся з гэтым прынцыпам нязгодным": не былі распрацаваны прававыя механізмы яго рэалізацыі, а замест прапанаванай В.Вільсанам Лігі Нацый фактычна была створана Ліга дзяржаў. Аднак жа сам прынцып нацыянальнага самавызначэння заставаўся галоўнай палітычнай ідэяй стагоддзя і паступова набываў статус міжнароднага права. У I9I7-I9I8 гг. ен стаў фактам палітычнай свядомасці беларускай нацыянальнай эліты. Да 1917 года ўсе беларускія нацыянальныя арганізацыі сваім ідэалам лічылі федэрацыю альбо канфедэрацыю - адны літоўска-беларускую (як варыянт - яшчэ ўкраінскую альбо польскую), другія - расійска-беларускую. У кнізе Ад.Станкевіча аналізуюцца і перадрукоўваюцца тагачасныя федэратыўныя праекты ў Беларусі, Літве і Польшчы"[67].

Толькі пасля бальшавісцкага перавароту ў Расіі беларускія партыі і арганізацыі ў Вільні прынялі дэкларацыю аб самавызначэнні Беларусі (снежань 1917 г.). Нават на Ўсебеларускім з'ездзе (5-17 снежня па ст.ст., 18-30 па н.ст.) фармальна не абвяшчалася аддзяленне Беларусі ад Расіі. Перад самым разгонам З'езда, альбо (як ён называецца ў іншых крыніцах) Кангрэса ў ноч з 30 на 31 снежня там была прынята вось такая рэзалюцыя: "Замацоўваючы свае правы на самавызначэнне, абвешчанае расейскай рэвалюцыяй, і прымаючы рэспубліканскі дэмакратычны строй на абшары Беларускай зямлі, для паратунку роднага краю і для забеспячэння яго ад раздзелу і адлучэння Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі (падкрэслена мною - Ул.К.) першы Ўсебеларускі з'езд ухваляе: безадкладна ўтварыць са свайго складу орган краёвай улады (падкрэслена мною.- Ул.К.) у асобе Ўсебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем, уступаючы ў дзелавыя зносіны з цэнтральнай уладаю[68] .



дзеячаў БХД. Адразу ж увайшоў у Беларускі гурток семінарыстаў і з гэтага часу не спыніў грамадскай дзейнасці. У сваёй манаграфіі ен расказвае пра яе пачатак-кіраўніцтва Беларускім гуртком у Каталіцкай духоўнай акадэміі, адкуль бяруць вытокі БСХ з яе выданнямі, рэлігійнымі і грамадска-палітычнымі акцыямі на карысць Беларусі.

Шмат новага, малавядомага сучасным даследчыкам паведамляе А.Стан кевіч пры выданні ў Вільні першага каталіцкага штотыднёвіка "Беларус" (1913 -1915). Напрыклад, пра тое, што яшчэ ў 1905 годзе віленскі біскуп Адварды Роп "насіўся з думкай выдаваць у Вільні народную каталіцкую газету па-беларуску, але, як чутна было, дарадцы ягоныя былі гэтаму вельмі праціўныя, дык так і засталося"[111].

"Наша ніва" не толькі не была супраць выдання "Беларуса" лацінікай, але пэўным чынам ініцыіравала яго: Іван Луцкевіч угаварыў будучых рэдактараў гэтага выдання Б.Пачопку, а праз яго А.Бычкоўскага ўзначаліць газету, паабяцаў сваю дапамогу. А.Станкевіч са слоў таго ж Б.Пачопкі піша, што першымі фактычнымі рэдактарамі газеты "Беларус" былі Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) і Ян Пазняк, пазней рэдактар газеты БХД "Крыніца". Даследчык называе ўсіх супрацоўнікаў "Беларуса": сярод вядомых (Фр.Будзька, Ул.Талочка, Казімір Сваяк, Альфонс Петрашкевіч, Пістра Просты, Андрэй Зязюля, А.Паўловіч і інш.) былі сёння забытыя, напрыклад, карэспандэнт з-пад Ракава (хутар Дуброва, дзе ён і памёр) Янка Макоўскі, да канца жыцця верны беларуска-каталіцкім ідэалам. Даўгі па выданню "Беларуса" плаціла вядомая беларуская дзяячка Магдалена Радзівіл. Газета выдала шэраг рэлігійна-асветніцкіх кніг і брашур, у тым ліку: "Алкаголь" ксяндза К.Стаповіча (К.Сваяка) "Некалькі слоў аб пакуце" Ф.Будзькі, "З роднага загону" ксяндза Астрамовіча (А.Зязюлі) "Батлейка" ксяндза Г.Бетта, "Нашто беларусам газеты" ксяндза Я.Бобіча, шэраг брашур Б.Пачопкі (пад крыптонімам Б.-ка) і інш.

У раздзеле "Народная праца баларусаў-каталікоў пад нямецкай акупацыяй (I9I5-I9I9)" А.Станкевіч апавядае пра грамадскую дзейнасць і светапогляд ксяндзоў і пісьменнікаў Казіміра Сваяка (К.Стаповіча), Вінцука Адважнага (Я.Германовіча), ксяндзоў і публіцыстаў Ул.Талочку (друкаваўся пад псеўданімам Адам Саладух), Я.Семашкевіча, пра "свядомую беларуску, гарачую каталічку і патрыётку " настаўніцу Тэклю Станішэўчынку, якая літаральна згасла на працы на 23-ім годзе жыцця і пра шмат іншых, сёння забытых нашай напісанай гісторыяй. Урэшце, пра іх сама-

ліры "Загляне сонца і ў наша ваконца", або пары шыпілаўскай, якая апярэдзіла пару нашаніўскую"[109]. Другім настаўнікам заснавальнікаў БХД быу біскуп-суфраган Сцяпан Данісевіч (1836-1913) ,першы беларускі селянін, які закончыў Каталіцкую духоўную акадэмію ў Пецярбургу. З І9ОЗ года ўзначальваў Магілёўскую архідыяцэзію, першы карыстаўся ў касцёлах беларускаю мовай, выдаваў беларускамоўныя падручнікі па рэлігіі.

Сярод першых вучняў Б.Эпімах-Шыпілы і С.Данісевіча былі беларускія ксяндзы, выхадцы з сялянаў Францішак Будзька (памер у 1920 годзе), паэт Янка Мамыль (рана памёр у 1913 г.), які пісаў вершы пад псеўданімам Васіль Васілёк, рэлігійныя творы (захоўваліся ў прыватным архіве А.Станкевіча), Адам Лісоўскі (1882-1929), які паўплываў на духоўнае станаўленне А.Станкевіча. Сярод першых быў таксама ксёндз і паэт Аляксандр Астрамовіч (Андрэй Зязюля), пра якога ўжо гаварылася. Кожнаму з іх прысвечаны біяграфічныя нарысы. Пра Фр. Будзьку аўтар піша: "Беларускасць яго была настолькі яркай, што з гэтай прычыны каталіцкія польскія ўлады не хацелі яго сяцыць на ксяндза". Ён памагаў газеце "Беларус", выдаў кнігі "Катэхізм, "Сьвяты Андрэй Баболя", "Сьвятая гісторыя", "Касьцельныя абрады".

Каталіцкі рух у Горадні пачаўся па ініцыятыве выхаванца ўсё той жа Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу ксяндза Францішка Грынкевіча (1884-1933), з 1909 года законанавучыцеля ў гімназіях, пробашча пры кляштары Брыгітак у Горадні. Ён быў першым кіраўніком напоўлегальнага Гродзенскага гуртка беларускай моладзі "Хатка" (1909-1914)- літаратурна-асветніцкай і рэлігійна-этычнай арганізацыі. Яна садзейнічала развіццю нацыянальнай свядомасці, з яе выйшлі вядомыя беларускія пісьменнікі і грамадска-палітычныя дзеячы Зоська Верас, Ул.Чаржынскі, Я.Лявіцкі, Ад.Бычкоўскі, А.Зянюк, А.Аляксюк, К.Пушкарэвіч , брат заснавальніка гуртка, пазней адзін з кіраўнікоў БХД Станіслаў Грынкевіч, ксендз Уладзіслаў Талочка, Адам і Антон Бычкоўскія. "Прыхільніцай "Хаткі", - паведамляе Станкевіч,- была і вядомая польская пісьменніца з так званай беларускай школы Арэшчыха" (Эліза Ажэшка)[110].

Далейшае развіццё беларускага хрысціянска-дэмакратычнага нацыянальна-адраджэнцкага руху часткова ўжо вядомае з ранейшых раздзелаў майго нарысу. У 1910 годзе А.Станкевіч паступіў у Віленскую каталіцкую семінарыю, якая, паводле ягонай ацэнкі, была "цвярдыня польскасці", але з яе выйшла бальшыня



Ад.Станкевіч быў удзельнікам Усебеларускага з'езда, ён дакладна перадае атмасферу яго правядзення, супярэчнасці паміж самастойніцкай і масквафільскай фракцыямі, урэшце, гвалтоўны разгон гэтага дэмакратычнага форуму. У яго даследаванні апублікаваны цалкам альбо фрагментамі асноўныя дакументы, прынятыя створанымі дэлегатамі З'езда вышэйшых дзяржаўных органаў - Рады і Выканаўчага Камітэта,- Першую ўстаўную грамату "Да народаў Беларусі" і інш. Дарэчы, Ад.Станкевіч сведчыць, што немцы спачатку не прызнавалі створаную беларускую ўладу, арыентаваліся на Расію. Ён даказвае, што Рада З'езда, якая 9 сакавіка 1918 г. абвясціла Другую ўстаўную грамату - фактычна першую Беларускую Канстытуцыю (тэкст яе надрукаваны ў кнізе Ад.Станкевіча), была першым беларускім парламентам. Устауная грамата абвясціла Беларускую Народную Рэспубліку (БНР) , узяла на сябе да склікання Ўстаноўчага Сойму функцыі заканадаўчай улады, утварыла ўладу выканаўчую і адміністрацыйную ў асобе Беларускага Народнага Сакратарыяту, дэкляравала суверэнітэт БНР на этнаграфічнай тэрыторыі беларусаў, дэмакратычныя правы людзей і нацыянальных меншасцей, 8-гадзінны рабочы дзень, роўнасць усіх моваў у Беларусі, скасавала прыватную ўласнасць на зямлю і абяцала перадаць сялянам .

З аналізу гэтай Устаўной граматы Ад.Станкевіч зрабіў дакладную выснову: у ёй абвяшчаўся суверэнітэт БНР, але не было фармальнага непрызнання ўлады Расіі над Беларуссю. Абставіны напярэдадні Брэсцкіх мірных перамоваў з немцамі, на якія ўрад Расіі не дапусціў дэлегацыю БНР, прымусілі паспяшацца з апошнім актам легалізацыі беларускай дзяржавы. Бо можна было чакаць, што расійскія бальшавікі падзеляць Беларусь з немцамі, што хутка пацвердзілася: жывое цела Беларусі разарвалі на часткі Брэсцкім мірам 4 сакавіка 1918 года. Ініцыятыву ўзялі на сябе віленскія беларусы, якія ўтварылі сваю Раду і заявілі: "Віленская Беларуская Рада абвяшчае сувязь паміж Расіяй і Беларуссю парванаю".

Акт 25 сакавіка 1918 года абвяшчэння незалежнасці БНР Ад.Станкевіч называе новай эрай Беларусі (Тэксты Віленскай і Мінскай Радаў друкуюцца ў ягонай кніжцы "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення"). Асобны раздзел свае кнігі Ад.Станкевіч прысвяціў аналізу самаахвярнай працы дзеячаў БНР на шляху будавання незалежнай дзяржавы, дзейнасць яе дыпламатыі ў Еўропе і Расіі, стварэнне сістэмы беларускай

школьнай адукацыі. Даследчык не замоўчвае палітычных супярэчнасцей паміж featзнымі беларускімі партыямі і арганізацыямі, найперш паміж іх лідэрамі (А.Луцкевіч, В.Ластоўскі і інш.). Тыя сутыкненні, якія не даследаваліся ў савецкай гістарыяграфіі. Рэалізацыя беларускай ідэі аказалася толькі частковаю, незакончанаю: Беларусь падзялілі паміж РСФСР і Польшчай паводле Рыжскай мірнай дамовы (1921).

Пасля гэтай здрады нашых усходніх і заходніх суседзяў Еўропы, якая тады фактычна адмовілася ад прынцыпу нацыянальнага самавызначэння Беларусі, адбылася Ўсебеларуская палітычная нарада (Прага, 25 верасня 1921 г.), якая абвясціла Раду БНР адзінай законнай, дэмакратычна выбранай заканадаўчай уладай Беларусі, а яе ўрад - уладай выканаўчай. Ад.Станкевіч на падставе першакрыніц даследуе далейшы лёс Рады БНР. Пасля таго, як да БССР былі далучаны беларускія этнічныя рэгіёны (Віцебшчына, Гомельшчына, бела-рускія тэрыторыі Смаленшчыны і інш.), а палітыка беларусізацыі ў БССР дала свае станоўчыя вынікі, некаторыя сябры Ўрада БНР перадалі свае мандаты на карысць Савецкай Беларусі. Тым не менш Рада БНР засталася сімвалам пераемнасці аўтэнтычнай беларускай улады, хоць лёс яе быў трагічны, як і ўсёй Беларусі.

Заключныя старонкі сваёй кнігі Ад.Станкевіч прысвяціў лёсу беларускай нацыянальнай ідэі ў БССР. Там беларусізацыя моцна абнадзейвала народ і яго духоўных кіраўнікоў - інтэлігенцыю. Аднак ужо ў канцы 20-х гадоў пачаліся жорсткія рэпрэсіі супраць яе, русіфікацыя і фальсіфікацыя нацыянальнай мовы. "Словам,- заключае Ад.Станкевіч, ў разгар гэтага бальшавісцкага ж гвалту цяпер у Саветах быццам бы ў чэсць Маркса, а фактычна ў чэсць Расіі, камуністы дамагаюцца знішчыць розныя нацыянальнасці, а ў іх ліку і беларускую. Да гэтага прычыняецца тварэнне беларуска-расейскай мяшанкі замест беларускай мовы".

А усё ж лідэр беларускіх каталікоў верыў у будучыню Бацькаўшчыны. Для яго БССР - толькі нялёгкі этап "да поўнай незалежнасці беларускага народа і да яго агульнанароднай культуры[69] .

## 4. НА НІВЕ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Адам Станкевіч валодаў талентам публіцыста і літаратурнага крытыка, гісторыка літаратуры і культуролага. Свае даследаванні ён апублікаваў цалкам альбо фрагментамі ў перыядычным друку , больш за ўсё ў газеце "Крыніца", пазней у часопісе "Хрысціянская думка". Публікацыі ў газетах і часопісах толькі зрэдку падпісваў сваім імем, найбольш - крыптонімамі альбо



большую мае веру ў сілу вонкавую, у рэвалюцыю". Але, падкрэслівае ён, спачатку гэтае размежаванне было не арганізацыйнае, не вонкавае, "а чыста тэарэтычнае і пераважна тактычнае", хутчэй "падзел роляў, падзел працы". Абодва кірункі ў Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе (БСГ) - у асяроддзі беларускіх літаратараў "Нашай нівы", урэшце, сярод беларускіх студэнтаў Каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, "жылі дужа згодна. Бо заснавальнікі БСГ ніколі не былі "праўдзівымі сацыялістамі" марксістамі, якія б вызнавалі матэрыялізм", а тым больш атэізм. Беларускія сацыялісты, як правіла, былі народніцкія дэмакраты, праблему нацыянальнай роўнасці ставілі на першы план, у крайнім выпадку выступалі за радыкальна-рэвалюцыйны метад барацьбы [107].

Далей А.Станкевіч прасочвае, як з агульнай плыні адраджэнцаў, у тым ліку з асяроддзя БСГ, спакваля адгаліноўвалася беларуская хрысціянская дэмакратыя, схільная да эвалюцыйнага, творча-пераўтваральнага метаду нацыянальнага вызвалення. Сярод першых быў Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі, 1868-I9I8), паэт і беларускі патрыёт з католікаў, аўтар верша "0, Божа, Спасе наш!", які стаў малітвай у беларускіх набажэнствах. "Называў сябе ўніятам. Маліўся з беларускай рукапіснай кніжкі, якой малітвы сам напісаў /.../. Фактычна гэта быў хрысціянскі адраджэнец, блізкі да ідэалогіі пазнейшай БХД"[108]. Да хрысціянскіх сацыялістаў належалі заснавальнікі БСГ Іван Луцкевіч і Цётка (Алаіза Пашкевіч), таксама з беларускай каталіцкай шляхты, прыхільнікі адраджэння Уніі. І.Луцкевіч сябраваў з уніяцкім мітрапалітам А.Шэптыцкім, а Цётка, будучы студэнткай Львоўскага ўніверсітэта, склала там каталіцкі "Малітоўнік для беларускіх дзетак", які, паводле сведчання А.Станкевіча, яшчэ ў 1922 годзе захоўваўся ў Жоўкве, каля Львова, у базыліянскім кляштары.

Паводле даследаванняў А.Станкевіча, арганізацыйны беларускі каталіцкі рух пачаўся амаль адначасова (каля 1910 года) ў Пецярбургу і Горадні. Ідэолагам і настаўнікам будучых стваральнікаў БХД быў прафесар Каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбургу Браніслаў Эпімах-Шыпіла, пра якога ўжо пісалася ў нашым нарысе. Пра яго даследчык піша ўзнёсла і пафасна: "Вобак з Фр.Багушэвічам - гэта першы піянер беларускага адраджэння, апостал беларускага народу, апякун беларускай моладзі, ідэёвы працаўнік на беларускай нацыянальнай і рэлігійнай культуры, гарачы патрыёт, тварэц у беларускім адраджэнні

ліцкай шляхты. Толькі пасля паўстання 1863 года, зазначае аўтар кнігі "Беларускі хрысціянскі рух", Беларуссю зацікавіліся расійскія і зрусіфікаваныя беларускія вучоныя, пісьменнікі, але яны не ставілі праблему беларускага культурна-нацыянальнага самавызначэння. Ім прысвяціў А.Станкевіч аообны параграф свае кнігі, прызнаваў значэнне фальклорна-этнаграфічных даследаванняў П.Шэйна, П.Бяссонава, М.Дзмітрыева, І.Насовіча, Ул.Дабравольскага, М.Нікіфароўскага, Е.Раманава, іх багатага фактычнага матэрыялу, што сведчыў пра самабытнасць беларусаў, іх этнічнай культуры. Разам з тым сказаў праўду пра іх "западноруссизм", погляд на беларусаў як на адно з "русских племен" і на мову беларускую як адну з гаворак "единого русского языка". Да таго ж, на думку А.Станкевіча, іхняя запісь іх беларускай народнай творчасці "пераважна дрэнная, тэндэнцыйная, у ёй творства гэтае выразна перакручваецца на расейскі лад." Асабняком тут стаіць Адам Кіркор, які сам быў "абруселым беларускім католікам". Сапраўднае адкрыццё нашай народнай мовы і фальклору зрабіў зноў такі "спольшчаны беларус-католік" Міхал Федароўскі ў "сваім несмяротным этнаграфічным зборніку "Люд беларускі". Прызнаваў лідэр беларускага каталіцкага адраджэння заслугі "спольшчанага велікаруса-католіка" Апяксандра Ельскага, добрага сябра беларусаў і даследчыка іх культуры [106] .

Цікава, што А.Станкевіч у заключэнне гістарычнай часткі сваёй манаграфіі палічыў патрэбным растлумачыць "прычыны, дзеля якіх пачынальнікамі беларускага адраджэння з'яўляюцца беларусы-католікі абодвых абрадаў". Іх выключная роль у гэтай гістарычнай справе, на яго думку, тлумачыцца апазіцыйнасцю каталікоў да царызму і палітыкі русіфікацыі, праследаванне імперскай адміністрацыяй уніятаў і католікаў лацінскага абраду. Урэшце, трэцяя прычына - высокі узровень асабіста-індывідуальнай і нацыянальнай самасвядомасці каталіцкай інтэлігенцыі, уплыў на яе светапогляд еўрапейскага дэмакратычнага і нацыянальна-вызваленчага руху.

Даследаванне ідэалогіі і палітыкі беларускай хрысціянскай дэмакратыі XX стагоддзя А.Станкевіч пачынае з вызначэння двух тыпаў нашага адраджэнцкага руху. "У працы беларускіх адраджэнцаў першых пяці гадоў XX ст., - кажа даследчык, - ужо паяўляюцца два кірункі - эвалюцыйны кірунак, што больш спадзяваўся зрабіць дабра для беларускага народа прадусім дарогай культурнай, творчай працы, і рэвалюцыйны кірунак, што



псеўдонімамі. Як ужо адзначалася, бясспрэчным ягоным псеўдонімам, не ўлічаным бібліёграфамі, ёсць Ігнат Папараць. Будучы рэдактарам "Крыніцы" у 1919-1921 гг., і пазней, калі па загаду біскупаў павінен быў (фармальна навідавоку) не рэпрэзентаваць сваю грамадска-палітычную дзейнасць, ён апублікаваў у ёй цікавыя нарысы, артыкулы, нататкі, якія выдзяляюцца смеласцю думкі і дакладнасцю адраджэнцкай пазіцыі.

Сімвалам асветніцтва для Ад.Станкевіча была Крыніца Жывой Вады, вядомая з народнай міфалогіі і евангельскай гісторыі (Нн 4:10-14). Жывою вадою для беларусаў заўсёды заставалася роднае слова "Беларусы, шануйце сваю мову!" - вось дэвіз Станкевіча-публіцыста[70]. Большасць баявітых выступленняў Станкевіча - пасля Сойму прысвечана абароне роднае мовы, беларускае мовы і нацыянальнай культуры, аналізу антыбеларускай палітыкі міжваеннай Польшчы. Звярнуўшы ўвагу Сойма і грамадскасці краіны на шпаркае развіццё беларускай пачатковай і сярэдняй адукацыі падчас так званай Сярэдняй Літвы (рэгіён Віленшчыны, выдзелены ў асобнае ўпраўленне да яго ўключэння ў склад Польшчы ў 1921 г.), беларускі лідэр выкрываў імперскую палітыку гэтай дзяржавы. "У меру аднак таго,- казаў ён на Асветнай камісіі Сойма 12 лютага 1924 г., - як уладу ў рукі бралі польскія кругі нацыяналістычныя і чорнасоценныя, беларуская прасвета ўсцяж ад уціску гібела і сяння сталася даведзенай блізу да нічога"[71]. На падставе дакладных статыстычных фактаў і шматлікіх прыкладаў жорсткай дыскрымінацыі беларускіх вясковых школак і беларускіх гімназій, прааналізаваных у соймавай прамове 1 ліпеня 1924 г. Ад.Станкевіч абвінаваціў урад і мясцовую адміністрацыю ў свядомай паланізацыі беларускага народа[72].

У газеце "Крыніца" за 1924 год друкаваліся нарысы Ад.Станкевіча "Беларуская мова у школах Беларусі XYI- XYII ст.[73] У 1928 г. гэтае ўнікальнае ў беларусазнаўстве дасле апублікована асобнай брашурай у выдавецтве "Беларускай Крыніцы" - пераемніцы ранейшай "Крыніцы". Пасля характарыстыкі культурнага пад'ёму ў Беларусі эпохі Рэнесансу якому паспрыялі дзяржаўная самастойнасць, Магдэбургскае права і Літоўскі статут, аўтар упершыню паказаў, што ў каталіцкіх парафіях Барысаўскага, Лідскага, Менскага, Дзісненскага і іншых паветах, у Ляхавічах, Магілёве, Лагойску, Заблудаве былі каталіцкія школы, дзе вучылі беларускай мове, бо яна ў XYI-XYII стст. мела статус дзяржаўнай мовы. Біскупы, ксяндзы і ўрадавыя

службоўцы карысталіся ёю не толькі ў касцёле і школе, але і ў прыватнай перапісцы. Захаваўся на беларускай мове каралеўскі прывілей Віленскай капітуле (1567г.).

Пра беларускую мову у школах сведчыць Міхайла Літвін у лацінскай кніжцы "Пра звычаі літоўцаў, татараў і маскавіцян" каля 1850г.)[74]. Нават у каталіцкіх калегіях і акадэміі, дзе асноўнаю моваю была латынь, не маглі абысціся без папярэдняй адукацыі па-беларуску, бо нельга было, не выкарыстоўваючы мовы шляхты, сялян і гараджан, мовы дзяржаўных актаў, навучыць латыні.

Ад.Станкевіч сістэматызаваў шматлікія крыніцы, якія сведчылі, што беларуская мова выкарыстоўвалася таксама ў школах, кнігах пратэстанцкіх (нясвіжскі "Катэхізіс" С.Буднага, Радзівілаўская гімназія ў Слуцку, школы кальвіністаў у Навагрудку, Нясвіжы, Заслаўі, Оршы, Менску, Свіслачы, Шклове, Віцебску, Глыбокім, Варнянах, Смаргоні). Аднак, паводле яго даследаванняў "кальвіністы найбольш працавалі сярод польскіх і спольшчаных магнатаў, дык больш увагі звярталі на мову польскую, як беларускую"[75]. Ад.Станкевіч бадай што быў першым даследчыкам, які звярнуў увагу на беларускую моўную арыентацыю праваслаўнага асветніцтва, ва ўсякім выпадку да сярэдзіны XУII ст. У праваслаўных школах вывучалі старaславянскую і грэчаскую мовы на аснове ведання старабеларускай мовы, якая была пераважным сродкам сумоўя не толькі ў штодзённым побыце, але і ў літаратуры, дыпламатычнай і дзелавой перапісцы. У брацкіх школах яе вывучэнне ўваходзіла ў пералік асноўных праграмных патрабаванняў.

Неадназначна ацэньваў беларускі каталіцкі асветнік ролю царкоўнай Уніі ў гісторыі беларускай культуры, пра што гутарка яшчэ наперадзе. Працэсы паланізацыі беларускага касцёла і русіфікацыі Праваслаўнай царквы пачаліся ў канцы XУI ст. "Тварцы Уніі, - не раз адзначаў Ад.Станкевіч,- добра бачылі гэты грозны для беларускага народа падзел чужымі культурамі на дзве праціўныя часці". Іхняя ідэя яднання беларускага паводле традыцыі праваслаўнага абраду з Каталіцкім Касцёлам легла ў аснову царкоунай Уніі, якая ў пэўным сэнсе была беларускай народнай верай, яна была найбольш дапасавана да беларускага духу". Ва ўніяцкіх школах беларускую мову, на думку Ад.Станкевіча, вывучалі практычным метадам, амаль без падручнікаў, яна была там "мовай выкладання ўсіх прадметаў". Віленская ўніяцкая кангрэгацыя 1636 года ўзаконіла беларускую



Але і ў Рэчы Паспалітай, якую палякі тэндэнцыйна называлі толькі "польскім краем, а народ беларускі свайго роду часткай польскага народу", беларускасць трымалася пераважна пры Ўніяцкай царкве[104].

Такім чынам, А.Станкевіч зрабіў важныя карэктывы да сваіх ранейшых ацэнак беларускай культуры XУII-XУIII стст., цяпер ён ужо не кажа пра яе поўны заняпад, адзначае ролю Ўніяцкай царквы ў захаванні нашай моўна-культурнай традыцыі, прыводзіць шэраг фактаў на карысць гэтых ацэнак. Дарэчы, А.Станкевіч, які раней, празмерна абагульняючы вядомыя тэндэнцыі да дэнацыяналізацыі беларускай шляхты, бадай што першы звярнуў увагу на яе ролю ў пачатковым этапе нацыянальнага Адраджэння. Гэта з асяроддзя нашай шляхты выйшлі ўжо вядомы настаўнік Паўлюка Багрыма ксёндз Магнушэўскі, прафесар Ігнат Даніловіч, гісторык Ігнат Апацэвіч, віленскі асветнік і выдавец Антон Марціноўскі, прафесар і ўніяцкі святар Платон Сасноўскі, прафесар права і гісторык культуры Язэп Ярашэвіч і іншыя асветнікі, якія яшчэ ў першай чвэрці XIX ст. адкрылі самабытнасць гісторыі і культуры беларусаў. Між іншым, усе яны - з уніяцкага асяроддзя, гэта дазволіла А.Станкевічу зрабіць выснову, што ў эпоху польска-беларускага Асьветніцтва "беларускасць , на наш погляд, найлепш трымалася каля Уніі"[105].

З беларускай уніяцка-каталіцкай шляхты, адзначае далей аўтар, манаграфіі, выйшлі пачынальнікі новай беларускай літаратуры: Вінцэнт Равінскі (1882-1842), якога А.Станкевіч лічыў аўтарам беларускай "Энеіды навыварат" і, магчыма, паэмы "Тарас на Парнасе", ад якіх пачалося адраджэнне беларускае літаратуры; Ян Баршчэўскі (1790-1851), які "дасканала малюе рысы беларускай душы", Аляксандр Рыпінскі - аўтар кнігі "Беларусь", Ян Чачот (1797-1847), які "у сваёй працы, хоць несвядома, разбуджае беларускасць і шчыра спагадае цяжкай долі селяніна-гаротніка". Вінцэнт- Дунін-Марцінкевіч (1807-1884) таксама з беларускай шляхты, арганічна звя-заны з каталіцкай культурай, сваяк каталіцкага мітрапаліта С.Богуй-Сестранцэвіча, вучыўся ў базіліянскай школе ў Вільні і сам служыў у Мінскай каталіцкай кансісторыі.

Такім чынам, усе пачынальнікі беларускага нацыянальнага адраджэння XIX ст., уключаючы К.Каліноўскага і Ф.Багушэвіча, І.Грынявіцкага, Янкі Лучыны (ім А.Станкевіч прысвяціў ранейшыя нарысы і раздзелы ў манаграфіі "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення") - з беларускай ката-

турна-нацыянальнага Адраджэння) тэматыка, ён падрыхтаваў да 950-гадовага юбілею хрышчэння Беларусі і прысвяціў "працаўнікам на беларускай хрысціянскай ніве".

Як і ў папярэдняй кніжцы, нарысы па гісторыі беларускага хрысціянскага руху грунтуюцца на дакументальнасці (у тэкст уведзены аўтэнтычныя дакументы, успаміны, сведчанні альбо фрагменты з іх) храналагічнай паслядоўнасці (амаль летапісны метад выкладання), нацыянальна-адраджэнцкай канцэптуальнасці і арыентацыі на шырокае кола чытачоў, навукова-папулярны, месцамі публіцыстычны жанр. Праўда, новая манаграфія не публікавалася ў часопісе, верагодна, пагэтаму ў ёй пераважае навуковасць, а не публіцыстычнасць. Няма ў ёй шматлікіх ілюстрацый. Іканаграфічны летапіс упрыгожвае кнігу "Родная мова ў сьвятынях", дзе ёсць добрыя фотапартрэты ўдзельнікаў беларускага хрысціянскага руху, у тым ліку біскупаў, якія па-хрысціянску клапаціліся аб Беларусі.

У новай кніжцы А.Станкевіча мы сустракаемся з вядомымі па ягоных папярэдніх публікацыях героямі беларускай гісторыі і культуры, але таксама з новымі асобамі, якія працавалі на мяжы трох, нават чатырох культур - беларускай, польскай, літоўскай і расійскай. Некаторыя з іх і сёння застаюцца па-за кантэкстам афіцыяльнай навукі ў Беларусі. Кніга складаецца з адзінаццаці раздзелаў. Першыя тры - гэта перадгісторыя хрысціянскага руху, гістарычны экскурс ад эпохі ранняга хрысціянства на Беларусі да 1910 года. Асноўная частка прысвечана станаўленню і развіццю беларускай хрысціянскай дэмакратыі: А.Станкевіч быў яе пачынальнікам, агульнапрызнаным лідэрам, тэарэтыкам, урэшце, летапісцам.

Тэарэтычныя пастулаты А.Станкевіча, ягоная ацэнка асноўных этапаў гісторыі беларускай культуры бадай што і сёння агульнапрызнаныя ў асяроддзі кампетэнтных, нацыянальна арыентаваных навукоўцаў Беларусі, за выключэннем паасобных спрэчных момантаў. "Беларускі народ,- кажа ён у пачатку сваей кнігі, - стаўся народам ужо у XIII-XIУ стст., і аб'яднаўшыся з Літвой, даволі хутка пайшоў па гістарычнай дарозе свайго жыцця", дасягнуў у XУI ст. высокага ўзроўню самабытнай культуры. "Культура гэта спярша мела характар хрысціянска-візантыйскі, а пасля злучэння Беларусі з Літвой (XIУст.) пачала набіраць адзнакаў хрысціянска-заходніх, каталіцкіх". Быў у яе свой гуманістычны ўзлет у XУI ст., але пасля Люблінскай уніі 1569 года і асабліва з канца XУII ст. пачаўся яе заняпад.



мову ў цэрквах, арыентавала іх на рэлігійнае асветніцтва ў роднай для беларусаў мове[76].

Ф.Скарына - пачынальнік беларускай літаратуры і нашага хрысці-янскага асветніцтва. Верагодна, пагэтаму Ад.Станкевіч, прадаўжальнік Скарынавай традыцыі, пачаў сваё літаратуразнаўчыя даследаванні з невялікай манаграфіі "Доктар Францішак Скарына першы друкар беларускі: 1525-1925", выдадзенай Беларускім Навуковым Таварыствам (Вільня, 1925). Аўтар піша пра гісторыю кнігадрукавання, пачынаючы ад першай друкаванай кніжкі І.Гутэнберга ў 1456 г. Паводле ягоных падлікаў, да 1500 года ў Еўропе было выдадзена 16 тысяч першадрукаў (інкунабулаў).

Усходнеславянскі кірыліцкі друк пачаўся ў польскім Кракаве кнігамі ("Актаіх", "Часасловец", "Трыёд") немца Ш.Феоля. А.Станкевіч цытуе адно з ягоных пасляслоўяў, стылістыка якога , верагодна, паўплывала на аналагічны жанр нашага Ф.Скарыны: "Доконана бысть сия книга у великом граде у Кракове, при державе великаго короля польскаго Казимира, и докончана бысть мешанином Краковским Швайцпольтам Феолем".

У нарысах А.Станкевіча ёсць фактычныя і тэрміналагічныя недак-ладнасці, абумоўленыя тым, што беларуская гісторыя і культура ў 20-я гады яшчэ не былі прадметам сістэмнага даследавання, веды пра яе былі фрагментарныя, канцэпцыі тэндэнцыйныя - як расійскіх, так і польскіх даследчыкаў. Лічылася, напрыклад, што Ф.Скарына вярнуўся ў Вільню толькі ў 1525 годзе (сёння вядома, што гэтае вяртанне адбылося каля -1521 г.). Следам за польскімі і расійскімі даследчыкамі Ад.Станкевіч (ва ўсякім выпадку ў 20-я гады) лічыў, быццам бы Люблінская ўнія 1569 г. далучыла Вялікае Княства Літоўскае да Польшчы. На самай жа справе гэта была канфедэрацыя дзвюх дзяржаў. Аднак яго канкрэтная ацэнка эпохі Скарыны - росквіту культуры гуманістычнага тыпу пацвярджаецца сучаснымі даследаваннямі.

Ад.Станкевіч лічыў, што Ф.Скарына нарадзіўся каля 1490 года, верагодна, меў першае імя Юрыя (Георгія). Дакладна вызначыў ён агульны пафас асветніцтва першадрукара - яго арыентацыю на гармонію нацыянальна беларускай і агульналюдскай культуры, на адзінства хрысціянства ўсіх канфесій. Не аддаваў перавагі ні адной з іх Ф.Скарына, паводле А.Станкевіча, быў "вялікім беларусам хрысціянінам і гуманістам агулам, каторы даў Біблію, як аснову тады ўсякай веды, беларускаму народу ў яго роднай беларускай мове і заклаў асновы да ўводзін гэтага

народу ў агульную людскую сям'ю"[77]. У сваіх нарысах А.Станкевіч ахарактарызаваў асаблівасці Скарынавага друку, асноўныя ідэі ягоных кніжак, паказаў іх значэнне для кнігадрукавання і хрысціянскага асветніцтва ў Беларусі.

Іншыя свае кніжкі, брашуры і артыкулы А.Станкевіч прысвяціў беларускаму літаратурна-мастацкаму, моўнаму і культурнанацыянальнаму адраджэнню XIX - першай чвэрці XX ст. Адзначу тут ягоную тыповую "нашаніўскую" памылку, каб да яе больш не вяртацца. Вось агульная фармуліроўка недакладнай ацэнкі культурнай сітуацыі ў Беларусі XУII-XУIII стст.: "Пасля таго, як Вялікае Княства Літоўскае, а з ім і Беларусь у 1569 г. у Любліне падпісала з Польшчай палітычную ўнію, і пасля таго, калі ў 1596 г. у Берасці наступіла ўнія царкоўная, - пачаўся заняпад палітычны і культурны беларускага народа. Гэты заняпад канчаткова наступіў у 18 стагоддзі". Недакладнае і другое сцвярджэнне, што да XIX ст. вышэйшыя слаі насельніцтва - паны, духавенства, нават мяшчанства пакінулі беларускі народ, беларускую мову, культуру, а многія нават веру і "праняліся цалкам культурай польскай"[78].

Зноў жа гэтыя недакладныя высновы былі вынікам недастатковага ведання асветнікамі першай паловы нашага стагоддзя ўсіх складальнікаў гісторыі беларускай культуры. Пра яе пэўны заняпад у XУII-XУIII стст. можна гаварыць толькі адносна літаратуры, літаратурнай і дзелавой мовы (але не мовы народнай, гутарковай, якая прадаўжала жыць і развівацца ў разнастайнасці сваіх дыялектаў). І не ў дачыненні да іншых відаў культуры - архітэктуры, свецкай навукі і філасофіі, палітычнай думкі. Вядома, што ў другой палове XУII пачатку XIX ст. Беларусь была адной з самых тэатральных краін Еўропы. Урэшце, дзелавая перапіска іерархаў і кліру Ўніяцкай царквы і звязаныя з яе развіццём урадавыя дакументы, творы ўніяцкіх пісьменнікаў [І.Пацея, І.Кунцэвіча і іншых) сведчаць, што першая палова XУII ст. адзначана апошнім узлётам старабеларускай літаратурнай мовы.

Далёка не ўсе вышэйшыя слаі беларускага насельніцтва да XIX ст. пакінулі беларускі народ і далучыліся цалкам да польскай культуры, як гэта apriori здавалася нашаніўцам ды іх паслядоўнікам у Заходняй Беларусі. Перапіс насельніцтва Расійскай імперыі ў канцы XIX ст. засведчыла: амаль палова патомных (але не чыноўных) дваран Беларусі, пераважна фальваркавай шляхты, назвала сваёй роднаю мовай беларускую. Беларуская шляхта аказалася захавальніцай этна-беларускай моўна-куль-



Уладзіслаў Талочка і іншыя. Урэшце, беларускае каталіцкае адраджэнне ўзначаліў Адам Станкевіч. (Пра сябе ў гэтым ды іншых даследаваннях ён ўпамінае вельмі сціпла).

У іх былі папярэднікі, духоўныя айцы гэтых дзяцей. Пра іх распавядае А.Станкевіч. Сярод першых - Стафан Данісэвіч, біскупсуфрагат архідыцэнзіі Магілёўскай, з дробнай магілёўскай шляхты. Ён закончыў Менскую духоўную семінарыю і Каталіцкую Акадэмію ў Пецярбургу. Пазней па яго слядах пройдуць ягоныя паслядоўнікі. У 1906 годзе ён выдаў за свой кошт беларускі "Элементар для добрых дзетак каталікаў" (дапоўненае перавыданне "Элементара" 1862 года) , рэдагаваў іншыя беларускія каталіцкія падручнікі ("Кароткі катэхізм", "Кароткая Гісторыя Святая").

Кніжка "Родная мова ў сьвятынях" - першы даведнік пра жыццё, асветніцтва, раннюю смерць піянераў беларускага каталіцкага адраджэння. Тут ёсць пра іх біяграфічныя даведкі, этапы іх асветніцтва, фотапартрэты. Ецсь тэксты рэдкіх дакументаў, якія датычацца змагання за беларускі касцёл і школу ў родная мове (Мемарыял 25.IУ.19I7 г., аналіз рэлігійнай тэматыкі ў газетах "Беларус" і "Гоман", тэксты шматлікіх рэзалюцый беларуска-каталіцкіх арганізацый, гістарычныя дакументы пра змаганне беларускіх ксяндзоў за родную мову і культуру ў Заходняй Беларусі). Шмат увагі ўдзяліў аўтар дзейнасці выдатных біскупаў (Эдвард Роп, Юрый Матулевіч), якія сваёй гуманістычнай пазіцыяй і хрысталюбіем садзейнічалі руху за беларускае нацыянальнае Адраджэнне. А.Станкевіч зафіксаваў кожны дакумент, кожнае касцёльнае казанне, рэлігійную лекцыю, прамоўленыя па-беларуску ў Беларусі.

Апошнія старонкі кніжкі прысвечаны барацьбе арганізацыі ксяндзоў-беларусаў "Светач" (створана ў 1923 годзе, аднак ёй польскія ўлады адмовілі ў рэгістрацыі) за беларускі касцёл, асветніцкай і палітычнай дзейнасці беларускіх ксяндзоў Я.Семашкевіча, В.Аношкі, Ант.Дземяшкевіча, А.Навіцкага, ксяндза і прафесара Я.Тарасевіча, М.Пятроўскага, В.Шутовіча, В.Гадлеўскага, Андрэя Цікоты і іншых самаахвярных беларусаў.

Праз дзесяць гадоў пасля выхаду ў свет манаграфіі "Родная мова ў сьвятынях" (1929) А.Станкевіч апублікаваў сваю грунтоўную кнігу больш шырокага зместу пад назваю "Беларускі хрысціянскі рух: Гістарычны нарыс" (1939) у выдавецтве ўсё таго ж часопісу "Хрысьціянская Думка". Сваё новае даследаванне , у якім зноў жа арганічна спалучаецца тэалагічная (гісторыя беларускага каталіцкага касцёла) і свецкая (станаўленне і развіццё беларускага куль-

вай карысталіся пры катэхізацыі". Нават у 1824 г. уніяцкі Полацкі арцыбіскуп Якуб Мартусевіч афіцыйна загадаў падуладнаму духавенству вучыць хрысціянскай праўдзе "у роднай народу беларускай мове"[102].

Праўда, у манаграфію Ад.Станкевіча па недагляду "прайшлі" памылковыя ацэнкі. Як, напрыклад, такая выснова, што яўна пярэчыла папярэднім аргументам: "Увесь век ХУІІІ - гэта час павольнага канання беларускага народу, яго мовы і культуры"[103]. Але ж паланізацыя захапіла толькі сацыяльныя "вярхі" і функцыянальныя сферы культуры (друк, кнігавыданне, тэатр, сістэма дзяржаўнага кіравання), а большасць народу захавала сваю мову і традыцыйную этнічную культуру. Да таго ж А.Станкевіч зазначае, што нават пасля далучэння ўніятаў да Праваслаўнай царквы ў святынях карысталіся беларускай мовай, бо іншай просты народ не ведаў. У сваёй кніжцы ён прыводзіць цікавыя факты беларускіх касцёльных казанняў на Віцебшчыне ў абвешчаным папам Лявонам XII-ым Юбілейным 1826 годзе (год Даравання), спасылаецца на беларускія каталіцкія кніжкі 1835,1845 і 1862 гадоў.

Аднак палітыка Расіі доўга ігнаравала беларускі этнас і беларускую культурную традыцыю, ідэнтыфікуючы ўсіх праваслаўных з "агульнарускім" народам, а католікаў - з палякамі. Калі ж пасля паўстання 1863 года імперская Расія, урэшце, "заўважыла" беларусаў, то пачала татальную іх русіфікацыю, усюды ўводзячы рускую мову не толькі ў цэрквах, але і ў касцёлах Беларусі. "Такім чынам, - зазначае А.Станкевіч, расійская палітыка не толькі здушыла, знішчыла беларускую мову ў Царкве Праваслаўнай і агулам, але так жа, свядома і несвядома, проста і ўбочна, здушыла нашу мову ў Касцёле Каталіцкім, вымагаючы, а прынамсі памагаючы яму стацца польскім 103 . Гэтая выснова грунтуецца на шматлікіх фактах, сістэматызаваных у манаграфіі "Родная мова ў сьвятынях".

Другая частка кніжкі А.Станкевіча (раздзелы УІІ - Х) - гэта цікавы летапіс барацьбы за беларусізацыю Касцёла і Царквы ў эпоху беларускага нацыянальнага Адраджэння (пачатак ХХ ст. - 1930-я гады), з грунтоўнымі каментарамі аутара . Першымі змагарамі за Беларусь у асяроддзі беларускіх ксяндзоў былі Фр.Будзька, Алесь Астрамовіч (паэт Андрэй Зязюля), Канстанцін Стаповіч (паэт Казімір Сваяк),З.Якуць, Фабіян Абрантовіч, Вінцэнт Гадлеўскі, В.Шутовіч, П.Татарыновіч, А.Сікора, Я.Семашкевіч, М.Пятроўскі, Я.Рэшаць, Л.Хвецька, І.Тарасевіч,



турнай традыцыі, і гэта дазволіла ёй узгадаваць пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, тэатра, іншых відаў культуры, пачынаючы Янам Чачотам і Кастусем Каліноўскім - аж да Янкі Купалы, Ігната Буйніцкага, братоў Івана і Антона Луцкевічаў.

Дарэчы, сам Ад.Станкевіч, калі пераходзіў да аналізу канкрэтных фактаў культуры, папраўляе свае недакладныя пасылкі. У нарысах "Магнушэўскі; Паўлюк Багрым; Баброўскі: Да вытокаў беларускага адраджэння" (Вільня, 1937) ён справядліва кажа: "Агулам жа верным беларусам заставаўся беларускі сялянскі народ .... Знакам гэтай вернасці Беларусі ў нашым народзе была і ёсць яго гераічная вернасць сваёй беларускай мове. Вось жа сваю родную мову, як знак жыцця, як задатак на лепшую будучыню, беларускі народ верна перавыхоўваў і пераказваў з пакалення ў пакаленне, чакаючы зары, чакаючы ўсходу сонца, чакаючы народнага адраджэння " І тут жа дабаўляе: "Гаварыла па-беларуску таксама шляхта, асабліва ў ваколіцах"[79].

Але не адна засцянковая шляхта. Заставаліся беларускімі патрыётамі закліканыя лёсам і самым Богам добрыя пастыры народа. Нарыс пра жыццё Багрымавага настаўніка Магнушэўскага сведчыць пра іхнюю самаахвярнасць. Абапіраючыся на біяграфічныя звесткі А.Янулайціса, апублікованыя ў альманаху "Маладая Беларусь" (1913, сшытак 3) А.Станкевіч істотна дапісаў партрэт першага беларускага ксяндза-адраджэнца, верагодна, з беларускай шляхты, не-вядомага нават па свайму імені. На падставе захаванай у справе аб Крошынскім бунце вяскоўцаў супраць пана Юрагі даследчык устанавіў , што Магнушэўскі-гэта быў манах-дамініканец.

А ў кнізе польскага гісторыка Валыняка "Звесткі пра дамініканаў Літоўскай правінцыі" (Кракаў, 1917 г.) ён знайшоў у пераліку імёнаў Мацея Магнушэўскага, які быў старшым манастыра ў Вэрках пад Вільнй айцец Мацей пражыў 78 гадоў і памёр не 24 снежня 1828 г., як пра гэта паведамляў Янулайціс, а 25 ліпеня 1939 г. А.Станкевіч прапанаваў гіпатэтычную ідэнтыфікацыю дамініканца Мацея з ксяндзом Магнушэўскім у Крошыне.

Адносна паэта Паўлюка Багрыма гэты даследчык лічыў, што ён мог быць аўтарам не толькі верша "Зайграй, зайграй, хлопча малы...", але таксама вядомых вершаваных апавяданняў "Гутарка Данілы са Сцяпанам" і "Размова пана з мужыком". Агулам жа, значэнне твораў П.Багрыма, на думку Ад.Станкевіча ў тым, што "яны пайшлі ў народ і словам сваім

беларускім будзілі нацыянальную сведамасць , а зместам - сведамасць сацыяльную"[80] .

Кніжка А.Станкевіча пра пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння завяршаецца нарысам пра яшчэ аднаго выхадца з беларускага шляхецкага роду, уніяцкага святара, славіста, магістра права і доктара тэалогіі Міхаіла Баброўскага (1784-1848). Па сутнасці, гэта было адкрыццё для беларускай грамадскасці подзвігу гэтага слаўнага вучонага сусветнай вядомасці, які ўпершыню даследаваў беларускую навуковую і культурную традыцыю. Па справе філаматаў і філарэтаў у 1824 г. М.Баброўскі быў звольнены з пасады прафесара тэалогіі ў Віленскім універсітэце, высланы ў Жыровіцкі манастыр, даследаваў славянскія старажытнасці , адкрыў Супрасльскі рукапіс XI-га стагоддзя. У 1828 г. царскаю ласкаю вернуты ва ўніверсітэт, чытаў курсы экзегетыкі і герменеўтыкі.

Пасля закрыцця ўніверсітэта (1832) і Галоўнай семінарыі (1833) М.Баброўскі прызначаны пробашчам у Шаршова Пружанскага павета. Паводле слоў А.Станкевіча, там "моцна трымаўся Ўніі, нават калі на ўніяцкіх кафедрах заселі царскія агенты Сямашка, Зубко , Лужынскі". Гэта пад іх націскам ён даў распіску пра далучэнне да царскага праваслаўя. А.Станкевіч мяркуе, што рукапісы М.Баброўскага па беларусістыцы маглі быць знішчаны па загаду Сямашкі"[81].

Да трыццатых угодкаў смерці папярэдніка нашай класічнай літаратуры А.Станкевіч апублікаваў пра яго першы манаграфічны нарыс "Францішак Багушэвіч. Яго жыццё і творчасць" (1930). Наступныя даследчыкі карысталіся з гэтай крыніцы, у савецкі перыяд) не маючы магчымасці спасылацца на "закрытага" бальшавікамі аўтара. У гэтай кніжцы распавядаецца пра антыбеларускую палітыку царызму, узмоцненую пасля паўстання 1863 года, пра лёс Багушэвічавага архіва, пра папярэднікаў Багушэвіча, пачынальнікаў беларускай літаратуры (ананімныя паэмы, Ян Баршчэўскі, Ян Чачот, Павел Шпілеўскі і інш.), аналізуюцца малавядомыя ў былой Савецкай Беларусі крыніцы (нарысы Казіміра Сваяка, малюнкі Язэпа Драздовіча і інш.). Паводле светапогляду, Ф.Багушэвіч, на думку даследчыка, развіваў ідэі сваіх папярэднікаў, К.Каліноўскага, І.Грынявіцкага і інш., пра што ўжо гаварылася ў гэтым нарысе. Урэшце, А.Станкевіч першы і, здаецца, пакуль што апошні даследаваў рэлігійна-этычныя ідэалы Ф.Багушэвіча, звярнуў увагу на сакралізацыю у яго творчасці нацыянальных каштоўнасцей,



Гэтая норма - наяўнасць літургічнай нязменнай мовы, зазначае А.Станкевіч, не ёсць рэлігійным дагматам, а толькі агульнапрызнанай Сусветным Касцёлам традыцыяй. Дзякуючы ёй, "Касцёл захаваў сярод сваіх верных і адзінства, і разнароднасць, што ёсць дужа мудрым, справядлівым і прыгожым"[100].

У трэцім і чацьвёртым раздзелах манаграфіі А.Станкевіч абгрунтаваў неабходнасць роднае мовы ў рэлігійным жыцці Святым Пісаннем, спаслаўшыся на запавет Ісуса Хрыста сваім вучням ("Ідучы ж, навучайце ўсе народы...", Мат.28:19), на Апакаліпсіс ("..І співаюць новую песню, кажучы: Ты варты ўзяць кнігу і зняць з яе пячаткі; бо Ты быў заколаты, і Крывёю Сваёю Ты адкупіў нас Богу з кожнага калена, і роду , і народу". І яшчэ: "І сказау Ён мне: табе трэба зноў прарочыць пра народы, і плямёны, і цароў многіх". І яшчэ: "І ўбачыў я другога анёла, які ляцеў пасярэдзіне неба, які меў вечнае Дабравесце, каб звеставаць насельнікам зямлі і кожнаму племені і пакаленню, і роду і народу", Апак. 5:9; 10:11; 14:16 і інш.). Урэшце, спаслаўся на Дзеі апосталаў (у тых частках, дзе апавядаецца, што апосталы пасля зыходу на іх Духа Святога, загаварылі на мовах многіх народаў, 2:1-11; 19:1-7) і на Першае Пасланне апостала Паўла да Карынфянаў, дзе ёсць вучэнне пра неабходнасць прапаведваць Евангелле і прарочыць пра Царства Хрыстовае на ўсіх мовах (14:1-33).

Следам за аргументацыяй неабходнасці роднае мовы ў святынях Новазапаветнымі кнігамі Бібліі, А.Станкевіч абгрунтаваў сваю ідэю актамі Сусветных і рэгіянальных сабораў і вердыктамі Апостальскае Сталіцы. Франкфурцкі сабор 794 года пастанавіў, "каб ніхто не верыў у тое, што Бога хваліць можна толькі ў трох мовах (стараяўрэйскай, старагрэцкай і лацінскай. - Ул.К.), бо ў кожнай мове можна маліцца Богу. У сваю чаргу папа Андрыян II дазволіў асветнікам-місіянерам Кірылу і Мяфоду "як найшырэй карыстацца славянскімі мовамі"[101]. Кульмскі сінод (сабор) 1583 года абавязаў кожнага пробшча вывучаць мову сваіх парафіянаў і карыстацца ёю.

Да канца XYII ст. Уніяцкая Царква і Каталіцкі касцёл карысталіся беларускаю моваю як пераважным сродкам зносін і духоўнай асветы. Але і пазней Віленскі сінод 1742 года "пастанавіў гаварыць народу паводле старага звычаю на роднай мове". Тады ж, у XYIII ст., выдаваліся ўніяцкія катэхізісы па-беларуску, а яшчэ пазней, полацкія ўніяцкія біскупы ў канцы XYIII і ў пачатку XIX ст. рассылалі загады парахвіяльным ксяндзам, каб па-беларуску гаварылі казанні і беларускаю мо-

тая тоеснасць, верагодна, не пярэчыць характару станаўлення нацый у Заходняй Еўропе, асабліва менталітэту былых імперскіх дзяржаў. Напрыклад, пад французскім народам там разумеюць французскую нацыю, якая складаецца з этнічнага ядра "аутэнтычных" французаў, сфармаванага ў эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу, і шматлікіх іншанацыянальных анклаваў, якія прачасткова захавалі свае антрапалагічныя і этнічныя асаблівасці, аднак у той ці іншай меры адаптаваліся да французскай этнакультурнай, найперш моўнай традыцыі. У Беларусі (таксама па аналогіі на Украіне ды іншых рэгіёнах Усходняй Еўропы) захавалася, а сёння яшчэ больш выявілася сэнсавае адрозненне паміж паняццямі беларускі народ (этнічнае ядро нацыі, моцна дэфармаванае каланіяльнай дэнацыяналізатарскай палітыкай царскай, а найбольш бальшавіцкай Расіяй), "народ Беларусі" (усе жыхары сучаснай рэспублікі Беларусь) і беларуская нацыя (рэшта этнічнага ядра і нацыянальнай эліты, якая захавала вернасць беларускай мове і адаптавалася да беларускай этнакультурнай традыцыі незалежна ад свайго этнічнага паходжання).

Гэтая заўвага патрэбна, каб адэкватна разумець тэрміналогію Ад.Станкевіча: у эпоху яго святарскай, асветніцкай і палітычнай дзейнасці ў Заходняй Беларусіі беларуская нацыя ахоплівала большасць народа.

У першых раздзелах сваёй манаграфіі ("Мова ў жыцці рэлігійным наогул", "Мовы памершыя і жывыя") Ад.Станкевіч яшчэ ў канцы I920-х гадоў даў адказ на спрэчныя да нашага часу пытанні наконт так званых кананічных (лацінскай, царкоўнаславянскай) і нацыянальных моваў у рэлігійным жыцці: лацінская мова ў Касцёле (а па аналогіі - царкоўнаславянская ў Праваслаўнай царкве) патрэбныя для таго, каб захаваць стабільнасць адзінства абраду (імшы, літургіі) у шматнацыянальным свеце, які абымае Ўсяленская Царква. Калі б асноўнае набажэнства (імша і, адпаведна, літургія) адбывалася на жывых гаворках, якія няспынна змяняліся на працягу гісторыі хрысціянства, то змест яго пастутова змяняўся б - аж да істотнага адхілення ад аўтэнтычнага сэнсу. Вось чаму "ядро" набажэнства праводзіцца на ўмоўна названых "памёршых" мовах (яны ўсё ж жывыя, памерлі іх носьбіты, ад чаго латынь і царкоўнаславянская мова не развіваюцца і, як вынік, не змяняюцца); затое ўся "абалонка" (шматлікія дадатковыя набажэнствы, вуснае і друкаванае рэлігійнае асветніцтва) як норма, уключаецца ў жывую стыхію роднае мовы кожнага народа.



асабліва роднай мовы ("Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам"), адлюстраванне рэлігійных матываў у вершах "Хрэсьбіны Мацюка", "Свая зямля", "Кепска будзе" і інш.[82] .

Асобнай брашурай А.Станкевіч выдаў свой рэферат "Прафесар Бранклаў Эпімах-Шыпіла. 3 яго жыцця і працы" (1934), прачытаны на жалобнай Акадэміі, наладжанай Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры ў Вільні ў год смерці духоўнага бацькі дзеячаў беларускай культуры, у тым ліку Янкі Купалы і самога аўтара рэферату. На падставе архіўных матэрыялаў і ўспамінаў тых, каго прывёў у свет беларускай культуры гэты самаахвярны беларус, А.Станкевіч даказаў, што якраз ён быў пачынальнікам шмат якіх ідэй і спраў - выдавецкіх, літаратурных, тэатральных, палітычных акцый і інш., якія былі рэалізованы ў нашаніўскую эпоху, пазней у БССР і Заходняй Беларусі.

Урэшце, А.Станкевіч апавядае пра трагічны лёс гэтага святога для Беларусі чалавека. У I9I8-I924 гг. ён ледзь не памёр з голаду ў бальшавісцкім Ленінградзе. Запрошаны ўрадам БССР на працу ў Інбелкульт, ён падарыў Беларусі сваю багатую бібліятэку рэдкіх кніг. Калі ў 1930 годзе пачаліся масавыя рэпрэсіі супраць беларускай творчай інтэлігенцыі і навукоўцаў, Эпімах-Шыпіла быў высланы з Мінску, апынуўся ў стане беспрытульнага ў Ленінградзе. Незадоўга да смерці пісаў ксяндзу Віктару Шутовічу на Беласточчыну: "...Выкінуты на брук, бо вось ужо месяц як з прычыны вялікай залюднёласці і цяжкага жыллёвага крызісу немагу знайсці сабе не толькі кватэры, але хоць бы пакойчыка, і можа прыдзецца згінуць дзе на вуліцы ад холаду і голаду"[83].

Адаму Станкевічу належаць малавядомыя нават у навуковым свеце дзве невялікія кніжкі пра жыццё і творчасць паэта і ксяндза, заходнебеларускага адраджэнца-асветніка Казіміра Сваяка (Канстанціна Стаповіча, I890-I926 гг.). Па савецкай звычцы, дакладней, прымусу, на іх не спасылаліся нават у акадэмічных і энцыклапедычных выданнях. Сваю манаграфію "Казімер Сваяк: Нарысы аб ягонай ідэалёгіі" А.Станкевіч пачынае эпіграфам-афарызмам Мікалая Карамзіна: "Никогда не будем умны чужим умом и славны чужою славой". На думку аўтара нарысу беларускім пісьменнікам да К.Сваяка не хапала апірышча на сваю, народную філасофію. Гэтую думку ён палемічна завастрыў і перабольшыў, калі пісаў: "Усе нашы паэты і агулам пісьменнікі - гэта ўсё гадунцы чужацкіх школ і пры гэта

ўсё пераважна людзі малой набытай культуры агулам, а ў галіне веды беларускай зусім самавукі"[84].

Вось гэты прагал у нашай літаратуры, на думку А.Станкевіча, як мог, запаўняў К.Сваяк, які мэту сваёй творчасці бачыў у шуканні народнай ідэалогіі. Разам з тым К.Сваяк развіваў традыцыю Ф.Багушэвіча, яго паэтычнае пакутніцтва - праз смех скрозь слёзы сведчыў пра народнае гора. Прынцыпова новыя матывы яго паэзіі - погляд на грамадскія праблемы "з вышыні думкі рэлігійнай".

А.Станкевіч быў сябрам гэтага паэта, рана памёршага пакутніка за беларускую нацыянальную ідэю, верагодна, пагэтаму крыху перабольшваў арыгінальнасць, эстэтычную вышыню ягонай паэзіі: "Іскры красы сыпяцца, праўда, ярка і багата з твораў Сваяка, але краса ў яго творстве не ёсць самамэтай, а толькі срэдствам, пасярэднікам да далейшых, агульнейшых, больш суцэльных, больш гарманічных і сынтэтычных мэтаў, да мэты галоунай, якой для яго ёсць - знайсці сэнс, галоўная аснова беларускага адраджэння, а такжа адчасці і сэнс жыцця агулам. Такім чынам, Казімір Сваяк гэта прадусім паэт-філосаф"[85].

У сваёй манаграфіі А.Станкевіч як прафесійны літаратуразнаўца даследаваў асноўныя тэмы і матывы паэзіі К.Сваяка, грунтуючыся не толькі на апублікаваных творах, але і на рукапіснай спадчыне. Сярод рукапісаў - п'есы і філасофска-гістарычныя нарысы "Аб рэлігійнай уніі на Беларусі". Шмат увагі аддае даследчык тэме "К.Сваяк у літаратурнай крытыцы", спрачаецца з вядомымі крытыкамі і публіцыстамі А.Навінам (А.Луцкевічам), Сулімам (Ул.Самойлам). Аднак глыбокія думкі Сулімы тым не менш паважаў, не пагаджаўся толькі з інтэрпрэтацыяй крытыкам некаторых вершаў паэта як богаборчых твораў. У раздзеле "К.Сваяк і рэлігія". Ад.Станкевіч даказвае, што паэт паводле сваіх філасофскіх поглядаў быў хрысціянскім ідэалістам, які паслядоўна выступаў за адзінства Хрыстовай Царквы, а шлях да яднання бачыў у сусветнай і рэгіянальнай Уніі.

Праз пяць гадоў А.Станкевіч зноў вярнуўся да незабыўнага яму вобраза паэта і святара, апублікаваў брашуру "З жыцця і дзейнасці Казіміра Сваяка" (1936). Гэты твор - пакуль што адзіная біяграфія паэта, грамадскага дзеяча і святара, які любіў сваіх братоў-беларусаў, а яны адказвалі яму такой жа любоўю. Адзначыўшы жанравую і паэтычную разнастайнасць твораў А. Станкевіч цяпер ужо прызнаў, што вершы яго бывалі часам "нявытанчаныя і шурпатыя" з-за ягонай ранняй і невылечнай хваробы"[86].



Ёсць у гэтай малітве пра спрадвечную беларускую трагедыю: "Каб не здрадзіў за грошы свой люд..." Але ёсць у ёй надзея на выратаванне, пра яе піша аўтар "Клічу": "Дык што ж нам рабіць? Толькі плакаць? Не! Горкія слёзы, што нам вочы залiваюць, рукавом ачысціць ды як найхутчэй да ратунку дарагой Бацькаўшчыны прыступіць. Сам Бог ускладае на нас гэты вялікі ды святы абавязак. Ён нас стварыў не для цемры, а дзеля святла; не для грэху, а дзеля цноты; не для смерці, а дзеля жыцця вечнага. Дык Ягонай святой воляй ёсць, каб уся чыста Беларусь святлом праўды ды ласкі Божай красавалася, каб цнотай ды сапраўднай навукай Хрыста жыла, ды каб зямельку, нашу ў Рай перамяніла ды з Небам злучыла "[98].

Урэшце, ад часопіса "Хрысціянская думка" паходзяць тры апошнія грунтоўныя манаграфіі А.Станкевіча, дзе, па ягоных жа словах, ёсць "спроба сінтэзу" беларускай навукі, філасофіі і адраджэнцкай палітыкі з хрысціянскімі ідэаламі. Першая, унікальная ў беларусістыцы, - "Родная мова ў сьвятынях" (1929) друкавалася лацінікай у часопісе за 1929 год. Апошняя- "Хрысціянства і беларускі народ" (1940), дзе сапраўды ўдала спалучаецца беларуская тэалагічная думка з гісторыяй і культурай Беларусі, упершыню пабачыла свет на старонках гэтага ж часопіса ў апошні 1939-ы год яго выдання. Ва ўмовах вайны (верасень 1939 г.) часопіс перастаў выходзіць, і апошнія раздзелы манаграфіі дадрукоўваліся ў кніжцы, выдадзенай ужо ў літоўскім Вільнюсе (1940). А за год да гэтага выдавецтва "Хрысціянскай думкі" апублікавала даследаванне А.Станкевіча "Беларускі хрысціянскі рух" (1939). Да аналізу гэтых і некаторых іншых, апублікаваных і рукапісных твораў А.Станкевіча звернемся і мы ў заключных раздзелах гэтага нарысу.

Сваю першую буйную манаграфію "Родная мова ў сьвятынях"(І929), напісаную на аснове першакрыніц, аналізу рускіх і польскіх даследаванняў і свайго ўласнага святарскага і асветніцкага вопыту, Ад.Станкевіч пачынае з апалогіі матчынай мовы - асноўнай прыкметы нацыі. "Духоўнае сваё жыццё чалавек выяўляе пры помачы мовы /.... Група людзей, маючая асобную ад іншых, сабе ўласную мову, маючая так жа асобны характар духоўны, часта рожніцу ў будове цела, а так жа свае звычаі, сваю мінуўшчыну і сваю зямлю, на якой жыве спрадвеку, завецца народам"[99].

Пад уплывам польскай і заходнееўрапейскай традыцыі Ад.Станкевіч прымяняў паняцці народ і нацыя як сінонімы. Гэ-

А.Станкевіча "Божае Слова на нядзелі і сьвяты" (1938). Сваім крыптонімам ён падпісаў некролаг "З прычыны сьмерці сьв.п./святой памяці/ Пінскага біскупа З.Лазінскага (1932), шэраг нататкаў пад рубрыкай "Кнігапіс", нататкі "На падарожжа ў Кальварыю" (1938), некролаг "Сьв.п.прафесар Бранічлаў Эпімах-Шыпіла" (1938) і інш.

На падставе аналізу твораў А.Станкевіча з вялікай доляй верагоднасці можна лічыць ягонымі публікацыямі рэдакцыйныя артыкулы "Беларускае каталіцкае выдавецтва" (1933, 15 стар.), "Нацыяналізм і Каталіцызм" (1933, 16 крас.), "Наша 10-лецьце" (1938, 20 студз.), "Акт 25.III.1918 і Савета" (1938, 1 сак.), "Пётр Крэчэўскі" (1938, 20 сак.), "Кастусь Каліноўскі - вялікі сын беларускага народу" (1938, 10 лют.) і некаторыя іншыя.

Артыкулы "Нацыяналізм і Каталіцызм", "Кліч", падпісаны крыптонімам Кс.праф. др.Я.Т., і сёння захавалі сваю актуальнасць. У першым артыкуле аналізуюцца два палярныя кірункі нацыяналізму - творча-канструктыўны, аснова дзяржаўна-палітычнага самавызначэння народаў - і дэструктыўны, імперскі, захопніцкі. Сёння, кажа аўтар, усе еўрапейскія дзяржавы заснаваны на грунце нацыянальным, гэта значыць, што кожны народ "сам сабе будуе дзяржаўнае жыццё", творыць сваю ўласную нацыянальную культуру". Гэта - натуральны нацыяналізм, "твор самой прыроды", вынік развіцця культуры. Імперскі ж нацыяналізм супярэчыць хрысціянскай веры, бо лічыць "свой народ за найвышэйшае дабро, якому павінны служыць усе і ўсё." І у заключэнні: "Мы павінны помніць, што нацыянальнае адраджэнне нашага народу мусіць заўсёды мець на ўвазе адвечныя асновы Хрыстовай навукі, мусіць адбывацца ў рамках гэтай навукі і не пераступаць іх"[97].

Аўтар "Клічу", верагодна, блізкі супрацоўнік А.Станкевіча, пачаў і закончыў свой артыкул радкамі тыпова хрысціянскага верша Ф. Багушэвіча "Афяра":

Маліся, бабулька, да Бога,
Каб я панам ніколі не быў:
Не жадаў бы ніколі чужога,
Сваё дзела, як трэба, рабіў
Каб прад меншым я носу не драў,
А прад большым не корчыў спіны,
Каб грэх свой прад сабой я пазнаў,
У другіх каб не відзеў віны...



Яшчэ адна брашура А.Станкввіча - "Вітаўт Вялікі: Рэферат, чытаны на ўрачыстай акадэміі ў Вільні, у залі "Apollo" 27.Х.1930г. у дзень 500-леццея сьмерці Вітаўта, Вялікага Князя Літоўска-Беларускага" (1930 г.) прысвечана ролі дзяржавы ў кансалідацыі беларускага народа, яго культуры і першай геапалітычнай стратэгіі. Вось галоўныя высновы гэтага рэферату:

1. "Дзякуючы аб'яднанню беларускіх плямён з Літвою, яны аканчальна зліліся, зрасліся і стварылі адзіны народ беларускі, мова якога такжа аканчальна зложылася і выдзелілася ў мову самабытную-беларускую".

2. "Ідэя Вітаўта- гэта ідэя самабытнасці Літвы і Беларусі ўласньм коштам; ідэя Ягайлы - гэта ідэя самабытнасці Польшчы коштам Літвы і Беларусі".

3. Геапалітычны план Вітаўта (каля 1396 г.) спачатку заключаўся ў тым, каб пры падтрымцы выгнанніка з Залатой Арды Тахтамыша знішчыць імперыю магутнага татара-мангольскага валадара Тамерлана, пасля аслабіць Маскоўскае княства, уключыць у сваю сферу ўплыву Пскоў, Ноўгарад, Разань, Цвер, забяспечыць пяршынства Вялікага Княства Літоўскага ва Ўсходняй Еўропе. Але пасля паражэння на рацэ Воркслe ад войскаў Залатой Арды (1399) Вітаўт адмовіўся ад усходняга геапалітычнага праекту і падпісаў Віленска-Радамскую ўнію з Польшчай (1401), пераарыентаваўся на заходні вектар геапалітыкі, замацаваны перамогай над Тэўтонскім ордэнам у Грунвальдскай бітве (1410).

Урэшце, апошні раздзел рэферата, "Вітаўт Вялікі і будучыня Беларусі, Літвы і Ўкраіны" - гэта ўжо прароцтва пра лёс Бацькаўшчыны. "Здаецца нам, - казаў А.Станкевіч,- а думкі нашы пацвярджае гісторыя народаў агулам і гісторыя народаў Вялікага Княства Літоўскага ў асобнасці, што шлях да самастойнасці культурнай і палітычнай народаў на ўсходзе Еўропы, асабліва для беларусаў, вядзе не праз усход, а праз захад"[87] .

Праблемы беларускай культуры - галоўны клопат Ад.Станкевіча-святара, выдаўца, асветніка, журналіста. Большасць матэрыялаў, апублікованых у газеце "Крыніца" і часопісе "Хрысціянская думка" (1928-1940 гг.), духоўным айцом якіх быў Ад.Станкевіч, так ці інакш упісвалася ў кантэкст беларускай культуры. У "Крыніцы" друкавалася цікавая манаграфія Ст.Грынкевіча "Аб тэатры" у форме цыкла лекцый па тэатразнаўству[88] .

Новыя супрацоунікі газеты ў 30-ыя гады (рэдактарам "Крыніцы" быў тады Ян Пазняк) не забывалі пачынальніка хрысціянска-дэмакратычнага руху, 25 снежня 1936 года апублі-

кавалі яго праграмную прамову на канцэрце-акадэміі ў Дзень беларускай культуры (13 снежня 1936 г.). У гэтым глыбокім навуковым дакладзе А.Станкевіч прапанаваў першае, сінтэзуючае вызначэнне культуры ("Гэта - патэнцыя душы нашай, гэта творчая яе магчымасць, а такжа гэта ўсе рэальныя плады гэтай духоўнай нашай творчасці"), раскрыў суадносіны паміж нацыянальнай і агульначалавечай культурамі (у асобным раздзеле "Культура нацыянальная - частка культуры агульналюдской"). Урэшце, коратка вызначыў гістарычную дынаміку развіцця культур, дакладней, розных тыпаў цывілізацыі.

Верагодна, Ад.Станкевіч ведаў гісторыка-тыпалагічную канцэпцыю расійскага сацыёлага Мікалая Данілеўскага, паводле якой кожны тып культуры або цывілізацыі мае свае этапы станаўлення (дзяцінства і юнацтва), росквіту (сталасці) і завяршальнага плёну, пасля чаго наступае заняпад - гістарычнае забыццё і растварэнне ў новых, маладых цывілізацыях[89]. Аднак прапанаваў да гэтай песімістычнай тэорыі істотную папраўку аб пераемнасці ў развіцці розных тыпаў культур і пра магчымасць іх адраджэння - уваскрасення для новага жыцця. "Знача, - казаў ён, старыя культуры ўміраюць,- новыя родзяцца. Так, але гэта вымагае некалькіх слоў агаворкі. Старыя культуры ўміраюць , але не цалкам - умірае ў іх толькі тое, што было патрэбна часу, што было signum temporis ,а вартасці агульналюдскія і вечныя, якія ёсць у кожнай культуры, астаюцца назаусёды"[90]. Беларуская культура, на думку Ад.Станкевіча, у сваім гістарычным развіцці і нацыянальным адраджэнні сінтэзавала візантыйскую і лацінскую культуры, пазней выкарыстала вопыт суседніх славянскіх культур, аднак жывілася "з беларускіх народных крыніц".

Прафесіяналізм Ад.Станкевіча як публіцыста, крытыка і летапісца айчыннай культуры здзейсніўся ўсебакова. Нават у брашуры пра выдатнага спевака і ахвярнага дзеяча беларускай музычнай культуры "Міхась Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песня"(1938). У гэтым крытыка-біяграфічным нарысе аўтар не абмежаваўся біяграфіяй чарадзейнага песняра, нашага беларускага Арфея, паспрабаваў знайсці крыніцы, якія жывілі ягоны талент, прыадчыніць таямніцу генія. М.Забэйда-Суміцкі, кажа даследчык, - гэта рэдкі каштоўны камень накшталт алмаза альбо ізумруда, адшліфаваны класічнай вывучкай, высокай культурай. Дасягнуўшы вяршыні еўрапейскай музыкальнай адукацыі, гэты "мастак з натуры, уражлівы, мяккі, працавіты і інтэлігентны" сын



сьменнікаў, дакументы Беларускага Народнага Аб'яднання ў абарону нацыянальнай мовы і культуры. Публікацыі па тэалагічнай праблематыцы таксама непасрэдна альбо ўскосна закраналі гістарычны лёс Беларусі, яе нацыянальную ідэю. Напрыклад, нарыс пра эўхарыстычны кангрэс у Ірландыі невядомы аўтар назваў "Далёка прасторам - блізка духам"[94]. Мелася на ўвазе пэўная агульнасць гістарычнага лёсу ірландцаў і беларусаў.

Матэрыялы, прысвечаныя руху за адраджэнне Ўніяцкай Царквы, як правіла, друкаваліся ананімна, выражалі пазіцыю рэдактара і ягоных сяброў па БХД.

У кастрычніку 1932 года часопіс апублікаваў справаздачу пра Ўнійную канферэнцыю ў Пінску"[95]. У ёй удзельнічалі каля ста дэлегатаў-беларусаў, літоўцаў, палякаў, рускіх і ўкраінцаў, у тым ліку арцыбіскуп Роп, біскупы Ялбжыкоўскі, Пшэздзецкі, Чарнэцкі, дэлегаты ад езуітаў з Альбертыну (прафесар Свірскі, Нямцэвіч і інш.). Рэфераты чыталіся ў трох мовах - польскай, беларускай і ўкраінскай. Па-беларуску чыталіся рэфераты аб уніяцкім адраджэнні ў Беларусі. Усе выказаліся за беларускае ўніяцкае біскупства.

Пачынаючы з 1932 года "Хрысціянская думка" друкавала мемуары беларускага паэта Казіміра Сваяка (ксяндза Кастуся Стаповіча) "Дзея маёй мыслі, сэрца і волі", манаграфію Тамаша Кэмпяска "Следам за Хрыстусам" у перакладзе з лацінскай мовы Станіслава Грынкевіча. Супрацоўнікі часопіса былі прыхільнікамі адраджэння Ўніяцкай царквы. Рэдакцыйны артыкул "Цярністы шлях Уніі", верагодна, пісаўся А.Станкевічам. "Дзеля пашырэння ідэі Ўніі, - казаў аўтар, - Апостальская Сталіца вызначыла асобнага біскупа Я.Е.М. Чарнэцкага, паявілася місія а.а.Езуітаў усходняга абраду ў Альбертыне каля Слоніма і Ўніяцкая духоўная семінарыя ў Дубне на Валыні". Але шлях да адраджэння Ўніі нялёгкі, бо супраць яе выступае "Санацыя, якая цяпер кіруе Польшчай", Польская санацыя баіцца, каб Унія не сталася духоўнай апорай беларускага нацыянальнага адраджэння. Але "мы , беларускія каталікі", лічым, што і "Касцёл Каталіцкі не можа стацца аружжам ані лацінізацыі, ані паланізацыі, ані русіфікацыі"[96].

Да бясспрэчных публікацыяў А.Станкевіча ў "Хрысціянскай думцы" належаць творы рознага жанру, падпісаныя крыптонімамі Кс.Ад.Ст. (ксёндз Ад.Станкевіч), альбо скарочана - А.Ст., А.С. Сярод іх - цыкл евангельскіх лекцый і казанняў, якія пазней, дапоўненыя і дапрацаваныя, увайшлі ў кніжку

"Думцы" (1928 г.) яе заснавальнік спадзяваўся: "Хрысціянская думка" пры памысным развіцці сваім хутка пераканае свет хрысціянскі, што мы не бальшавікі ды бязбожнікі, але народ еўрапейскі, узгадаваны на падставах той жа самай еўрапейскай, хрысціянскай цывілізацыі"[93].

Часопіс рэгулярна друкаваў рэдакцыйныя артыкулы на актуальныя тэмы рэлігійнага і грамадскага жыцця, казанні і асветніцкія лекцыі на евангельскія тэмы, меў рубрыкі: З рэлігійна-грамадзянскага жыцця. З беларускай нівы. Віленскія навіны. Палітычныя навіны. Розныя цікавасці. Паштовая скрынка. Друкаваліся вершы, апавяданні і нарысы заходнебеларускіх пісьменнікаў.

У I928-I929 гг. самым актыўным супрацоўнікам часопісу быў ксёндз Д.Аніська. Ён быў сярод тых супрацоўнікаў А.Станкевіча, якія захацелі і ўмелі сфармаваць цэласны беларускі светапогляд, спалучыўшы хрысціянскую тэалогію з беларускай нацыянальнай ідэяй. Д.Аніська друкаваў там праграмныя артыкулы "Усё паправіць у Хрыстусе", "Нам міласці трэба!", "Да ксяндзоў палякаў, працуючых сярод беларусаў", "Вось ідэя!" (цыкл нарысаў пра беларускае нацыянальнае адраджэнне), "Каталіцтва і беларуская справа", "Вера і чын", іншыя матэрыялы. Большасць аўтараў падпісвалі свае публікацыі псеўданімамі і крыптонімамі, верагодна, каб пазбегнуць крытыкі з боку польскай каталіцкай іерархіі. Сярод іх быў ксёндз П.Татарыновіч (артыкулы "Зямное шчасце - водблеск праўдзівага шчасця", "Святы Ізыдар Хлебароб"), нехта Ўніят ("Урачыстасць Уніі ў Пінску"), доктар М.А. (цыкл артыкулаў "Бог", у тым ліку "Як пагадзіць з Богам зло?"), доктар Я.Р. (цыкл артыкулаў "Агульнае паняцце Апалагетыкі Хрысціянскай") і інш. Друкаваліся рэлігійныя вершы беларускага студэнта ў Празе, малітвы штодзённыя і святочныя. У чэрвені 1929 года часопіс пачаў друкаваць манаграфію А.Станкевіча "Родная мова ў сьвятынях", багаслоўска-асветніцкія нарысы беларускага ксяндза Д.Аніські "Усё ў міласьці" (пра назначэнне і сэнс жыцця ў святле хрысціянскай рэлігіі). У 1938 годзе часопіс апублікаваў мемуары яшчэ аднаго супрацоўніка і сябра Ад.Станкевіча ксяндза В.Шутовіча "У 25-тыя ўгодкі майго святарства".

Прыкметнае месца ў "Хрысціянскай думцы" займала культурна-асветніцкая і літаратурная тэматыка: тут друкаваліся вершы Міхася Машары, Сяргея Новіка-Пяюна, Вінцука Адважнага, яго ж калядная п'еса "Батлейка", іншыя творы заходнебеларускіх пі-



Беларусі да апошняга свайго дня слугаваў Бацькаўшчыне, данёс яе цудоўныя песні-скарбы да сусветнай публікі.

Феномен сусветна прызнанага М.Забэйды-Суміцкага, поруч з беларускай літаратурай даў падставу А.Станкевічу для высновы: "Праметаізм - самаахвярная барацьба за культуру і светлае шчасце беларускага народу - у нас з'явішча пэўнае, сцверджанае"[91-92].

Культуралагічныя даследаванні Адама Станкевіча былі шматграннымі, уключалі публіцыстыку, гісторыю беларускай культуры, месца хрысціянскай царквы ў яе развіцці, літаратуразнаўства, папулярныя лекцыі пра песенную культуру беларусаў. Гэта - у навукова-асветніцкім жанры. Што датычыцца практычнай культурнай дзейнасці, то яна доўжылася ўсё свядомае жыццё ксяндза Адама: штодзённае рэлігійнае асветніцтва, заснаванне (1926 г.) і кіраванне Беларускай друкарні імя Ф.Скарыны. А яшчэ духоўнае кіраўніцтва Беларускай гімназіяй ў Вільні і настаўніцтва ў ёй, заснаванне (1926 г.) Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (быў старшынёй гэтай грамадскай акадэміі), шчырая праца ў Таварыстве беларускай школы.

## 5. КАТАЛІЦКАЯ ТРАДЫЦЫЯ Ў СВЯТЛЕ БЕЛАРУСКАЙ ІДЭІ.

Грэчаскае слова katholikos паводле свайго сэнсу (усеагульны, універсальны) дакладна абазначае агульналюдскі, усяленскі характар Касцёла. Але каб ідэя ўніверсальнасці напоўнілася рэальным зместам, патрэбна была моцная здольнасць да адаптацыі адносна рэгіянальных этна-нацыянальных асаблівасцяў. Каталіцкі Касцёл у працэсе свайго гістарычнага развіцця больш чым іншыя хрысціянскія канфесіі здолеў арганічна ўвайсці ў кантэкст шматлікіх нацыянальных культур не толькі Еўропы, але і Азіі, Амерыкі, вялікіх і малых рэгіёнаў. Каталіцкая іерархія ў ідэі хацела заставацца вернай евангельскаму запавету Ісуса Хрыста сваім апосталам, атрымаўшым сярод іншых дароў Святога Духа веданне моваў тых народаў, сярод якіх яны прапаведалі Добрую вестку Хрыстову: "Дык ідзіце, навучайце ўсе народы..." (Мат. 18:19).

Адхіленні ад гэтай вялікай ідэі пачаліся ў выніку імперскай спакусы з боку свецкай улады: у эпоху станаўлення вялікіх і меншых імперый (ХУП-ХУШ стст.), адбывалася псеўданацыяналізацыя розных канфесіяў Хрысціянскай царквы ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе - русіфікацыя праваслаўя ў Расіі і паланізацыя каталіцтва ў Рэчы Паспалітай. Для геапалітычнай і культуртрэгерскай экспансіі выкарыстоўваліся тыпова імперскія мі-

фы: ідэя "Трэцяга Рыму" і "Усяе Русі" у Маскоускім царстве, псеўдаканцэпцыя Рэчы Паспалітай - канфедэрацыі беларуска-літоўскага Княства і Польскага Каралеўства - як польскай нацыянальнай дзяржавы, дапоўненая міфалагемай "польска-каталіцкай еўрапейскай місіі" на Ўсходзе.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Аўстра-Венгрыяй і Прусіяй (I772-I795 гг.) канчаткова ліквідавана іерархічная аўтаномія Праваслаўнай Царквы ў Беларусі: яна цяпер кіравалася Свяшчэнньм Сінодам, фактычна - імперскай адміністрацыяй Расіі. 3 другога боку, Каталіцкі Касцёл у Беларусі канчаткова трапіў пад кіраўніцтва польскай касцёльнай іерархіі, якая ва ўмовах барацьбы за адраджэнне Польшчы стала духоўным цэнтрам гэтага руху.

Да гвалтоўнай ліквідацыі Ўніяцкай царквы ў 1839 годзе гэтая апошняя, моцна лацінізаваная і часткова паланізаваная, усё ж такі выконвала ролю беларускага духоўнага апірышча і ў нармальных умовах дэмакратычнай палітыкі мела шанцы набыць значэнне каналідацыйнага фактара ў працэсе станаўлення беларускай нацыі і яе барацьбы за нацыянальны суверэнітэт. Страта гэтай духоўнай апоры пагражала падзелу Беларусі паміж "усходнімі" і "заходнімі" суседзямі не толькі тэрытарыяльна, але і духоўна-татальнай русіфікацыі і паланізацыі.

Першым адчуў гэтую небяспеку з "усходняга" боку лідэр паўстання 1863 года ў Беларусі Кастусь Каліноўскі (1838-1864), пазней удзельнік гэтага вызваленчага руху беларускі пісьменнік-адраджэнец Францішак Багушэвіч. Беларускі адраджэнцкі штотыднёвік "Наша ніва" (1906-1915) стаў грамадскай трыбунай для змагароў за беларускую Праваслаўную Царкву і беларускі Каталіцкі Касцёл. Практычна ж беларускае каталіцкае адраджэнне пачалося ў гады Першай сусветнай вайны (1914-1918) і распаду трох імперый, якія амаль паўтара стагоддзі ўладарылі на падзеленых абшарах Рэчы Паспалітай - Расіі, Аўстра-Венгрыі і Германіі. Вось тады, калі Беларусь па жывому целу падзялілі арыентаваныя на імперскі рэванш бальшавіцкая Расія і адроджаная Польшча, цэнтральнай фігурай гэтага адраджэнцкага руху стаў ксёндз Адам Станкевіч.

Пра асветніцка-навуковы і палітычны аспект яго дзейнасці ўжо гаварылася ў папярэдніх раздзелах гэтага нарысу. Цяпер жа акцэнты пераносяцца на ягоныя гісторыка-рэлігійныя даследаванні і праекты практычнай рэалізацыі беларускага Каталіцкага Касцёла.



У 1922 годзе рэдактар і выдавец "Крыніцы" Ад.Станкевіч надрукаваў коштам гэтай газеты кніжку ксяндза і доктара тэалогіі Ільдэфона Бобіча "Нядзеляшнія Эванеліі і Навукі" у сваім перакладзе з лацінскай на беларускую мову. Так прадаўжалася адраджэнне беларускай рэлігійна-асветніцкай традыцыі ў роднай для беларусаў мове. У рэлігійным жыцці беларусаў каталікаў яна паслужыла падручнікам Святога Пісання аж да выдання больш шырокага дапаможніка на гэтую тэму - кнігі самога А.Станкевіча "Божае Слова: Лекцыі, Эванеліі і Прамовы на Нядзелі і Сьвяты" (1938).

Ад.Станкевіч - выдавец, рэдактар і сталы аўтар першага беларускага рэлігійна-асветніцкага часопіса "Хрысціянская думка" (студзень "1928- 1 верасня 1939 гг., на лацініцы). Выдаваўся ён у Вільні, у доме на вядомай у гісторыі беларускай культуры Завальнай вуліцы, дзе з 1907 года друкавалася "Наша ніва", былі іншыя беларускія асветніцкія цэнтры. Друкавала часопіс створаная А.Станкевічам і ўзначаленая ім Беларуская друкарня імя Ф.Скарыны. Выходзіў ён у свет, як адзначалася на тытульнай старонцы, "з дазволу Я./го/ Э./ксэленцыі/ Віленскага Каталіцкага Архіепіскапа-Мітрапаліта", спачатку два, а пазней тры альбо чатыры разы ў месяц, меў евангельскі эпіграф: "Не адным хлебам жыве чалавек, але і ўсякім Словам, што выходзіць з вуснаў Божых" (Мат.4:4). Аднак за ўсе дванаццаць гадоў свайго жыцця ў друку беларуская "Хрысціянская думка" ніколі не была вузка-канфесійным клерыкальна-каталіцкім часопісам. Яго кірунак - агульна-хрысціянскі і нацыянальна-адра-джэнцкі, з арыентацыяй на сусветную і рэрыгіянальна-беларускую царкоўную ўнію. Пазней, калі рэдактарам стаў В.Ермалковіч (1938 г.), "Хрысціянская думка" фактычна была неафіцыйньм органам БХД, апазіцыйным да антыбеларускай палітыкі польскага Ўраду.

Часопіс гэты ўвасабляў мару ягонага заснавальніка, - злучаў філасофію і этыку хрысціянства з беларускім нацыянальна-вызваленчым і адраджэнцкім рухам. У рэдакцыйных артыкулах ставіліся тры задачы - абуджэнне сярод беларускіх каталіцкіх масаў хрысціянскай і нацыянальнай свядомасці, "згуртаванне ў адну арганізацыю беларускага каталіцкага духавенства і беларускай каталіцкай інтэлігенцыі". Ставілася і практычная задача - наблізіць касцёл да беларускіх вернікаў, у першую чаргу "завясці родную мову ў казаннях і дадатковых набажэнствах". Была ў часопіса яшчэ адна мэта, яна датычылася прэстыжу Беларусі ў міжнароднай палітыцы. У артыкуле "Думкі аб